# ДЗЕ ТЫ, БОГ?!

## ЯК ЗНАЙСЦІ СІЛЫ І МЭТУ, ПРАХОДЗЯЧЫ ПРАЗ ПУСТЫНЮ

ДЖОН БЭВІР

Дарагі сябар,

калі мы праходзім выпрабаванні і складанасці, вельмі лёгка згубіць з-пад увагі Божыя абяцанні. Я напісаў гэтую кнігу, каб натхніць вас і нагадаць, што кожны перыяд, нават час пустыні, мае сваю мэту.

Менавіта ў часы пустыні Бог змякчае нашыя сэрцы і фармуе характар, рыхтуючы да выканання тых цудоўных задумаў, якія Ён мае для нас. Здаецца, Бог маўчыць і Яго прысутнасці нідзе няма, але Бог не пакінуў вас – Ён працуе ў вас! На старонках гэтай кнігі  вы даведаецеся, як адбываецца рост, калі вы паспяхова праходзіце пустыню.

Гэтая кніга – падарунак для вас. Вы можаце дзяліцца ёй з іншымі вернікамі, якія патрабуюць падтрымкі ў складаныя часы. Таксама запрашаю вас наведаць старонку **MessengerX.com**, дзе вы зможаце спампаваць і вывучыць іншыя лёсавызначальныя  матэрыялы на роднай мове.

Я малюся, каб вы прайшлі праз пустыню і выраслі ў Яго сіле і ўладзе, сталі больш Яго адчуваць і лепей чуць Божы голас. Золата ачышчаецца ў агні, таму я малюся, каб час ачышчэння прынёс для кожнага з вас чыстае золата.

Глядзіце на Яго абяцанні і добра завяршыце шлях у пустыні!
Дабраславенняў,



Джон
JohnBevere@ymail.com

MessengerX

Messenger INTERNATIONAL

# ДЗЕ ТЫ, БОГ?!

## ЯК ЗНАЙСЦІ СІЛЫ І МЭТУ, ПРАХОДЗЯЧЫ ПРАЗ ПУСТЫНЮ


ДЗЕ ТЫ, БОГ?!
ЯК ЗНАЙСЦІ СІЛЫ І МЭТУ, ПРАХОДЗЯЧЫ ПРАЗ ПУСТЫНЮ
ДЖОН БЭВІР

**God Where Are You?!** by John Bevere, Belorussian
© 2025 Messenger International
MessengerInternational.org
Originally published in English as God Where Are You?!

Additional resources in Belorussian by John and Lisa Bevere are available for free download and video streaming at: **MessengerX.com** and on the **MessengerX** App.
To contact the author: JohnBevere@ymail.com

This book is a gift from Messenger International and is
NOT FOR SALE

**Дзе Ты, Бог?!** Джон Бэвір, на беларускай мове
© 2025 Messenger International
MessengerInternational.org
Пераклад з англійскай God Where Are You?!

Дадатковыя рэсурсы на беларускай мове аўтарства
Джона і Лізы Бэвіраў можна
бясплатна спампаваць ці праглядзець на: **MessengerX.com** і ў
праграме **MessengerX**.
Звязацца з аўтарам: JohnBevere@ymail.com

Гэтая кніга – падарунак ад служэння Messenger International
і НЕ ПРЫЗНАЧАЕЦЦА ДЛЯ ПРОДАЖУ

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

App Store – гандлёвая марка Apple Inc., зарэгістраваная ў ЗША і іншых краінах.
Google Play і лагатып Google Play – гандлёвыя маркі Google LLC.

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . vii
УСТУП.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . ..1

**1** ДЗЕ ТЫ? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**2** ДОБРАЯ КАМПАНІЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

**3** НЕАБХОДНАЯ ПУСТЫНЯ. . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**4** АДНОСІНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

**5** НОВАЕ ВІНО . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49

**6** НЯБЕСНАЯ ЎЗНАГАРОДА . . . . . . . . . . . . . . . . 63

**7** БОЖАЯ АЎТАМАГІСТРАЛЬ . . . . . . . . . . . . . . . . 75

**8** БУДУЙЦЕ ДОБРА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91

**9** СІЛАВАЯ ТРЭНІРОЎКА . . . . . . . . . . . . . . . . . 107

**10** ВАДА Ў ПУСТЫНІ. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121

**11** ПАДРЫХТУЙЦЕ ШЛЯХ ГОСПАДУ. . . . . . . . . . . . . 135

**12** ПЕРАМОГА Ў ПУСТЫНІ . . . . . . . . . . . . . . . . . 149

ПЫТАННІ ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . .167
ДАДАТАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .173

# ПРАДМОВА

*Бо пацешыць ГОСПАД Сыён, пацешыць усе руіны ягоныя, і зробіць Ён пустыню ягоную як Эдэм, і стэп ягоны — як сад ГОСПАДА. І будуць знойдзены ў ім вясёласьць і радасьць, дзякаваньне і голас сьпяваньня.*[1]

**— Ісая 51:3**

Я люблю кнігу Ісаі — гэта мой любімы старазапаветны прарок. У гэтым урыўку Ісая выкарыстоўвае вобразы, якія павінны нас запэўніць: Бог прагне ператварыць нашы бясплодныя землі ў сады жыцця. Божыя словы паказваюць, што сухія абшары пустыні – каталізатар нашага абнаўлення. Калі сыходзіць мінулае, прыходзіць адкрыццё пра будучыню. Наш Айцец праводзіць нас *праз* гэты час падрыхтоўкі, каб прывесці ў тое месца, што нам абяцаў.

Я мела гонар быць побач з мужам, калі мы праходзілі праз пустыні расчаравання, дзе зыбучыя пяскі страчанага натхнення пагражалі нас перамагчы. Я бачыла, як Джон маліўся, разважаў і крычаў: «Дзе Ты, Бог?!»

Шмат начэй мы не спалі, разважаючы, што зрабілі няправільна. Магчыма, мы аступіліся ці зрабілі памылку, якую трэба выправіць?

Шторанак яшчэ да ўзыходу сонца Джон ішоў слухаць і шукаць адказаў, спадзеючыся, што ў гэты дзень сітуацыя праясніцца і памяняецца. Я з трывогай чакала яго вяртання. Нашы сыны ў гэты час ужо прачыналіся.

«Ты чуў нешта ад Бога?» – шаптала я мужу.

1 Цытаты з Бібліі тут і далей падаюцца ў перакладзе А.Бокуна, 2023 г.

Джон адмоўна круціў галавой. Маё сэрца напаўнялася сумам, які азмрочваў надзею.

Можа, мы звар’яцелі? Увогуле, ці чулі мы калісьці Бога? Як гэта было магчыма? Калі Бог прывёў нас сюды, то чаму цяпер, у час спустошанасці, Ён маўчыць?

Вось так я ныла ў пустыні.

Мне так шкада! Тады я не ведала тое, што ведаю цяпер. Я прайшла б праз гэты час з большай лёгкасцю і верай. Я б разумела, што праходжу ачышчэнне і падрыхтоўку.

Таму я адчуваю: гэтая кніга – кіраўніцтва, а таксама шмат у чым – падарунак. Прыміце ўрокі гэтага часу, і яны добра паслужаць вам на наступным этапе вашага жыцця.

І падбадзёрцеся: вы не адны.

– Ліза Бэвір,<br>аўтар бэстсэлераў New York Times,<br>сузаснавальніца Messenger International

# УСТУП

Гэтая кніга – пра маё падарожжа ў пустыні, а таксама пра падобныя перажыванні многіх іншых людзей. Я яшчэ не «дайшоў» і не дасягнуў усяго, што Бог мае для мяне, але малюся, каб праз гэтыя старонкі вы знайшлі сілу і адвагу ісці далей у жыцці з Богам.

Я не лічу гэта поўным ці ўсебаковым даследаваннем. Можна напісаць нашмат больш. Але гэта мой асабісты расповед, які закранае асноўныя аспекты часу ў пустыні. Я хачу, каб мая кніга пазнаёміла вас з гэтай тэмай, а Дух Святы дапаможа вам прыняць гэтую вестку асабіста і дастасаваць яе да вашай сітуацыі.

Тут мы будзем абмяркоўваць, *што такое* пустыня і што пустыняй *не з’яўляецца*. Пагаворым пра мэту і перавагі пустыні. Я малюся, каб праз гэтыя прыклады, ілюстрацыі і словы настаўлення вы ўбачылі, як мудра прайсці перыяд пустыні.

Чытаючы, вы заўважыце шмат асабістых прыкладаў з маіх двух першых месцаў служэння. Спачатку я служыў пастару і яго гасцям на працягу чатырох з паловай год у Даласе, Тэхас. Мая пустыня прайшла ў апошнія паўтара года ў гэтым месцы. Другая адбылася, калі я два з паловай гады служыў моладзевым пастарам у царкве ў Флорыдзе. У параўнанні з гэтым часам, пустыня ў Даласе падалася лёгкай прагулкай па парку. Дзіўна, але другая пустыня таксама прыйшлася на апошнія паўтара года майго служэння моладзевым пастарам.

Ці былі ў маім жыцці іншыя пустыні? Так. Але, калі яны пачыналіся, я ўжо меў лепшае разуменне таго, што яны ўяўляюць. Як вынік, я не крычаў увесь час да Бога: «Бог, што здарылася?» або «Дзе Ты, Бог?». Я ўжо ведаў, што адбываецца і як на гэта рэагаваць.

Я размаўляў з мноствам мужчын і жанчын, якія праходзяць

праз такі перыяд. У размовах я звычайна чуў пра збянтэжанасць і разгубленасць. Шмат хто зусім не разумее, што адбываецца. Мы з Лізай, маёй жонкай, нядаўна правялі два падкасты на гэтую тэму, што выклікала бурную рэакцыю. Таму я перагледзеў маю раней напісаную кнігу, што выйшла пад назвай *«Перамога ў пустыні»*.

Я напісаў яе амаль трыццаць гадоў таму. Уважліва перачытаўшы кнігу, я зразумеў: гэта прароцкае пасланне больш адпавядала канцу 1980-х - пачатку 1990-х гг. Таму мы з рэдактарам выбралі вечныя ісціны, дадалі мноства адкрыццяў, атрыманых у мінулыя трыццаць гадоў, і цалкам яе перапісалі. Перад вамі не перагледжанае і адрэдагаванае выданне, але, хутчэй, новая, свежая вестка. Я ўпэўнены, што кніга, якую вы трымаеце ў руках, гэта вестка па-за межамі часу, што дапаможа сучасным і будучым пакаленням прайсці праз гэты важны перыяд.

У Бібліі мы чытаем: «Для ўсяго ёсьць свой тэрмін, і час для кожнай рэчы пад небам» (Экл.3:1). У нашым жыцці бываюць розныя поры, і ў кожнай пары ёсць свая мэта. Каб правільна пражыць пэўны час, важна разумець яго мэту. Было б цікава, калі б чалавек у лыжным касцюме сеў на пад'ёмнік, падняўся на гару і там паваліўся. Чаму? На двары лета і снегу няма! Яго дзеянні правільныя для зімы, але шкодзяць у летнюю пару яго жыцця.

У новай кнізе я хачу падзяліцца, наколькі важна разумець час ачышчэння і ўмацавання. Яго мэта – падрыхтоўка. Вы хутка заўважыце, што шмат якія з маіх словаў тычацца служэння. Усе мы пакліканыя: хтосьці ў бізнес, хтосьці ў адукацыю, хтосьці ў ахову здароўя, а хтосьці ва ўрад. Спіс можна працягваць. Маё пакліканне – у пяцігранным служэнні, і мае гісторыі гэта адлюстроўваюць. Але прыведзеныя прынцыпы тычацца любой сферы жыцця, да якой вас паклікаў Бог. Працаўнікам сферы бізнесу гэтаксама патрэбны час на падрыхтоўку да паклікання, як і служыцелям Эвангелля. І гэта справядліва для іншых сфер жыцця.

Яшчэ адзін момант: я ўключыў сюды дадатковыя пункты,

якія назваў «Парады па выжыванні ў пустыні». Гэта кароткія адкрыцці і словы натхнення, якія могуць зрабіць ваш час у пустыні максімальна прадуктыўным. Я шчыра спадзяюся, што, па-першае, гэтая вестка прынясе ў ваша жыццё яснасць і разуменне, таму вам не давядзецца пакутаваць ад няведання, як гэта было са мной; а па-другое, што яна натхніць вас далей шукаць Яго, Адзінага, хто можа нас насыціць.

– Шчыра ваш,
Джон Бэвір.
Студзень 2019 г.

1

# ДЗЕ ТЫ?

*Калі мы ўраўнаважана вытрымліваем засуху і спусташэнне, мы сведчым пра сваю любоў да Бога. Калі Ён наведвае нас Сваёй цудоўнай прысутнасцю, Ён сведчыць пра Сваю любоў да нас.*

**– Мадам Гюён**

*Але вось, я іду на ўсход, і няма Яго, і іду на захад, і не знаходжу Яго. На поўначы шукаю Яго, і ня бачу, і паварочваю на поўдзень, і не заўважаю.*

**– Ёва 23:8-9**

Я злаваўся на ўсіх. І не ведаў, чаму. Здавалася, усё ідзе не так.

Нашаму першаму сыну, Эдысану, было паўтара года, і мне не хапала цярплівасці з ім.

Я крычаў на жонку, Лізу.

Я быў расчараваны пастарам.

Я быў расстроены сваімі супрацоўнікамі.

Калі казаць праўду, напэўна, я быў расчараваны ў Богу і пакрыўджаны на Яго. Я ныў: «Што Ты робіш?»

«Чаму Ты нічога не робіш у маім жыцці?»

«Дзе выкананне Тваіх абяцанняў?»

«Чаму ўсё так кепска?»

«Чаму Ты нічога мне не кажаш?»

Зноў і зноў я бурчэў недарэчныя скаргі: «Дзе Ты?»

Ці бывалі ў вас часы, калі падавалася, што Госпад зусім блізка: вам можна проста прашаптаць Яго імя – і Ён *адразу ж* будзе побач і *адразу ж* адкажа вам?

Але потым прыходзілі часы, калі вы звярталіся да Яго зноў і зноў, але адказу не было. Падавалася, Ён знік з вашага жыцця. Магчыма, вы і зараз на гэтым этапе і крычыце ў цішыню тое ж пытанне, што задаваў і я: «Божа, дзе Ты?»

Я знаходзіўся ў пустыні, але пра гэта не ведаў. Я жыў у Даласе, штат Тэхас, і думаў, што быў добрым вучнем Ісуса, забытым Богам.

Я быў маладым хрысціянінам. Мне здаецца, гэта была мая першая пустыня.

Раней мне трэба было проста паклікаць, і Госпад адразу адказваў. Я памятаю, Ён хутка адгукаўся на мае самыя простыя просьбы. Яго прысутнасць была такой блізкай, відавочнай і моцнай! Цяпер жа я не мог зразумець, што адбываецца. Дзень за днём я стаяў на каленях у малітве: «Бог, што адбываецца? Здаецца, да Цябе мільёны кіламетраў!»

Я зноў і зноў глядзеў на сваё жыццё і запытваўся: «Які страшны грэх я зрабіў?»

Вядома, як і кожны чалавек у свеце, я перыядычна грашыў, але хутка каяўся і прасіў прабачэння, якое прапануе нам Ісус. Наколькі я ведаў, у маім жыцці не было пастаяннага наўмыснага грэху.

«Бог, чаму Ты больш да мяне не прамаўляеш?» – зноў і зноў запытваўся я ў дні цішыні.

Вядома, я яшчэ не далучыўся да такіх вялікіх герояў Бібліі, як Ёў, але ў мяне была падобная рэакцыя. Словы Ёва, якія раней гучалі незразумела, цяпер мелі сэнс. Некаторыя вершы выдатна выказвалі пачуццё самоты і пакінутасці ў пустыні:

> «Але вось, я іду на ўсход, і няма Яго, і іду на захад, і не знаходжу Яго. На поўначы шукаю Яго, і ня бачу, і паварочваю на поўдзень, і не заўважаю».
> (Ёва 23:8-9)

Я працягваў маліцца, але нябёсы здаваліся меднымі.

Потым Госпад паказаў мне, што хрысціянскае жыццё падобнае да ўзрастання дзіцяці. Я быў духоўным немаўлём, і цяпер пераходзіў на новы этап. У той час я меў перад вачыма выдатны прыклад. Эдысану было паўтара года. Ліза, цудоўная мама, заўсёды была побач, калі Эдысан плакаў, каб яго супакоіць. Ліза абдымала яго, карміла грудзямі, і Эдысан супакойваўся.

Але ж Эдысану, як і любому дзіцяці, трэба было ўзрастаць і сталець. Для ўсіх нашых хлопцаў (іх у нас чацвёра) прыходзіў час, калі ім трэба было есці самастойна. Вох, як брудна было дома – вы і самі ведаеце! Яны спрабуюць есці, але палова ежы падае са століка на падлогу.

Дзеці так засмучаюцца, што *вы* іх не корміце, як раней, але ж вы робіце тое, што робяць адказныя бацькі. Калі нашы дзеці раскідвалі ежу, нам хацелася падскочыць і накарміць іх, але мы ведалі: гэта перашкодзіць ім расці. Мы дазвалялі нашых хлопцам вырасці. Мы дакладна не хацелі карміць іх з лыжачкі ў васямнаццаць гадоў!

Калі дзеці растуць, ім трэба менш падтрымкі, бо гэта спрыяе іх росту і развіццю. Бог робіць нешта падобнае, каб мы маглі развівацца і сталець духоўна. Калі мы толькі нараджаемся звыш і напаўняемся Яго Духам, нейкі час Ён прыходзіць на кожны наш плач. Але дні ідуць, мы пачынаем шукаць не толькі духоўнага малака (Габраяў 5:12) – і, каб дапамагчы нам расці і сталець, Бог дазваляе прыйсці часу, калі Ён не адразу адказвае на кожны наш зварот.

Калі Госпад дапамог зразумець, што духоўнае сталенне падобна да працэсу, які праходзіць кожны чалавек на шляху з дзяцінства да дарослasці, я стаў больш разважаць і задумаўся: *«Магчыма, я памыляўся? Магчыма, тое, праз што я праходжу, не ёсць пакараннем ад Госпада? Можа быць, я патрапіў у пустыню, каб навучыцца, вырасці і лепш падрыхтавацца да служэння Ісусу?»*

Потым я прыгадаў, што *менавіта* гэта адбылося з Ісусам. Амаль адразу пасля таго, як Ян хрысціў Яго і Айцец пра Яго засведчыў, Дух Святы павёў Ісуса ў пустыню. І гэта не было пакараннем, бо Ісус дакладна не зрабіў аніякага грэху.

Таму ў час самашкадавання мне нарэшце прыйшла думка: *«Дык можа, гэтая пустыня не такая жахлівая, як мне падаецца?»*

## Успрыняццё пустыні

Калі мы жадаем быць, як Ісус, наш характар мусіць развівацца. І вельмі часта Бог выбірае для гэтага менавіта пустыню. Пакуль мы знаходзімся там, Бог, як падаецца, аддаляецца ад нас на сотні кіламетраў, а Яго абяцанні здаюцца пустымі. Але гэта не рэальнасць, а толькі толькі нашыя адчуванні. Ён насамрэч блізка, побач, бо Ён абяцаў ніколі нас не пакідаць (Гебраям 13:5).

Пустыня – гэта час, калі вам здаецца, што вы ідзяце ў супрацьлеглы бок ад сваіх мараў і абяцанняў Божых, у якіх вы былі ўпэўненыя. У пустыні вы не адчуваеце духоўнага росту і развіцця. Наадварот, вы можаце адчуваць адкат. Божая прысутнасць нібы адступае і змяншаецца, а не расце. Вы можаце нават адчуваць адсутнасць Яго любові, быццам бы Ён вас ігнаруе. Але гэта не так.

Пустыня – гэта тое месца, куды часта трапляюць шчырыя вучні Хрыста. Хаця, калі вы там знаходзіцеся, вам можа быць вельмі самотна. Праўда ў тым, што пустыня – гэта неабходнае месца для кожнага з дзяцей Божых. Каб перайсці да здаровай сталасці вучня Хрыста, вам спатрэбіцца некалькі падарожжаў праз пустыню.

Мне хацелася б вам сказаць: можна проста ўзяць гугл-мапу, на якой вы знойдзеце кароткі шлях або варыянты абыхода гэтай пусткі, але такой мапы не існуе. І гэта, мой сябар, добра, бо падарожжа праз пустыню – наша прыняццё гэтага часу – неабходнае, калі мы жадаем дайсці да Абяцанай Зямлі.

Што ж такое пустыня?

На шчасце, нямногім з нас давялося фізічна выжываць у сапраўдных пустынях, дзе вельмі мала вады і цяжка знайсці прытулак. Удзень горача, уначы холадна, нам самотна, мы смагнем, няма ежы. Да таго ж, мы згубіліся і не ведаем, як выйсці з пустыні. Магчыма, нам не даводзілася перажываць такое, але мы сутыкаліся з *эмоцыямі*, якія людзі перажываюць у пустыні. У гэтай кнізе я падзялюся ключавымі момантамі перыядаў пустыні – а пустыня ў

маім жыцці была не адна, і ніводная не была лёгкай прагулкай!

Добрая вестка ў тым, што, калі мы прагнем прыслухацца да Бога, пустыня неабавязкова стане негатыўным часам. Гучыць супярэчліва, але мэта пустыні станоўчая: навучыць, ачысціць, умацаваць і падрыхтаваць нас да далейшага дзеяння Божага Духа, якое дапаможа нам стаць больш плённымі.

Трапляючы ў пустыню, многія людзі панікуюць і паводзяць сябе нямудра, не разумеючы сітуацыі. Самі таго не ведаючы, яны шукаюць няправільных рэчаў і робяць няправільныя ўчынкі. Прыкладам можа быць рэзкая змена прафесіі ці працы, пераход з адной царквы ў іншую – любое радыкальнае рашэнне ў жыцці, якое, на іх думку, зробіць іх шчаслівымі ці прынясе змены ў звыклую сітуацыю. Для несямейнага чалавека гэта можа быць нечаканы пачатак новых адносінаў пасля балючага спынення папярэдніх.

Калі вы будзеце шукаць, як уцячы, не разумеючы, чаму Бог змясціў вас у такі «засушлівы» час, то, самі таго не жадаючы, падоўжыце час знаходжання ў пустыні. Гэта можа выклікаць дадатковыя складанасці, засмучанасць і нават паразу, бо вы не разумееце час ці месца, у якое Бог вас прывёў.

Менавіта так адбылося з ізраільцянамі на працягу сарака гадоў пустыні. Неразуменне таго, што адбываецца, зрабіла цэлае пакаленне ізраільцян няздольным увайсці ў Абяцаную Зямлю. Як трагічна! У пустыні Бог меў для іх мэту: выпрабаваць, навучыць і зрабіць іх магутнымі ваярамі, здольнымі ўзяць і заняць абяцаную Богам новую зямлю. Але ізраільцяне памылкова лічылі пустыню пакараннем: яны пастаянна наракалі, скардзіліся і спакушаліся.

Калі прыйшоў час выйсці з пустыні і заваяваць Абяцаную Зямлю, народ прыслухаўся да тых выведнікаў, якія вярнуліся з кепскімі звесткамі, а таксама да тых, хто наракаў і скардзіўся. Апынуўшыся перад выбарам: паверыць Божым абяцанням або пайсці за пачуццямі і меркаваннямі недасканалых людзей, яны абралі верыць людзям, а не Богу. Ізраільцяне купіліся на хлусню,

што іх чакае параза і яны не атрымаюць зямлю, якая ацякае малаком і мёдам. Няведанне Божай прыроды і характару прывяло да няправільных учынкаў.

Таму Бог сказаў: «Добра! Няхай станецца, як хочаце вы». Тое падарожжа ў пустыні, што магло скончыцца праз год, заняло цэлае жыццё.

*Вох!* Нам не хацелася б атрымаць у свае «рэзюмэ» такі запіс! Але мы можам навучыцца на іх памылках, як кажа апостал Павал: «Таксама не наракайце, як некаторыя з іх наракалі і загінулі ад нішчыцеля» (1 Карынцянам 10:11).

Калі мы навучымся разумець, што прыйшлі ў пустыню, то замест таго, каб скрыгатаць зубамі і скардзіцца, мы зможам быць удзячнымі, ведаючы, што за гэтым месцам ляжыць «абяцаная зямля» новай сталасці, сілы, дабраславенняў, магчымасцяў і выкананых абяцанняў. Ці ж не зробіць гэта складаныя часы крыху прасцейшымі? Тады мы пагодзімся з Якубам, які пісаў:

> Вялікай радасьцю лічыце, браты мае, калі трапляеце ў розныя спакусы... А цярплівасьць няхай мае дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалымі і суцэльнымі, без аніякага недахопу (Якуба 1:2, 4).

Ці можа пустыня азначаць, што я зрабіў нешта няправільна?

Добрае пытанне!

Многім з нас, калі мы праходзім праз пустыню, хочацца спытацца: «Што я зрабіў няправільна? Чым я не дагадзіў Богу?» Такія пытанні сведчаць пра неразуменне сэнсу або мэты пустыні.

У Бібліі і на працягу ўсёй гісторыі людзі прыходзілі да разумення, што пустыня – час падрыхтоўкі да выканання Божага паклікання. Таму пустыня не значыць, што Бог вас адрынуў; гэта месца, дзе Ён вас рыхтуе.

Я лічу, што цалкам магчыма апынуцца ў месцы, дзе «няма вады»,

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 1. Зразумейце час, у якім вы знаходзіцеся**

Большасць з нас здзіўляецца, патрапіўшы ў пустыню. Бог такі добры, мы так прывыкаем да Яго дабраславенняў, прысутнасці і абяцанняў! Мы чакаем, што так будзе заўсёды. Але аднойчы мы разумеем: нешта памянялася. Не трэба панікаваць. Важна зрабіць крок назад і прыгледзецца да сітуацыі з пэўнай адлегласці. Вам трэба зразумець, праз які час вы праходзіце, бо без разумення часу і вашага месца ў ім вы не зможаце правільна на яго адрэагаваць.

Гэта як пераезд з цёплага, трапічнага клімату ў паўночныя, арктычныя ўмовы. Калі прыходзіць зіма і на тэрмометры мы бачым мінусавую тэмпературу, важна ведаць, дзе вы, інакш можна выбегчы на вуліцу без курткі!

Тое ж самае справядліва і для пустыні. Калі вы не звяртаеце ўвагі на падказкі, што сігналізуюць: трэба пабыць у гэтай пустцы! – вы будзеце вельмі засмучаныя і нават можаце зрабіць памылку, якая будзе дарага каштаваць. У Старым Запавеце мы чытаем: сярод сыноў Ісахара былі тыя, «якія мелі разуменьне часу і ведалі, што мае рабіць Ізраіль» (1 Летапісаў 12:32).

Калі вы разумееце час у пустыні, вы таксама будзеце ведаць, што рабіць.

у выніку няправільных рашэнняў, прынятых у жыцці. Сапраўды, як бы далёка мы ні зайшлі ў нашых намаганнях быць падобнымі да Ісуса, нам трэба супрацьстаяць грэху і патэнцыйна мы можам штосьці ў жыцці сапсаваць. Таму кепскае рашэнне або шэраг няправільных рашэнняў можа прывесці да таго, што мы апынемся на ўзбочыне ці ў канаве ля дарогі.

Але вось у чым праўда: наш Бог любіць прабачаць, Ён – вялікі Першасвятар, які разумее нашу слабасць. Таму першы крок, каб выбрацца з канавы ці знайсці выхад з пустыні, куды мы самі сябе загналі, – пайсці да любячага Айца і сказаць: «Айцец, я саграшыў ___________________________ (назавіце, у чым менавіта). Калі ласка, прабач мне. Я раскайваюся ў гэтым грэху і цяпер, з дапамогай Тваёй ласкі, я буду жыць па-іншаму».

Я хачу сказаць: нават калі праз нейкія памылкі ў жыцці вы апынуліся ў пустыні, выпраўце адносіны з Госпадам, дазвольце Яму завяршыць ваша навучанне і весці вас далей – спадзяюся, у такім выпадку вы выйдзеце з пустыні нават раней. Вядома, час залежыць ад Госпада. Аўтар Псальмаў піша: «У Тваёй руцэ час мой» (Псалом 31 (30) :15). Сказаўшы гэта, дадам: найбольш верагодна, вы патрапілі ў пустыню таму, што менавіта тут Бог хоча вас бачыць. Вы не дапусцілі памылку, якая прывяла сюды, у месца складанасцяў. Я ведаю, у нейкім сэнсе з-за гэтага сітуацыя робіцца цяжэйшая. Таму і адна з прычын, чаму я пішу гэтую кнігу – даць вам зразумець, як Бог бачыць пустыню і як Ён хоча яе выкарыстаць, каб дапамагчы нам вырасці і стаць больш падобнымі да Ісуса!

Трэба добра разумець яшчэ адзін момант: Бог прывёў вас у пустыню не для таго, каб пакінуць на волю хітрыкаў д'ябла і забыцца пра вас. Калі дзеці тых, хто выйшаў з Эгіпта, уваходзілі ў Абяцаную Зямлю, Бог ім нагадаў:

«І памятай увесь шлях, якім вёў цябе ГОСПАД, Бог твой, сорак гадоў праз пустыню, каб зьмяніць цябе і выспрабаваць цябе, і даведацца, што ў сэрцы тваім, ці будзеш ты захоўваць прыказаньні Ягоныя, ці не» (Другазаконне 8:2).

Нягледзячы на тое, што ізраільцяне сапраўды нарабілі сур'ёзных памылак і праз свае глупствы, няўдзячнасць і бунт заставаліся ў пустыні занадта доўга, Бог хацеў выкарыстаць гэта ўсё на дабро! Ён робіць менавіта так. Я надзвычай рады гэтаму, а вы?

Важна правільна разумець: Госпад не перастае дзейнічаць у

нашым жыцці проста таму, што мы ў пустыні. Ён вядзе нас *праз яе*; без Яго мы ніколі б не змаглі прайсці праз пустыню. Больш за тое, гэта *не* тое месца, дзе нас кладуць на паліцу, пакуль Бог не захоча нас выкарыстаць. Наш літасцівы Айцец дзейнічае не так. Наадварот, гэта месца і час, у якім Ён дзейнічае вельмі моцна.

Вы, пэўна, ведаеце выраз: «За хвойкаю лесу не бачыць». Гэта трапная характарыстыка пустыні: знаходзячыся ў ёй, цяжка ўбачыць, як дзейнічае Бог.

Неабходна падкрэсліць важную ісціну: пустыня – гэта не месца паразы, прынамсі, не для тых, хто слухаецца Бога. Ісус быў слабы ад голаду, ужо сорак дзён Ён не меў тых, каму можна было б даверыцца ці ад каго можна было б мець падтрымку, без фізічнага пацяшэння або звышнатуральнага дзеяння – і тут да Яго падступаецца д’ябал. Ісус перамог д’ябла Словам Госпада! Пустыня – гэта не час і не месца паразы дзяцей Божых: «Падзяка ж Богу, Які заўсёды дае нам трыюмфаваць у Хрысьце…» (2 Карынцянам 2:14).

Пакуль ізраільцяне хадзілі па пустыні, іх запалохвалі народы, якія жылі на той тэрыторыі. Госпад сказаў Ізраілю змагацца з імі. Народ Ізраіля перамог амарэйцаў (Лікі 21:21-25), мадыянцаў (Лікі 31:1-11) і народ Башану (Лікі 21:33-34). Калі б параза была Божай мэтай для ізраільцянаў, Бог не сказаў бы ім змагацца. Хоць пустыня і не мусіла стаць месцам паразы, большасць людзей памерла, не ўвайшоўшы ў Абяцаную Зямлю. Бог не жадаў, каб гэта было так, але, верагодна, так стала ў выніку іх непаслухмянасці.

Спадзяюся, вы зможаце прыняць думку пра тое, што пустыня – не вынік Божай незадаволенасці і Божага жадання вас пакараць. Таксама важна прыняць і тое, што пустыня – не месца, дзе трэба легчы і здацца!

Бог задумаў нешта добрае!

Пустыня – гэта не час пошуку знакаў, дабраславенняў, багацця або цудаў. Гэта час пошуку Божага сэрца, што і сфармуе вашы

характар і сілу. Пустыня – час падтрымліваць бачанне. Калі ў вашым сэрцы не застанецца бачання і Божага абяцання, гэты час скрадзе радасць і прынясе нараканні.

Калі вы зразумееце сваю сітуацыю, гэта дапаможа ацаніць жыццё з лепшага ракурсу. Тады вы ўбачыце руку Божую, нават калі не будзеце адчуваць Яго дотык. У гэты час ваша любоў да Яго выходзіць за межы пытання: «Што Ён зробіць для мяне карыснага?» і пераходзіць у пытанне «Што Ён чакае ад мяне?»

Я ўжо казаў пра засмучанасць, якую выказваў Ёў у Старым Запавеце: ён не мог зразумець, што робіць Бог. Куды б Ёў ні пайшоў, ён не мог знайсці Бога. Калі б разважанні Ёва на гэтым і спыніліся, то ў яго пачалася б сапраўдная дэпрэсія. Але Ёў не паддаўся адчаю і выказаў словы надзеі і веры:

«А Ён ведае шлях мой, і няхай выспрабуе мяне, выйду я [чысты], як золата» (Ёва 23:10).

Якое захапляльнае адкрыццё! Як бы мы ні спрабавалі вылічыць, куды вядзе нас Бог, Ён ведае шлях. Мы можам цалкам давяраць Яму, як піша апостал Павал: «…маючы пэўнасьць у тым, што Той, Які пачаў у вас добрую справу, будзе зьдзяйсьняць [яе] аж да дня Ісуса Хрыста» (Філіпянам 1:6).

І мы ведаем: гэта праўда… нават у пустыні.

2

# ДОБРАЯ КАМПАНІЯ

*Хрысціяне, сутыкнуўшыся з бурамі супрацьстаяння, могуць узняцца над імі з яшчэ большай прыгажосцю. Тады яны становяцца падобнымі на дрэвы, што растуць на горных уцёсах: пабітыя вятрамі, такія дрэвы маюць асабліва моцную драўніну.*

**– Білі Грэм**

*Ісус, напоўнены Духам Сьвятым, быў паведзены Духам у пустыню.*

**– Лукі 4:1**

Вітаю ў пустыні! Вы дзівіцеся з такога радаснага вітання? Звычайна мы не чакаем нічога добрага ад такога часу, але вам трэба ведаць, што наш любімы Айцец Нябесны вельмі цэніць такія месцы, і цяпер вы ў добрай кампаніі.

Калі вы лічыце, што пустыню ў падарожжы веры лепей абмінуць, я заклікаю вас яшчэ раз задумацца! Насамрэч, у пустыні мы знаходзім сляды безлічы святых, нават Сына Божага. І гэтыя людзі правялі тут нямала часу.

Іншымі словамі, калі мы трапляем ў пустыню, мы ў добрай кампаніі… і не самотныя.

Не абвінавачвайце мяне ў злоўжыванні гучнымі імёнамі: спіс тых, хто пабываў у пустыні, сапраўды ўражвае.

Вядома, я ўжо згадваў Ёва, якога Біблія называе «найбольшым сярод усіх сыноў Усходу» (Ёва 1:3). Ён страціў усё: маёмасць, дзяцей, здароўе, падтрымку жонкі. Гэты заможны праведнік пачуў ад блізкіх сяброў абвінавачванні ў таемных грахах. Ёў перажываў у пустыні такую роспач, што сказаў: «Лепш бы я не нарадзіўся!»

У пустыні вы ідзяце поруч з Абрагамам, багатым вандроўнікам з Ура, які некалі жыў у цудоўных умовах, але Бог сказаў пакінуць усё і выправіцца ў падарожжа, каб знайсці новую, абяцаную зямлю. І Сара была побач з ім кожны крок! Большая частка іх падарожжа праходзіла ў пустынях.

Пустыня была добра знаёмая і Майсею. Яго выхавалі ў палацы як сына дачкі фараона. Але, забіўшы эгіпцяніна, Майсей апынуўся ў аддаленым кутку пустыні і даглядаў авечак цэлыя сорак гадоў. Менавіта там Бог адкрыўся Майсею ў кусце, які гарэў, але не згараў:

А Майсей пасьвіў авечак Етра, цесьця свайго, сьвятара Мадыянскага. І павёў ён чараду на другі бок пустыні, і прыйшоў да гары Божае Харэў. І зьявіўся яму анёл ГОСПАДА ў полымі агню з сярэдзіны цярновага куста. І ён бачыў, і вось, цярновы куст гарэў агнём, але куст не згараў. І сказаў Майсей: «Пайду і пагляджу на зьяву гэтую вялікую, чаму куст не згарае». І ўбачыў ГОСПАД, што ён зьвярнуўся паглядзець [на гэта], і паклікаў яго Бог з сярэдзіны куста, і сказаў: «Майсей, Майсей!» Ён сказаў: «Вось я!» (Выхад 3:1-4)

Потым, як мы ведаем, Майсей вярнуўся ў Эгіпет і вывеў народ Ізраіля – ну вядома ж! – у пустыню!

А яшчэ ёсць цар Давід. Самуэль прарочыў, што Давід стане наступным царом, але неўзабаве пасля гэтага той «рыхтаваўся» да царскага пасаду, хаваючыся ў пячорах і блукаючы па пустыні. Там Бог адкрыўся Давіду як яго Пастыр, Сіла, Шчыт і Скала.

Ян Хрысціцель быў пакліканы стаць вялікім прарокам. Яго бацька расказаў яму пра бачанне, што пра гэта сведчыла. Але Госпад адкрыўся Яну не ў біблейскай школе, а ў пустыні. Апрануты ў скуры, Ян жыў менавіта ў пустынях Юдэі і харчаваўся насякомымі. У Лукі 3:2-3 мы чытаем: «…было слова Божае да Яна, сына Захарыі, у пустыні. І ён праходзіў па ўсіх ваколіцах Ярданскіх, прапаведуючы хрышчэньне навяртаньня дзеля адпушчэньня грахоў».

У Аравійскай пустыні Бог адкрыў апосталу Паўлу таямніцы, якія пазней склалі вялікую частку Новага Запавету. Пазней Павел напісаў, што Божай мэтай было «адкрыць ува мне Сына Свайго, каб я дабравесьціў Яго сярод паганаў, [калі гэта адбылося] я адразу не зьвярнуўся да цела і крыві і не ўзыйшоў у Ерусалім да апосталаў, якія былі раней за мяне, але пайшоў у Арабію і зноў вярнуўся ў Дамаск» (Галятам 1:16-17).

Дзе быў апостал Ян, калі атрымаў *Адкрыццё Ісуса Хрыста?*

> «Я, Ян, брат ваш і ўдзельнік у прыгнёце, і ў Валадарстве, і ў цярплівасьці Ісуса Хрыста, быў на востраве, называным Патмас, за слова Божае і за сьведчаньне Ісуса Хрыста» (Адкрыццё 1:9).

Патмас быў пустынным востравам – ідэальным месцам для перажывання пустыні.

І самае важнае: вы ў кампаніі Ісуса, Які, атрымаўшы публічнае дабраславенне Айца і Святога Духа, быў скіраваны Духам у пустыню, каб сутыкнуцца там са спакусамі шатана.

Я заўважыў, што гэтая мадэль часта паўтараецца: Бог паказвае нам нешта вялікае, што хоча зрабіць праз нас у будучыні, і тады

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 2. Як бы самотна вы ні пачуваліся, Бог ёсць з вамі**

Адно з важных перажыванняў пустыні – вы думаеце, што тут няма Бога! Акурат тады, калі важней за ўсё адчуць Яго прысутнасць, здаецца, нібыта Ён дзесьці за мільёны кіламетраў.

Важна зразумець дзве праявы Божай прысутнасці. Першая абапіраецца на наступныя словы з Пісання: «Не адпушчу цябе і не пакіну цябе» (Гебраям 13:5). Гэта ўсюдыіснасць Бога. Менавіта пра яе піша цар Давід: «Калі б я ўзыйшоў на неба, Ты там; калі б паслаў сабе [ложак] у пекле, — вось, [і там] Ты!» (Псалом 139 (138):8). Калі вы верыце ў Пісанне і давяраеце Богу, то, незалежна ад вашых пачуццяў і ад таго, што адбываецца ў жыцці, Бог з вамі.

Другая праява прысутнасці Бога, якую ўсе мы любім і

адразу вядзе ў пустыню для падрыхтоўкі.

Калі пустыня была неабходная вялікім святым і нашаму Госпаду Ісусу, то я разумею: мне таксама будзе добра правесці трохі часу ў пустыні, хоць, вядома, хацелася б знайсці лягчэйшы шлях. Пустыня – тое месца, дзе Бог выпрабоўвае, упакорвае і ачышчае нас. Тут Ён фармуе ў нас пабожны характар. Гэта тэрыторыя падрыхтоўкі для будучай плённай працы ў Яго Валадарстве.

Самае цікавае: у пустыні Бог адкрываецца па-новаму! Прарок Ісая піша:

> «Бо пацешыць ГОСПАД Сыён, пацешыць усе руіны ягоныя, і зробіць Ён пустыню ягоную як Эдэм, і стэп ягоны — як сад ГОСПАДА. І будуць знойдзены ў ім вясёласьць і радасьць, дзякаваньне і голас сьпяваньня» (Ісая 51:3)

якая ёсць часткай жыцця хрысціяніна, – гэта адчувальная прысутнасць. «Праявіцца» – значыць зрабіць нябачнае – бачным, нячутнае – чутным, а невядомае – вядомым. У гэтыя моманты Бог становіцца рэальным для нашых фізічных пачуццяў. Цудоўна перажываць такія сустрэчы! Яны могуць адбыцца падчас пакланення, асабістай малітвы, на прагулцы ў лесе, у звычайных штодзённых справах – у безліч розных спосабаў.

Калі вы ў пустыні духоўна галодныя і сасмяглыя, калі Бог не прыходзіць і не дабраслаўляе вас Сваёй цудоўнай захапляльнай прысутнасцю, проста расслабцеся і *трымайцеся за Яго абяцанні*, галоўнае з якіх – «Не адпушчу цябе і не пакіну цябе». Калі мы радуемся Богу, хоць і не адчуваем Яго прысутнасці, мы яшчэ гучней абвяшчаем верную любоў да Яго.

Менавіта ў Эдэмскім садзе Бог адкрыўся Адаму і меў з ім блізкія адносіны.

У пустыні вы адчуваеце голад і смагу Госпада. Калі Бог рыхтуецца вам адкрыцца, тут лягчэй адвярнуцца ад жыццёвых справаў і клопатаў, засяродзіцца і сфакусавацца на Богу. Калі мы жадаем адгукнуцца на Божы голас да нас, наша перажыванне будзе менавіта такім. Госпад нанова адкрываецца нам у пустыні. У кнізе Ісаі 45:15 гаворыцца: «Сапраўды, Ты — Бог таямнічы, Бог Ізраіля, Збаўца!» Ён робіць гэта для тых, хто сапраўды Яго прагне, каб нарадзіць большае жаданне блізкіх адносінаў з Ім. Госпад таксама хаваецца ад тых, хто не прагне Яго. Ён не дазваляе ўспрымаць Яго як дадзенасць ці нешта звычайнае і штодзённае.

## Прагныя Бога

Бог адкрыецца тым, хто Яго шукае і імкнецца да Яго ўсім сэрцам.

Памятайце: Бог сказаў, што вывеў сыноў Ізраіля ў пустыню, каб упакорыць іх і навучыць прагнуць Яго. Але замест таго, каб запрагнуць Бога, як гэта зрабіў Егошуа, народ прагнуў рэчаў, якія Бог аддаліў ад іх. Таму, калі Бог прыйшоў адкрыцца народу, як адкрыўся Майсею, людзі не былі галоднымі і прагнымі па Ім. Насамрэч, яны Яго адрынулі. Мы чытаем у Другазаконні:

«І вось, калі пачулі вы голас спасярод цемры і калі ўбачылі гару, якая гарэла агнём, падыйшлі да мяне ўсе галовы каленаў вашых і старшыні, і сказалі мне: “Вось, зьявіў нам ГОСПАД, Бог наш, славу Сваю і веліч Сваю. Мы чулі голас Ягоны з сярэдзіны агню і пераканаліся сёньня, што Бог можа прамовіць да чалавека, і ён застанецца жывы. Але цяпер навошта мы маем паміраць? Бо праглыне нас гэты агонь вялікі; калі мы яшчэ будзем слухаць голас ГОСПАДА, Бога нашага, мы паўміраем. Бо хто з тых, якія чулі, як мы, голас Бога Жывога, Які прамаўляе з сярэдзіны агню, і застаўся жывым? Ты сам падыйдзі і выслухай усё, што скажа ГОСПАД, Бог наш, і ты перакажаш нам усё, што скажа табе ГОСПАД, Бог наш, і мы выслухаем, і зробім [гэта]”». (Другазаконне 5:23-27)

Паўтару: Бог хацеў адкрыцца ізраільцянам у пустыні, як адкрыўся Майсею, але тыя адступілі і папрасілі Майсея: «Ты падыйдзі паразмаўляць з Госпадам. Потым вярніся да нас, скажы Яго словы, і мы так зробім».

На жаль, народ ніколі не *ведаў* Бога, яны ведалі толькі *пра* Яго. Таму людзі не маглі зрабіць тое, што Бог сказаў. Паколькі ізраільцяне не ведалі Бога, яны так і не ўбачылі абяцанай зямлі і памерлі ў пустыні.

Калі Бог прыводзіць нас у пустыню, як Ён прывёў Яна, Майсея, Давіда, Язэпа, Паўла і іншых, ён робіць гэта, каб выпрабаваць нас і ўбачыць: мы будзем прагнуць Яго ці будзем шукаць зручнасцяў і прыемных рэчаў, якіх мы пазбавіліся. Якуб піша:

«Просіце і не атрымліваеце, бо блага просіце, каб выдаткаваць дзеля асалоды вашай. Чужаложнікі і чужаложніцы! Ці вы ня ведаеце, што сяброўства са сьветам ёсьць варожасьць супраць Бога? Дык хто хоча быць сябрам сьвету, той робіцца ворагам Богу. Ці вы думаеце, што надарма кажа Пісаньне: «Да рэўнасьці прагне Дух, Які жыве ў нас»? Але яшчэ большую дае ласку і дзеля гэтага кажа: «Бог пыхлівым працівіцца, а пакорным ласку дае». Дык падпарадкуйцеся Богу; супраціўцеся д'яблу, і ўцячэ ад вас. Набліжайцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас. Ачысьціце рукі, грэшнікі, выпраўце сэрцы, двудушныя!» (Якуба 4:3-8)

Калі мы набліжаемся да Бога, шукаючы Яго ўсім сэрцам, то і Ён набліжаецца да нас. Ізраільцяне больш былі зацікаўленыя сваімі пажадлівасцямі, чым Божымі жаданнямі. Яны былі чужаложнікамі, што шукалі камфортных і бяспечных шляхоў свету. Людзі хутка забылі, што ўся раскоша і ўсё багацце не змаглі ўратаваць эгіпцян і іх войска.

Бог кажа: каб да Яго наблізіцца, нам трэба зрабіць дзве рэчы. Па-першае, мы мусім ачысціць свае рукі. У Другім Лісце да Карынцянаў 7:1 напісана: «Дык, улюбёныя, маючы такія абяцаньні, ачысьцім сябе ад усякага бруду цела і духа, зьдзяйсьняючы сьвятыя рэчы ў

страху Божым». Грэх аддзяляе нас ад Бога: «Бо беззаконьні вашыя аддзялілі вас ад Бога вашага, і грахі вашыя схавалі аблічча Ягонае ад вас, каб Ён [вас] ня чуў» (Ісая 59:2).

Па-другое, нам трэба ачысціць сэрцы. Ключ да гэтага ў словах Якуба: «Наблізьцеся да Бога, і Ён наблізіцца да вас. Ачысьціце рукі, грэшнікі, выпраўце сэрцы, двудушныя!» (Якуба 4:8). Двудушныя людзі хістаюцца паміж жаданнямі Духа і жаданнямі цела. Яны не скіравалі розум і пачуцці да Божых рэчаў. У Лісце да Каласянаў 3:1-2 напісана: «Дык калі вы ўваскрэсьлі з Хрыстом, шукайце ўзгорнага, дзе Хрыстос сядзіць праваруч Бога. Пра ўзгорнае думайце, а не пра зямное».

Калі вы чагосьці старанна шукаеце, то вы сапраўды гэта любіце і на гэта скіраваны. Ключавое слова – *скіраваны.* Калі жанчына завівае валасы, кожны валасок змяняецца і завіваецца хімічным спосабам. Цяпер яе валасы кучаравыя, бо кожны валасок атрымаў новую форму. Іх можна выраўняць, але, калі нацяжэння не будзе, яны зноў вернуцца да той формы, якую ім надалі падчас завіўкі.

Людзі могуць наведваць царкву, спяваць у групе праслаўлення і быць актыўнымі ў хрысціянскай дзейнасці, але дзе будзе іх розум, калі яны не робяць нічога «хрысціянскага»? Розум будзе там, куды яны скіраваны. Як толькі чалавек выходзіць з царквы, ён вяртаецца да таго, на што скіраваны розум, як завітыя валасы вяртаюцца да сваёй формы.

Я размаўляў з многімі людзьмі ў цэрквах па ўсёй краіне. Яны спяваюць спевы праслаўлення, робяць нататкі падчас казаняў і нават прысвячаюць час розным служэнням. Вядома, гэта вельмі добра, але паміж набажэнствамі і магчымасцю паслужыць як валантэры яны абмяркоўваюць толькі грошы, прафесійны спорт, адзенне, трэнды сацыяльных сетак, хобі, супрацьлеглы пол, ежу, пакупкі, любімыя прыкладанні на тэлефоне і іншыя свецкія справы. Яны ажыўляюцца, калі гэта абмяркоўваюць. Усё астатняе: чытанне Бібліі, малітва, служэнне іншым і нават хаджэнне ў царкву – яны робяць з абавязку.

Калі мужчына кахае жанчыну, робіць ёй прапанову і яны збіраюцца ажаніцца, вам не трэба пераконваць яго думаць і размаўляць пра яе. Яна пастаянна прысутнічае ў яго думках. Ён узгадвае яе, і яго голас адразу мяняецца. Прычына ў тым, што яго прывязанасць (або сэрца) скіравана да яе. Яго розум не дваіцца. Ён не думае пра іншых жанчын. Ён закаханы!

Давід кажа ў Псальме 16 (15):8: «Маю я ГОСПАДА перад сабою заўсёды». Розум Давіда не дваіўся. Яго сэрца было чыстым. У яго сэрцы не было нічога іншага, што б ён любіў так моцна, як Госпада. Любоў да Бога нашмат пераўзыходзіла усё добрае, што мог прапанаваць Давіду свет. Тыя рэчы, якія мы любім або якім давяраем больш, чым Ісусу, называюцца ідаламі. Давід піша:

> Хто ўзыйдзе на гару ГОСПАДА, і хто стане на месцы Ягоным сьвятым? Той, у каго рукі бязьвінныя і сэрца чыстае, хто душы сваёй да марноты не схіляе і не прысягае крывадушна (Псалом 24 (23):3-4).

Чалавек мае чыстае сэрца, калі любіць Ісуса мацней за штосьці іншае і давярае Ісусу болей, чым камусьці іншаму. У Мацьвея 10:37 Ісус кажа: «Хто любіць бацьку ці маці больш за Мяне, ня варты Мяне; і хто любіць сына ці дачку больш за Мяне, ня варты Мяне».

Давайце ж падчас пустыні не будзем, як сыны Ізраіля. Яны так моцна любілі сваё зямное жыццё, што прапусцілі магчымасць ведаць Бога.

У Ісаі 35:1-2 напісана:

> Няхай весяліцца пустыня і [зямля] сухая, няхай радуецца стэп і няхай красуе, як нарцыс! Няхай, квітнеючы, заквітнее і няхай радуецца з ускліканьнямі і сьпяваньнем, бо слава Лібану дадзена ёй, прыгажосьць Кармэлю і Шарону. Яны ўбачаць славу ГОСПАДА, веліч Бога нашага.

Слава Госпада адкрываецца ў пустыні!

Давайце далучымся да кампаніі ўсіх вялікіх святых, якія прайшлі перад намі! Наблізімся да Бога з чыстымі рукамі і чыстым сэрцам, як Давід, Майсей, Павал, Язэп і іншыя вялікія мужы і жанчыны Божыя!

3

# НЕАБХОДНАЯ ПУСТЫНЯ

*Вярніцеся ў думках да ўсіх сваіх перажыванняў. Падумайце, як Госпад вёў вас у пустыні, карміў і апранаў кожны дзень. Як Бог цярпеў вашыя кепскія манеры, выслухоўваў вашыя нараканні і трываў вашае жаданне вярнуцца да «прыемнасцяў Эгіпта»! Падумайце пра тое, што Божай ласкі для вас было дастаткова ва ўсіх вашых праблемах.*

**– Чарльз Спэрджэн**

*Вёў цябе ГОСПАД, Бог твой, …праз пустыню, каб зьмяніць цябе і выспрабаваць цябе, і даведацца, што ў сэрцы тваім…*

**– Другазаконне 8:2**



Для мяне першая пустыня стала поўным шокам. Шчыра кажучы, мае першыя гады ў якасці вучня Хрыста былі нібыта працягам мядовага месяцу. Мы з Лізай перабраліся ў Далас, штат Тэхас, нейкі час я працаваў інжынерам, а потым мне прапанавалі служыць у нашай царкве. Мне трэба было дапамагаць пастару і яго жонцы прымаць гасцей, запрошаных у нашую вялікую царкву. Якая радасць! Я адчуў сябе як на нябёсах. Я клапаціўся пра найлепшых у свеце служыцеляў Эвангелля, таму што наша царква была адной з самых вядомых у Амерыцы.

Калі гэтыя знакамітыя служыцелі з Амерыкі і іншых краін прыляталі да нас, мне трэба было сустрэць іх у аэрапорце і адвезці ў царкву або туды, дзе яны спыняліся. Я быў адказны за тое, каб вазіць іх у розныя месцы падчас візітаў і абедаць з імі. Мне давялося правесці шмат часу з выбітнымі служыцелямі нашага пакалення. Мае першыя гады на гэтай пасадзе былі проста фантастычнымі – поўнымі жыцця.

Але потым усё пачало ўскладняцца. Моцна ўскладняцца. Тады я гэтага не ведаў, таму што Бог мне гэтага не адкрыў, але я ўваходзіў у пустыню. У гэтым месцы Бог вучыць нас. Тут развіваецца наш характар і ўмацоўваецца наша вера. Гэта *неабходная пустыня.*

Уявіце сабе наступнае: вы – ізраільцянін, вы атрымалі свабоду ад рабства. Вы толькі што перажылі страшны, але захапляльны пераход

праз мора паміж дзвюма бурлівымі сценамі хваляў, і вышлі, жывы і здаровы, з вады на другі бераг. Вы азірнуліся і ўбачылі, як сцены, што абаранялі вас, абрынуліся на вашых ворагаў. Вашыя мучыцелі знішчаны і зніклі назаўжды. Вы радасна адсвяткавалі Божае вызваленне ў танцы! Вы адчуваеце сябе непераможным, ведаючы, што Бог на вашым баку. Вы больш ніколі не будзеце сумнявацца ў Яго сіле ці вернасці!

Але цяпер дэкарацыі памяняліся. Прайшло некалькі дзён. Вы стаміліся, хочаце піць, вам горача. Вы не стаіце на парозе абяцанай вам зямлі: наадварот, вы, падаецца, без мэты блукаеце ў пустыні, поўнай змеяў і скарпіёнаў. Вы ўжо не танчыце і не спяваеце Госпаду пра каня і вершніка, укінутага ў мора, але скардзіцеся кіраўніку, кажучы: «Навошта ты вывеў нас з Эгіпта? Каб мы, нашы дзеці і нашы статкі памерлі ад смагі?»

Вернемся да вас… Няўжо вы думаеце, што Бог выратуе вас ад ворага толькі дзеля таго, каб пакінуць блукаць у пустыні без мэты, без шляху, у збянтэжанасці і цішыні? Ці ў гэтым Яго мэта? Вядома, не. Проста гэта неабходнае месца на шляху ў абяцаную зямлю.

Як Госпад вывеў народ Ізраіля з Эгіпта ў пустыню, так Ён вядзе і вас. У пустыню вас прывёў не д’ябал, а Бог. І гэты засушлівы перыяд мае сваю мэту, Божую задуму. Па-першае, Бог упакорвае нас, потым Ён выпрабоўвае нас. Ён робіць так, каб мы даведаліся *сапраўдны* стан нашых сэрцаў.

Як Бог упакорвае нас? «Ён выпрабоўваў цябе голадам і карміў цябе маннай» (Другазаконне 8:3). Ён упакорыў Ізраіль, дазволіўшы ім адчуць голад. Але ўжо ў наступным сказе гаворыцца, што Бог карміў іх маннай. Падаецца, тут нейкая супярэчлівасць. Як Бог мог выпрабаваць іх голадам, калі Ён карміў іх маннай?

Дык вось, манна – найлепшая ежа ў свеце, гэта ежа анёлаў! Іллю хапіла ўсяго толькі двух хлябоў з манны на сорак дзён шляху. А ў ізраільцян было шмат манны. Шэсць дзён на тыдзень з ранку яны атрымлівалі свежыя пастаўкі з нябёсаў. А сабранага ў шосты дзень

цудоўным чынам хапала аж да сёмага дня. *Ізраільцяне не прапусцілі аніводнага пасілку* з таго дня, калі Бог упершыню даў ім манну, да часу, пакуль не прыйшлі да межаў Абяцанай Зямлі.

Дык чаму ж Бог сказаў, што выпрабоўваў іх голадам? Пра які голад Ён гаворыць? Каб зразумець, давайце разбяромся ў іх сітуацыі. Скажам, на сняданак у вас быў хлеб, увечары вы таксама елі толькі хлеб. Без масла, без арахісавай пасты, джэму, мяса або тунца – *проста хлеб.* І так на працягу *сарака гадоў*, а не проста некалькіх дзён або тыдняў!

Калі я быў моладзевым пастарам, мы вазілі 56 маладых людзей у Трынідад на васьмідзённае місіянерскае падарожжа. Царква ў Трынідадзе гатавала нам ежу, і нашы гаспадары былі вельмі прыязнымі. Але кожны дзень мы елі курыцу. Яе гатавалі ў розныя спосабы і падавалі з рысам і гароднінай, але гэта *заўсёды была курыца.*

Праз восем дзён харчавання курыцай мы згаладаліся па іншай ежы. Вярнуўшыся дадому, адзін з удзельнікаў групы спытаўся ў маці, што будзе на вячэру. «Курыца!» – адказала тая. Малады чалавек у роспачы папрасіў маці схадзіць у кавярню і павячэраць гамбургерам.

У Трынідадзе мы стагналі пасля ўсяго толькі васьмі дзён. Можаце ўявіць сабе сорак год? Не чатыры гады, але *сорак* год аднолькавай ежы! Цяпер мы бачым, як Бог выпрабоўваў ізраільцян голадам. Ён даваў ім не тое, што яны прагнулі, але толькі тое, што ім сапраўды было патрэбна, каб застацца жывымі і здаровымі.

Што яшчэ ў тых абставінах прымушала іх галадаць і прагнуць тое, чаго ў іх не было? Калі мы чытаем гісторыю ізраільцянаў, можна падумаць: «Ого! Іх адзенне і абутак не зношваліся! Вось гэта эканомія для сямейнага бюджэту!» Добра, але вы захочаце насіць тое самае наступныя сорак год? Якая нудота! Ніякіх паходаў у крамы, ніякіх абновак! Адны і тыя ж карычневыя сандалы на сорак год!

Так, іх асноўныя патрэбы былі забяспечаныя: адзенне абараняла

ад спёкі і холаду, але ізраільцянам не хапала многіх іншых рэчаў, якія ім хацелася мець.

Цяпер падумайце пра аднастайны пейзаж, які яны бачылі дзень пры дні. І не проста некалькі тыдняў, але *сорак гадоў*! Ці хацелі б вы бачыць тыя самыя кактусы, кустоўе і сухую зямлю? Ніякіх ціхіх ручаёў, густых лясоў, прыгожых вінаграднікаў ці азёр – толькі пустыня дзень пры дні?

Ізраільцяне мелі неабходныя рэчы, але не мелі тое, што ім хацелася. Давайце зноў абдумаем гэты верш у святле прачытанага:

> Ён выпрабоўваў цябе голадам і карміў цябе маннай, …каб даць зразумець табе, што ня толькі хлебам жыве чалавек, але кожным [словам], якое выходзіць з вуснаў ГОСПАДА, будзе жыць чалавек (Другазаконне 8:3).

Бог стварыў голад, прыбраўшы ўсё, што магло задаволіць жаданні іх цела, і забяспечваў толькі асноўныя патрэбы. І гэты голад стаў выпрабаваннем: Бог хацеў убачыць, ці будуць ізраільцяне прагнуць Яго замест таго, што пакінулі ў Эгіпце. Будуць шукаць Яго ці тое, што прагне іх цела? Будуць смагнуць праведнасці ці будуць сумаваць па камфорце і прыемнасцях? На жаль, сэрцы ізраільцянаў не былі скіраваныя да Таго Адзінага, хто можа насыціць, і таму яны правалілі экзамен:

> Іншапляменьнікі, якія [былі] паміж імі, зажадалі пажаданьнем і [захацелі] вярнуцца, і разам з імі сыны Ізраіля плакалі і казалі: «Хто дасьць нам есьці мяса? Мы памятаем, як у Эгіпце мы елі дарма рыбу, агуркі, дыні, салат, цыбулю і часнык. А цяпер душа нашая ссохла, нічога іншага ня бачаць вочы нашыя, апрача манны» (Лікі 11:4-6).

Народ Ізраіля ўспомніў тое, што засталося ў Эгіпце. Нават жыццё ў рабстве і прыгнёце падавалася прывабнейшым за сухую пустыню,

у якую іх прывёў Бог. Ізраільцяне пачалі скардзіцца і наракаць, прасіць мяса. Бог пачуў іх крык:

> «І Ён даў ім тое, чаго хацелі… І елі яны [мяса, перапялоў],
> і насыціліся добра, і тое, што яны жадалі, Ён даў ім.Яшчэ
> не пазбавіліся яны жаданьня свайго, яшчэ спажыва іхняя
> была ў вуснах іхніх… І спаслаў зьнемажэньне ў душу іхнюю»
> (Псальмы 106 (105):15; 78 (77):29-30).

Яны атрымалі жаданае, але за вялікі кошт. З гэтым мясам прыйшло знемажэнне душы, што зрабіла людзей няздольнымі трываць, няздольнымі прайсці выпрабаванне і, урэшце, яны так і не ўвайшлі ў Абяцаную Зямлю! Грэхам была не сама просьба пра мяса, але хутчэй тое, што за ёй стаяла. Такая просьба прадэманстравала: сэрцы ізраільцянаў не задаволены Богам і тым, як Бог іх вядзе і

## Парады па выжыванні ў пустыні

### # 3. Не паддавайцеся жаданню ўзяць справы ў свае рукі

Для амерыканцаў, якія любяць браць справу ў рукі і вырашаць пытанне, адна з найвялікшых спакусаў у пустыні – жаданне паскорыць падзеі. Калі здаецца, што Госпад сышоў і зараз Ён за мільёны кіламетраў ад вас, калі нават нашы сціплыя спробы зрабіць нешта дзеля Валадарства не даюць вынікаў, калі гадзіны малітваў адгукаюцца толькі болем у каленях, у адчаі мы можам паспрабаваць што заўгодна, каб хоць нешта змянілася. Гэта кепская ідэя. Пустыня – не пра падзеі. Тут мала вады і аднастайнае харчаванне. У гэтай пустцы мы даведваемся, што жыццё значна большае за нашы справы і рэчы. Сэнс жыцця – у тым, каго мы блізка ведаем і чыю волю выконваем кожны дзень.

У адзін з маіх перыядаў пустыні кожны дзень падаваўся

забяспечвае. Таксама выявілася іх моцнае жаданне вярнуцца да жыцця, што было ў Эгіпце, пра якое яны ўспаміналі з прыемнасцю, забываючыся, што жылі ў рабстве.

Гэты добры ўрок для ўсіх нас: калі мы шукаем толькі выгодаў абяцанага, а не Таго, Хто абяцаў, мы не будзем мець сілы прайсці пустыню. Непазбежна мы будзем прыгадваць «старыя добрыя часы», якія (калі зірнуць з перспектывы праўды) зусім не былі добрымі, таму што былі днямі рабства.

Адна справа – шукаць Госпада дзеля таго, што Ён можа *вам даць або зрабіць для вас*. Зусім іншая – шукаць Госпада дзеля таго, *Які Ён ёсць*. Першы варыянт – для вашай карысці. Гэта эгаістычнае жаданне прывядзе – у найлепшым выпадку – да няспелых адносінаў з Богам. Калі вы шукаеце Госпада, каб спазнаць Яго, гэта дапаможа вам збудаваць моцныя, блізкія адносіны, якіх мы ўсе прагнем.

цэлым тыднем, а тыдзень – месяцам, бо я мала бачыў, мала адчуваў і быў слабы. Але я мусіў ісці далей. Мне трэба было рухацца наперад, шукаць натхненне ў Божым Слове у маім сэрцы, працягваць рабіць усё, што я мог, у служэнні, і ўстрымлівацца ад паспешлівых учынкаў, матываваных нецярплівасцю. Мне трэба было пастаянна нагадваць сабе, што я быў там, дзе Бог хацеў мяне бачыць. Ён не марнуе час, і Ён абавязкова выканае Свае абяцанні.

Пустыня – дакладна не тое месца, дзе можна рэкламаваць сябе! Памятайце: вы ўсё яшчэ ачышчаецеся і рыхтуецеся, таму вам трэба старанна працаваць над стабільнасцю служэння і супрацьстаяць спакусам саграшыць.

Госпад будуе аўтамагістраль праз пустыню, і вам важна рухацца побач з Ім. Не спрабуйце Яго абагнаць, хоць вам падаецца, што Ён рухаецца вельмі павольна!

## Дабраславёны недахоп

Як і чакалася, жыццё ў бясплоднай пустыні – гэта недахоп рэсурсаў. Гэта час, калі эмацыйна, фізічна і матэрыяльна вы атрымліваеце тое, што вам патрэбна, а не тое, што вам хочацца. Бог паабяцаў паклапаціцца пра нашы асноўныя патрэбы, таму ў пустыні Ён дае штодзённы хлеб, а не шыкоўную вячэру.

Калі ў Амерыцы добрыя часы, мы можам сказаць, што раскашуем, ямо тлустае мяса. У пустыні ж няма мяса! Мы многага пазбаўлены. У гэты час у сацыяльным плане вы маеце тое, што вам неабходна, а не тое, што вам хочацца. Бог ведае, што вам трэба ў пустыні духоўна, але, магчыма, вы не лічыце гэта неабходным для сябе. У такі час Ён адказвае на  патрэбы і не задавальняе нашы жаданні.

Мэта пустыні ў тым, каб ачысціць і ўмацаваць нас. Мы мусім шукаць *Божае сэрца*, а не *Божае забеспячэнне.* У такім выпадку, калі мы дасягнём часоў багацця і заможнасці, мы не забудзем: гэта Госпад, наш Бог, даў нам багацце, каб заключыць з намі Свой запавет (Другазаконне 8:2-18).

Асноўная праблема ў тым, што *наша* азначэнне патрэбаў і жаданняў вельмі адрозніваецца ад рэальнасці. Мы называем свае жаданні «патрэбамі», хоць гэта зусім не так! Магчыма, многім з нас яшчэ трэба зразумець, пра што тут кажа Павал:

> Не дзеля таго, што я ў нястачы, кажу, бо я навучыўся быць задаволеным тым, што ў мяне ёсьць. Ведаю, як у паніжэньні быць, і ведаю, як у дастатку; навучыўся ўсяго і ў-ва ўсім: і насычацца, і галадаваць, мець і дастатак, і нястачу. Усё магу ў Хрысьце, Які ўмацоўвае мяне (Філіпянам 4:11-13).

Праз сілу Хрыста Павал навучыўся быць задаволеным як у засушлівыя часы, так і ў багацці. Думаю, мы не навучыліся быць задаволенымі. У заходняй культуры, на жаль, многія з тых, хто

багаты, не нашмат больш задаволены, чым той, хто бедны. Калі мы не валодаем усім, што па праву, – як мы думаем, – нам належыць, мы лічым сябе абкрадзенымі. Мы мяркуем пра веру людзей і вымяраем іх духоўнасць на падставе іх маёмасці, поспеху або сацыяльнага статусу, хоць замест гэтага мусім глядзець на іх характар і веру.

Народ Ізраіля выйшаў з Эгіпта з вялікай маёмасцю, узятай у эгіпцян, – з залатымі і срэбнымі рэчамі і прыгожым адзеннем. Але яны выкарысталі золата і срэбра, каб зрабіць у пустыні ідала, а потым танчылі вакол яго, апрануўшы прыгожыя шаты.

Відавочна, такая маёмасць не вымярала святасць – насамрэч, якраз наадварот. Толькі два ўдзельнікі Выхаду мелі характар, што дазволіў ім увайсці і завалодаць Абяцанай Зямлёй. Туды ўвайшлі толькі Егошуа і Халеў, бо мелі іншы дух: яны пасвячона ішлі за Богам (Лікі 14:24).

Калі мы вымяраем адзін аднаго па стандартах маёмасці альбо статусу, наша сістэма каштоўнасцяў моцна скажаецца.

З другога боку, часта хрысціяне, што маюць фінансавую заможнасць або трапляюць на кіраўнічую пасаду, лічаць гэта Божым дазволам рабіць тое, што ім хочацца!

Яны купляюць тое, што хочуць, трацяць грошы на жаданыя рэчы ці выкарыстоўваюць уплыў дзеля сваёй карысці. Найчасцей так сябе паводзяць тыя, хто няправільна прайшоў засушлівыя часы. Насамрэч, фінансавыя дабраславенні і большая ўлада павінны прыносіць большую залежнасць ад Бога, пошук Яго мэты і кіраўніцтва.

Паразважайце пра стаўленне Ісуса да служэння. У Яго не было эгаістычнай матывацыі. Ён узяў на Сябе наш грэх, хваробы і смяротнае пакаранне. Ісус лічыў наш дабрабыт важнейшым за ўласны, хоць і не меў аніякага грэху. Яго мэтай у жыцці і служэнні было не прыдбаць штосьці Сабе, але ахвяраваць Сябе! Адрынуўшы Сябе, Ён падарыў нам найвялікшы дар – жыццё вечнае.

Калі мы знаходзімся ў пустыні, Бог развівае ў нас такую спеласць характару. У пустыні ўзрошчваецца плод Духа. Моцнае жаданне ведаць Бога спрыяе нам, каб мы навучыліся Яго шляхам і паводзінам.

4

# АДНОСІНЫ

*Проста захапляе, як шмат складанасцяў знікае без нашага ўдзелу, калі наладжваецца наша ўнутранае жыццё.*

**– А.У. Тозэр**

*Калі любіце Мяне, захоўвайце прыказаньні Мае.*

**– Ян 14:15**



Што хоча Бог, калі рыхтуе для нас пустыню? Мы назвалі некаторыя перавагі, і будзем размаўляць пра гэта далей. А ці ёсць у пустыні нейкі вынік, важны для Бога? Так. Бог жадае ўмацаваць нашы адносіны. Ён прагне, каб мы мелі блізкія адносіны з Ім. На жаль, многія карыстаюцца адносінамі з Госпадам дзеля саміх сябе, таму іх любоў да Бога змяншаецца.

Калі мы з Лізай былі заручаныя, я быў вельмі закаханы ў яе. Пастаянна пра яе думаў. Рабіў што заўгодна, каб праводзіць разам як мага больш часу. Калі ёй нешта было патрэбнае, чым бы я ні быў заняты, я ўскокваў у машыну і ехаў дапамагаць.

Аднойчы я наведаў Лізу ў бацькоўскім доме, і мы правялі разам каля пяці гадзін. Дадому я паехаў неахвотна. Як толькі я дабраўся, зазваніў тэлефон. Прыемны мяккі голас Лізы сказаў: «Ты забыўся ў нас куртку».

Гэта прагучала як музыка для маіх вушэй. Ні хвіліны не вагаючыся, я сказаў: «Тады я прыеду і забяру яе».

Так я і зрабіў, і мы правялі разам яшчэ тры ці чатыры гадзіны. Гэта быў цудоўны дзень.

Калі б яна пазваніла мне сярод ночы і сказала: «Даражэнькі, я хачу марожанае», – я б з радасцю адказаў: «Я прыеду праз дзесяць хвілін! Якое марожанае табе купіць?» Я шукаў час і прычыны быць з ёй побач. Маё каханне дапамагала знаходзіць радасць у выкананні

яе жаданняў. Я рабіў гэта не *каб даказаць*, што кахаў яе; я рабіў гэта *таму, што* кахаў яе.

Мне не трэба было прымушаць сябе размаўляць з людзьмі пра Лізу. Я хваліў яе кожнаму, хто згаджаўся слухаць. Калі ў размове ўзнікала паўза, я з лёгкасцю пачынаў казаць пра Лізу і наша будучае вяселле. Я быў закаханы!

Аднак усяго праз некалькі год пасля вяселля я звярнуў увагу на іншае: на спорт, сустрэчы з сябрамі, і асабліва – на служэнне. Цяпер якасны час з Лізай або яе патрэбы падаваліся цяжарам. Ліза ўжо не займала мае думкі так, як раней. Я рабіў падарункі толькі на Раство, угодкі вяселля і дзень народзінаў. На адно са святаў я забыў зрабіць ёй падарунак. Ліза была ў роспачы. Мне нічога не заставалася, як толькі выбачыцца. Самае сумнае, што я не быў дастаткова спелым, каб убачыць знакі часу ў нашым шлюбе. Нашы адносіны былі напружанымі; мая першая закаханасць памірала!

Я так удзячны Богу за тое, што ўрэшце Ён здолеў прыцягнуць маю ўвагу і дакрануцца да майго сэрца. Ён дазволіў мне ўбачыць, якім эгаістам я стаў. Са Сваёй ласкі аднавіў агонь нашага кахання і ацаліў наш шлюб.

Нешта падобнае можа адбыцца і ў нашых адносінах з Богам. Многія вучні Хрыста дасягаюць зоны камфорту або плато, дзе пачынаюць захоўваць, а не шукаць. Яны больш не шукаюць Бога і вызначаюць асабістыя духоўныя стандарты, параўноўваючы сябе з іншымі, або паводле таго, што лічаць правільным. У гэты момант яны ўжо не імкнуцца шукаць Бога глыбока, як асобу, а засяроджваюцца на штодзённых справах, імкненні да поспеху, клопатах жыццёвых. Яны шукаюць Бога дзеля Яго дабраславенняў, а не для таго, каб спазнаць Яго. Вернікі памыляюцца і паварочваюцца ад Бога да саміх сябе. Яны могуць працягваць развіваць “хрысціянскае” сяброўства і працаваць над сваім статусам у царкве, але больш не прагнуць Таго, хто дае ім жыццё.

Калі мы прысвячаем час, каб шукаць Божых дабраславенняў і

даброццяў, а не блізкіх адносінаў з Ім, нам лёгка збіцца з дарогі. Скажам праўду, мы хвалім сябе за час, праведзены ў малітве. Аднак калі б мы ўбачылі гэта з гледзішча Бога, то зразумелі б, што спрабуем выкарыстаць Яго. Бог становіцца проста крыніцай дапамогі ў час патрэбы. Але Ён занадта моцна нас любіць і не пакіне ў такім падмане. Ён зробіць для нас тое, што зрабіў для натоўпаў, якія хацелі ўбачыць Ісуса:

> Назаўтра натоўп, які стаяў на другім баку мора, убачыў, што там не было другога чаўна, апрача аднаго, у які ўвайшлі вучні Ягоныя, і што Ісус не ўваходзіў у човен з вучнямі Сваімі, але адплылі адны вучні Ягоныя. Другія ж чаўны прыплылі з Тыбэрыяды, паблізу ад таго месца, дзе елі хлеб, за які дзякаваў Госпад. Калі натоўп убачыў, што там няма ані Ісуса, ані вучняў Ягоных, дык увайшлі ў чаўны і прыплылі ў Капэрнаум, шукаючы Ісуса. І, знайшоўшы Яго на другім баку мора, сказалі Яму: «Раббі, калі Ты сюды прыйшоў?» Адказаў ім Ісус і сказаў: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: вы шукаеце Мяне не таму, што бачылі знак, але таму, што елі хлеб і наеліся» (Ян 6:22-26).

Ісус ведае сапраўдныя матывы, якія стаяць за нашымі ўчынкамі. Калі мноства народу прыйшло *шукаць Яго*, Ён убачыў, што іх больш цікавіла яшчэ адно дабраславенне (бясплатны пасілак), а не знакі ды іх разуменне. Знак дае напрамак ці інфармацыю і не паказвае сам на сябе. Ісус ведаў, што насамрэч гэтыя натоўпы ішлі за Ім не дзеля знакаў, якія адкрывалі, Хто Ён, а дзеля таго, каб быць сытымі.

Ці ведаеце вы людзей, якія звяртаюцца да вас толькі ў тых выпадках, калі ім нешта ад вас патрэбна? Або, яшчэ горш, ці былі ў вашым жыцці людзі, якія нібыта хацелі стаць вашымі сябрамі, а пазней вы даведваліся, што ім было нешта ад вас патрэбна – уплыў, грошы, дапамога? Вы як асоба іх не цікавілі, прынамсі, пасля таго, як зрабілі тое, што ім было трэба. Калі вас так выкарыстоўваюць, гэта *балюча*!

Такое эгаістычнае стаўленне напаўняе наша грамадства і Цела Хрыста. Многія людзі ў царкве незадаволеныя, іх любоў да Ісуса астыла. Яны служаць Госпаду дзеля асабістых выгодаў, а не з гарачай любові да Яго. Пакуль Бог дае тое, чаго яны *жадаюць*, гэтыя людзі шчаслівыя і маюць імпэт да Госпада. Але калі прыходзяць праблемы і жыццё ўскладняецца, адкрываюцца сапраўдныя матывы іх сэрцаў.

Калі мы засяроджваемся на *сабе*, нараканні непазбежныя. Чаму? Таму што ўрэшце прыйдуць праблемы або складанасці. Як толькі гэта адбудзецца, пачнуцца нараканні, якія падсілкоўваюць эгаізм. Калі складанасці доўжацца, то і нараканні працягваюцца. Прыклад – паводзіны ізраільцянаў. Калі Госпад збавіў іх ад жахаў жыцця ў Эгіпце пад кіраўніцтвам фараона, народ узрадаваўся:

> І ўзяла Мірыям прарочыца, сястра Аарона, бубен у руку сваю, і выйшлі за ёю ўсе жанчыны з бубнамі і танцамі. І адказала ім Мірыям: «Сьпявайце ГОСПАДУ, бо ўзьвялічваючыся, узьвялічыўся Ён; каня і вершніка ягонага ўкінуў у мора» (Выхад 15:20-21).

Радасць перапаўняла людзей. Яны захапляліся Божай веліччу, цудамі і сілай, Яго дабрынёй у тым, што Ён выратаваў іх з палону. Але ўсяго праз тры дні, калі яны прыйшлі да горкіх водаў у пустыні Шур, пачаліся нараканні: «Што будзем піць?» (Выхад 15:24). Гэта выглядала глупа. Ці ж не мог той самы Бог, які толькі што раздзяліў Чырвонае мора, даць ім добрую ваду? Ці ж не быў Майсей тым самым адважным правадыром, што і тры дні таму?

Бог сапраўды зрабіў так, што «стала салодкая вада». Але і гэты цуд хутка забыўся. Праз некалькі дзён народ зноў наракаў, цяпер наконт ежы. Яны абураліся: «Да таго, як Госпад нас вызваліў, было лепей!» Праўда? Ці было лепей рабіць цэглу пад наглядам ахоўнікаў, якія б’юць пугамі?

> І наракала, і наракала ўся грамада сыноў Ізраіля на Майсея і Аарона ў пустыні. І сказалі ім сыны Ізраіля: «Лепш бы мы памерлі ад рукі ГОСПАДА ў зямлі Эгіпецкай, калі мы сядзелі пры катлах з мясам, калі мы елі хлеб да насычэньня! Бо вы вывелі нас у гэтую пустыню, каб памерла з голаду ўся царква гэтая» (Выхад 16:2-3).

У цяжкія, засушлівыя часы пачынаюцца нараканні: звычайна на кіраўнікоў, членаў сям'і, сяброў, ворагаў, нават на ўрад. Большасць з нас баіцца і не называе Бога крыніцай нашых праблем. Гэтаксама ізраільцяне наракалі на Майсея і Аарона, але насамрэч яны думалі: *Госпад падвёў нас!* Майсей бачыў гэта і назваў усё сваімі імёнамі: «Не на нас нараканьне вашае, але на ГОСПАДА» (Выхад 16:8).

Пустыня адкрывае матывы нашых сэрцаў:

яны *эгаістычныя* ці альтруістычныя? Папрасіце Духа Святога паказаць вам, што сапраўды адбываецца ў вашым сэрцы, што рухае вамі? Якое стаўленне ці якія паводзіны трымаюць вас у асабістым «эгіпецкім» рабстве і прымушаюць наракаць у пустыні? Для вашай будучыні надзвычай важна быць сумленным і адкрытым да Яго выпраўленняў у любові.

Добрая навіна для ўсіх нас ў тым, што нічога не можа перашкодзіць нам пакаяцца і памяняць стан нашага сэрца! Мы можам зараз жа спыніць нараканні і шукаць адносінаў з Богам замест таго, каб проста выкарыстоўваць Яго як рэсурс.

Тады, па Сваёй любові, Бог можа адправіць нас у пустыню.

## Бог значна большы за любыя формулы

Ізраільскі народ не шукаў самога Бога, таму яны не ведалі Яго шляхі. Людзі радаваліся Яго вялікім справам, але, калі звышнатуральнае дзеянне Божае спынялася на нейкі час, яны збіваліся са шляху. Калі Майсей быў на гары, ізраільцяне адступалі ад Госпада і пакланяліся ідалам. Ім было дастаткова выгодаў збаўлення. Яны не прагнулі ведаць Бога больш і бліжэй.

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 4. Вырашыце, што для вас важна**

У адзін з маіх першых перыядаў пустыні мне было вельмі цяжка захоўваць пазітыўны настрой. Здавалася, нічога ніколі не зменіцца. Насамрэч, мяне турбавала не толькі неабходнасць чакаць. Падчас чакання я перажываў моцны боль і проста стаміўся ад непрыемнай сітуацыі, якая, на маю думку, не давала мне рухацца ў кірунку дадзенай Богам мары – служэння прапаведніка, які ездзіць па розных цэрквах. Госпад сказаў мне, што гэтая пустыня прыйшла ў маё жыццё для ачышчэння. Але аднойчы, калі я зноў прасіў Госпада адкрыць мне, чаму «гэтая пустыня працягваецца так доўга», Ён нагадаў мне: «Я хачу ўбачыць, каму ты служыш: Мне ці сваёй мары».

*Гэта* дакладна прыцягнула маю ўвагу! Мне давялося памаліцца і паразважаць над тым, што было сапраўды важна для мяне: цудоўная мара несці Эвангелле па ўсім свеце ці нашмат лепшая мэта паслухмяна давяраць Богу і чакаць, пакуль Ён прамовіць і вырушыць наперад. Толькі ў апошнім выпадку я змог бы адпавядаць Яго жаданням.

Таму вось мая парада: не дазваляйце цудоўным, дадзеным Богам марам, стаць важнейшымі за выкананне таго, што жадае Айцец, і важнейшымі за жыццё ў Божай прысутнасці.

Аднойчы ў пустыні Бог сказаў Майсею спусціцца з гары і загадаць народу асвяціцца, бо Ён зыдзе на гару Сінай, каб прамаўляць да іх, як раней гаварыў з Майсеем. Калі прыйшоў гэты дзень і Госпад з’явіўся ў Сваёй захапляльнай велічы, народ не вытрымаў:

> І ўвесь народ глядзеў на грымоты і бліскавіцы, і гук трубы, і гару, якая дымілася; і, глядзеў народ, і хістаўся, і стаяў здалёк. І сказалі яны Майсею: «Ты прамаўляй да нас, і мы будзем слухаць; але няхай не прамаўляе да нас Бог, каб нам не памерці» (Выхад 20:18-19).

Яны прасілі Майсея: «Ты размаўляй з Богам замест нас і кажы нам тое, што Ён скажа, і мы выканаем гэта» (парафраз мой), зноў паказваючы сваё эгаістычнае жаданне карыстацца выгодамі Божай прысутнасці без *адносінаў* з Ім. Магчыма, іх намеры былі добрымі: яны хацелі выконваць Слова Божае, але без блізкіх *адносінаў* з Ім яны не маглі гэтага зрабіць.

Ізраільцяне хацелі не адносінаў, а адказаў на свае праблемы, таму Бог… што, на вашу думку, зрабіў Бог? – Ён даў ім Дзесяць прыказанняў! Але і гэта не выправіла праблему. Кожнае наступнае пакаленне даказвала, што не можа выконваць прыказанні.

А што наконт сучаснага пакалення? Хто сярод нас з найлепшымі намерамі імкнецца трымацца шляхоў Божых? Мы даём абяцанні, якія не выконваем, пакуль нам не становіцца так цяжка, што мы ледзь можам узвысіць голас у малітве. Урэшце мы звяртаемся да пастара, сужонка, сябра або любімага блогера, спадзеючыся, што нейкім чынам можам выкарыстаць іх пошук Бога як свой уласны і палепшыць адносіны з Госпадам. Як і дзеці Ізраіля, мы стараемся трымацца Слова Божага, Яго прыказанняў, не падтрымліваючы жыццядайных асабістых адносінаў з Ім. У Яна 14:21 Ісус кажа: «Хто мае прыказаньні Мае і захоўвае іх, той любіць Мяне, а таго, хто любіць Мяне, будзе любіць Айцец Мой, і Я палюблю яго, і зьяўлю яму Сябе».

Я чытаў гэты верш і думаў, што Госпад кажа: «Джон, калі захаваеш і выканаеш Мае прыказанні, ты дакажаш, што любіш Мяне». Потым Госпад сказаў мне перачытаць гэты верш яшчэ раз. Калі я зрабіў гэта, Ён сказаў: «Ты ўсё яшчэ не зразумеў, што Я кажу. Прачытай верш

зноў!» *Добра, Госпад.* Гэта працягвалася, пакуль я не прачытаў верш дзевяць ці дзесяць разоў.

Урэшце, я закрычаў да Госпада: «Госпад, прабач маё невуцтва; пакажы мне, што Ты кажаш тут!»

«Джон, Я не кажу: калі ты будзеш захоўваць Мае прыказанні, ты дакажаш, што любіш Мяне, - адказаў Ён. – Я ўжо ведаю, любіш ты Мяне ці не. Я кажу: калі чалавек моцна Мяне палюбіць, ён зможа захоўваць і выконваць Мае прыказанні!»

Я зразумеў! Гэта *адносіны*, не *закон*. Я разглядаў гэта як загад, як закон. Бог жа адкрыў мне важнасць *адносінаў*.

– Немагчыма пазнаць Бога праз правілы і ўказы.

– Немагчыма знайсці Бога праз розныя метады.

– Вялікі, Усемагутны Бог не можа быць зведзены да формулы!

Але многія з нас менавіта так уяўляюць Госпада. На месца адносінаў з Богам становяцца «законы і формулы», як сем крокаў да шчаслівага жыцця, чатыры крокі збаўлення, пяць аспектаў паспяховых адносінаў, правераны спосаб атрымаць адказ на малітву… мы ўяўляем сабе Бога ў скрыні з абяцаннямі, нібыта Яго можна адтуль дастаць і выкарыстоўваць па меры неабходнасці. Калі ставіцца да Бога такім чынам, ці дзіва, што з грахом справіцца становіцца так цяжка?

Бог не ёсць найноўшай формулай самадапамогі! Ён – Бог Жывы, які напаўняе Сваіх дзяцей – мяне і вас. Ён хоча ведаць нас і ўдзельнічаць ва ўсім, чым мы ёсць і што мы робім! Гэта шчырыя адносіны. Людзі дазваляюць любові згасаць, і таму зразумела, чаму Ісус кажа:

> «Але маю супраць цябе, што ты пакінуў першую любоў тваю. Дык памятай, адкуль выпаў, і навярніся, і рабі першыя справы твае; а калі не, хутка прыйду да цябе і зрушу сьвечнік твой з месца ягонага, калі не навернешся» (Адкрыццё 2:4-5).

У адрозненне ад іншых ізраільцян, Майсею не было дастаткова пакланення Богу здалёк. Калі ён убачыў аблічча Божай прысутнасці, ён не адступіўся. Майсей ішоў далей. У Кнізе Выхаду 20:21 мы чытаем: «І стаяў народ здалёк, а Майсей наблізіўся да імглы, туды, дзе Бог». Хоць Майсей быў уплывовым і магутным чалавекам, які браў удзел у найвыбітнейшых цудах і знаках Старога Запавету, а таксама быў правадыром трохмільённага народа, – ён ведаў: толькі гэта ніколі яго не задаволіць. Удумайцеся ў малітву Майсея пасля таго, як ён перажыў розныя знакі і цуды:

> « І цяпер, калі я знайшоў ласку ў вачах Тваіх, дай мне спазнаць, прашу, шлях Твой, і я спазнаю Цябе, каб знайсьці ласку ў вачах Тваіх… Калі ня пойдзе аблічча Тваё, не выводзь нас адгэтуль… Пакажы мне, прашу, славу Тваю» (Выхад 33:13-18).

Бог зрабіў Майсею цудоўную прапанову. Пасярод суровай пустыні Бог сказаў яму пайсці да народа і прывесці яго ў Абяцаную Зямлю. Ён нават прапанаваў паслаць перад імі анёла, каб яны дайшлі туды бяспечна. Бог нагадаў Майсею, якой добрай будзе тая зямля: там будзе цячы малако і мёд, там будзе шмат лясоў і фруктовых садоў. Але Бог папярэдзіў, што Ён Сам не пойдзе з імі. Пачуўшы такое, Майсей адмовіўся ад шляхетнай прапановы Бога. Па сутнасці, ён сказаў: «Мне лепш мець Тваю прысутнасць без Тваіх абяцанняў, чым абяцанні без Тваёй прысутнасці». Я ўпэўнены, Богу вельмі спадабалася такое стаўленне.

Майсей жадаў яшчэ большага, таму ён адважна прасіў далей: «Дай мне спазнаць, прашу, шлях Твой, і я спазнаю Цябе» (Выхад 33:13). Каб ведаць Бога, нам неабходна ведаць Яго *шляхі*! Ён адкрывае Свае шляхі тым, хто шукае Яго сэрца, а не проста Яго сілы або дароў. Аднак тыя, хто ведаюць Яго сэрца, будуць хадзіць у Яго сіле: «…але народ, які ведае Бога свайго, умацуецца і будзе дзейнічаць» (Данііл 11:32).

Калі я толькі пачаў займацца служэннем, амаль кожную раніцу я маліўся адну-дзве гадзіны. Мае малітвы гучалі прыкладна так: «Бог, выкарыстай мяне, каб збаўляць душы, каб ацаляць хворых, каб выганяць дэманаў». Я маліўся далей і далей – пра тое ж самае іншымі словамі. Я маліўся пра служэнне, якое дасягне многіх, і адчуваў сябе сапраўдным альтруістам.

Аднойчы Госпад прамовіў да мяне: «Сын, твае малітвы эгаістычныя і не дасягаюць мэты». Я разгубіўся і не ведаў, што гэта значыць.

Ён спытаўся: «Які твой матыў, калі ты хочаш так зрабіць? Усё, што я чую ад цябе: “Выкарыстай мяне, каб…”. Ты – цэнтр малітвы. Мая мэта, калі Я ствараў цябе, была не ў заваяванні душ, выгнанні бесаў або ацаленні хворых. Я стварыў цябе для блізкіх адносінаў. Вось у чым твая мэта».

Гэта здзівіла мяне. Потым Ён паказаў мне тое, што я ніколі не забуду: *Юда вызваляў і ацаляў людзей у імя Ісуса!* Так, калі Ісус адправіў Дванаццаць, Ён адправіў усіх,  у тым ліку і Юду, які пазней выдаў Яго. Божая мэта для нас – Яго нябесны прыз – ведаць Ісуса Хрыста (Філіпянам 3:10).

Праз некалькі гадоў Ліза малілася падобнай на малітвай, рыхтуючыся да служэння. Госпад пачаў размаўляць з ёй. Ён сказаў ёй: «Ліза, я не *выкарыстоўваю* людзей. Я памазваю іх, ацаляю, перамяняю, раблю падобнымі на Мой вобраз. Але Я не *выкарыстоўваю* іх». Потым Ён спытаўся:

– Ліза, твае сябры калі-небудзь цябе выкарыстоўвалі?

– Так, – адказала яна.

– Як ты сябе адчувала? – спытаўся Госпад.

– Я адчувала, што мне здрадзілі!

Госпад працягваў: «Многія служыцелі просяць Мяне толькі выкарыстоўваць іх. “Выкарыстай мяне для ацалення, для ўплыву, для збаўлення”. Я рабіў гэта, спадзеючыся, што іх сэрца наблізіцца да Мяне. Але яны былі занадта занятыя служэннем. Яны не хацелі

ведаць Мае шляхі, таму выкарыстоўвалі Мой дар, каб збудаваць *сваю ўласную* імперыю. Калі прыходзілі праблемы, яны звярталіся да Мяне і крыўдзіліся, што Я не адказваў на іх малітвы ў запланаваны імі час і спосаб. Яны адчувалі, што імі скарысталіся, і злаваліся на Мяне. Яны адыходзілі ад Мяне, бо не ведалі Мяне».

Што вы падумаеце пра жанчыну, адзіным жаданнем якой будзе нараджаць дзяцей мужу, не цікавячыся ім, як асобай? Яна ляжыць ля яго ног і крычыць: «Дарагі муж, прашу, *выкарыстай* мяне, каб нарадзіць табе дзяцей! Прашу, прашу, дай мне дзяцей, інакш я памру!» Гучыць абсурдна, але мала адрозніваецца ад нашых просьбаў, каб Бог «выкарыстоўваў нас для збаўлення людзей», калі мы насамрэч не маем блізкіх адносінаў з Ім. Калі мы блізкія да Бога, то ў нас будуць нараджацца духоўныя дзеці, падобна на тое, як гэта адбываецца і ў шлюбе.

Ізраільцяне не тое шукалі і не да таго імкнуліся. Яны шукалі *створанае*, а не *Творцу.* І мы ведаем, што адбылося. Пустыня не стала для іх месцам падрыхтоўкі, атрымання мудрасці і сілы для таго, што чакае наперадзе. Пустыня стала для іх бескарысным месцам і ўрэшце забрала цэлае пакаленне! Жах! Зямля Абяцаная была зусім блізка.

Які ўрок для нас усіх! Пустыня мусіць стаць часам радаснага падарожжа і блізкіх адносін з Богам.

# 5

# НОВАЕ ВІНО

*Няхай мы будзем начыннем для Твайго новага віна, якое абнаўляе ўсё.*

**– Эфрэм Сірыйскі**

*Але вы ня ўзгадвайце пра мінулае і пра старадаўняе не разважайце. Вось, Я раблю новае, цяпер яно вырастае. Ці ж вы гэтага ня ведаеце? Вось, Я раблю шлях у пустыні, а рэкі — у стэпе.*

**– Ісая 43:18-19**



Каб ведаць Бога бліжэй, мы мусім радавацца пераменам і прымаць іх. І для гэтага няма нічога лепшага за пустыню. Тут, у самым, як падаецца, бясплодным і пакінутым месцы, мы ўбачым новае дзеянне Яго Духа.

Многія змагаюцца з наступным пытаннем: *Чаму для таго, каб прыйшлі перамены, неабходны складаныя або засушлівыя часы?* Абмеркаванне ў гэтым раздзеле прывядзе да пэўнай высновы.

Пасля таго, як я прайшоў складанае падарожжа ў пустыні даўжынёй у паўтара года, мяне абралі кіраўніком моладзевага служэння (так, гэта было даволі даўно!). Царква ў Фларыдзе, куды я патрапіў, была ў Злучаных Штатах сярод тых, што хутка павялічваліся. Таму я трохі разгубіўся: у мяне не было досведу служэння ў якасці моладзевага пастара. Але я ведаў, што Бог пасылае мяне туды, і, калі я буду старанна шукаць Яго, усё будзе добра.

Гэтае моладзевае служэнне было пабудаванае па традыцыйнай мадэлі: прапанаваць дзецям і моладзі шмат крутых заняткаў. На жаль, многія з гэтых падлеткаў не раслі духоўна. Многія жылі нехрысціянскім жыццём. Таму, пачаўшы служэнне, я адчуў, як Дух Святы кажа мне: «Ты мусіш прапаведаваць вестку пакаяння, святасці, паслухмянасці і валадарства Ісуса». Менавіта гэтаму я вучыў і пра гэта прапаведаваў. І з цягам часу настрой у моладзевай групе заўважна памяняўся.

Вынікі былі цудоўнымі! Моладзевая група вырасла ў тры разы ўсяго за некалькі месяцаў. Члены бандаў, культаў і моладзь, далёкая ад Бога, хутка набліжалася да пазнання Ісуса. Шмат хто з адступнікаў загараўся для Госпада. Усім нам падабалася цудоўная прысутнасць Божая і рост у любові да Яго. Бог надзвычай моцна дабраслаўляў нас і нашы высілкі.

Пасля таго, як скончылася мая пустыня ў Даласе, я зрабіў выснову, што часы пустыні болей не вернуцца. Цяпер я выконваю маё пакліканне і прапаведую Эвангелле. Я падумаў: раз у Ісуса была толькі адна пустыня, то і ў маім жыцці будзе гэтаксама. Як я памыляўся! Шмат чаго яшчэ чакала мяне ў плане ачышчэння і ўмацавання, і шмат мне трэба было даведацца пра час пустыні. У параўнанні з наступнай пустыняй, праз якую я прайду, першая падасца прагулкай па парку.

Дух Святы даваў нашай камандзе лідараў вельмі шмат інавацыйных ідэяў. Гэта адбываецца, калі прыходзіць новае віно з нябёсаў, калі Бог «пасылае нас» пасля перыяду падрыхтоўкі. Ён паказвае нам, як працаваць эфектыўна і плённа, як Майсей, Давід, Язэп і іншыя.

Рост нашага моладзевага служэння быў сапраўды звышнатуральным. Але сярод усяго гэтага поспеху я адчуваў цяжар адносна нечага большага, чым проста наша група. Я адчуваў, што мы мусім дасягнуць усёй моладзі ў цэнтральнай Флорыдзе. У малітве ў нас з’явілася ідэя: *Што калі мы пакажам моладзевае служэнне па тэлебачанні?* Тады, у сярэдзіне 1980-х гадоў, гэта быў найлепшы спосаб дасягнуць людзей. Інтэрнэту, сацыяльных сетак, ютубу, смартфонаў – нічога гэтага не існавала. Я даведаўся, што адна з магутных мясцовых тэлестанцый магла вяшчаць на чатыры мільёны чалавек. На дзіва, у гэтай станцыі знайшоўся час у 10 вечара ў суботу. Я ведаў, што гэта добры час, каб «злавіць» падлеткаў.

Я прапанаваў гэтую ідэю нашаму старэйшаму пастару, і той сказаў, што ў нас няма на гэта сродкаў. Таму я спытаўся, ці магу прапанаваць

нашай моладзі дапамагчы сабраць грошы на тэлепраграму. Ён дазволіў, таму я прадставіў удзельнікам моладзевага служэння бачанне таго, як мы зможам данесці вестку Эвангелля да моладзі цэнтральнай Флорыды. Маладзёны загарэліся гэтым бачаннем, і з дапамогай іх ахвяраванняў з разносу газет, працы ў рэстаранах, крамах і іншых падпрацоўках мы сабралі дастаткова грошай, каб выходзіць па тэлебачанні кожны суботні вечар.

Наш старэйшы пастар быў уражаны і прызнаў, што Бог дзейнічае. Гэта быў вынік новага віна – ці чуў нехта пра моладзевую групу царквы, якая выходзіла ў эфір у 10 вечара па суботах? Але гэта спрацавала. Неўзабаве мы ўбачылі багаты ўраджай душаў, якія не пачулі б Эвангелля, калі б мы не прынялі «новага віна». На працягу многіх гадоў пасля таго, як я пакінуў пасаду моладзевага пастара, я чуў сведчанні людзей, жыццё якіх змянілася праз тэлеперадачу, якую мы назвалі «Моладзь у агні».

## Перамены – гэта добра

Неўзабаве мы вернемся да моладзевай групы. Але цяпер давайце разбяромся, што такое новае віно і чаму яно важнае.

Перамены, да якіх нас падштурхоўвае Бог, не заўсёды простыя, але яны заўсёды добрыя і плённыя. Мы часта супрацьстаім пераменам, бо яны ўплываюць на наш узровень камфорту. Мы – людзі звычкі. Як толькі мы прывыклі да чагосьці, нам некамфортна мяняць звычкі. Але нам неабходна быць больш адкрытымі на змены, калі мы хочам больш эфектыўна будаваць Божае Валадарства.

Калі мы раслі ў пабожнай сям’і, нашы рэлігійныя практыкі, метады і традыцыі сфармаваліся рана і добра ўкараніліся. Безумоўна, не ўсе традыцыі няправільныя, але калі людзі адгукаюцца проста па традыцыі, а не ад шчырага сэрца, іх вера можа стаць фармальнасцю, руцінай, у якой няма жыцця.

Насамрэч, такія руцінныя рэчы могуць нават стаць рэлігійнай цвярдыняй. Чалавек становіцца рэлігійным, калі практыкуе

знешнюю форму пабожнасці і трымаецца за тое, што Бог *рабіў*, але супрацьстаіць таму, што Бог *робіць* цяпер.

Фарысеі і іншыя рэлігійныя кіраўнікі часоў Ісуса дэманстравалі менавіта такія паводзіны. Яны хваліліся, што былі дзецьмі Абрагама, сынамі запавету і вучнямі Майсея. Моцна трымаючыся за тое, што зрабіў Бог, яны супрацьстаялі Божаму Сыну, Які быў сярод іх. Яны аддана абаранялі свае традыцыі і формы пакланення, таму выступалі супраць Ісуса, калі Ён з’явіўся сярод іх, кінуўшы выклік усім сферам камфорту і стабільнасці. Ісус ясна паказаў, што Бог не будзе адпавядаць іх рамкам. Наадварот, ім прыйдзецца адпавядаць Яго рамкам. Яны супрацьстаялі гэтым пераменам і трымаліся сваіх традыцый.

Проста рэлігійны чалавек будзе ставіцца фанабэрыста: «Бог будзе дзейнічаць толькі праз нас і толькі ў межах нашага разумення». Калі гэта не кантраляваць, такое стаўленне прывядзе да забабонаў і, урэшце, да нянавісці і здрады. Менавіта так адбылося ў часы Ісуса і адбывалася на працягу гісторыі царквы.

Каб змяніцца і перайсці з аднаго ўзроўня веры і славы на наступны, мы мусім жадаць выйсці з зоны камфорту і ісці тым шляхам, якім нас вядзе Дух Божы. Гэты шлях часта будзе праходзіць праз пустыню, дзе Бог дае паўстаць новаму жыццю.

Гэтыя паўторы былі відавочнымі і ў жыцці Яна Хрысціцеля. Яго бацька быў святаром – у нейкі час нават першасвятаром. Ян мусіў стаць святаром, як і яго бацька. Ён мусіў пайсці ў школу ў Ерусаліме і вучыцца на святара ў вядомага настаўніка Гамаліэля. Але аднойчы Дух Божы паклікаў Яна ў пустыню. Чым больш Ян маліўся, тым мацней ён адчуваў унутраную патрэбу пайсці ў пустыню. Я ўпэўнены, што ён перажываў унутраны канфлікт і думаў прыкладна так:

*Усе сябры, з якімі я рос, збіраюцца ў біблейскую школу.*
*Яны атрымаюць дыпломы і стануць прызнанымі лідарамі грамадства.*
*Яны стануць рукапакладзенымі лідарамі і змогуць*

*прапаведаваць ва ўсіх сінагогах. Што яны падумаюць пра мяне? Як я выканаю сваё прызначэнне, калі не пайду ў біблейскую школу? Я ведаю, у мяне ёсць пакліканне. Мой тата расказваў, што велічны Божы анёл абвесціў маё нараджэнне і сказаў, што я буду служыцелем. Але калі я пайду ў гэтую пустыню, ніхто ніколі не даведаецца, хто я такі. Мяне ніколі не запросяць прапаведаваць.*

У агні паклікання Ян пераадолеў пытанні, якія атачалі яго розум, і вырашыў пайсці за Духам у пустыню. Мы чытаем пра яго: «А дзіцятка ўзрастала і ўмацоўвалася духам, і было ў пустыні да дня зьяўленьня свайго Ізраілю» (Лукі 1:80). Цікава заўважыць, што Ян пачаў рыхтавацца да пустыні яшчэ як дзіця і правёў шмат год у падрыхтоўцы да служэння, якое доўжылася ўсяго шэсць месяцаў. Але Ісус сказаў, што Ян Хрысціцель быў найвялікшым прарокам, «народжаным ад жанчыны».

Пісанне не кажа, як доўга Ян прабыў у пустыні, колькі было пустынь у яго жыцці і з якімі складанасцямі яму давялося сутыкнуцца. У Лукі 3:2 мы чытаем: «…пры першасьвятарах Аньне і Каяфе было слова Божае да Яна, сына Захарыі, у пустыні». Цікава заўважыць, што пакуль Анна і Каяфа дзейнічалі ва ўмовах таго, што стане нескаардынаванай рэлігійнай сістэмай, у складаных умовах пустыні фармаваўся новы сасуд. Вось дзе адкрыецца новае віно.

Бог рыхтаваў Яна ў пустыні, а не ў звычайнай біблейскай школе тых часоў! Каб паслухаць Слова Госпада, якое Ян прамаўляў у пустыні, прыходзілі вялізныя натоўпы. Пачыналася новае веянне Духа, адкрывалася новае віно, але ў *пустыні*, а не ў *рэлігійных установах*. Тыя, каму ўжо было зашмат рэлігійнага крывадушша і традыцый, ішлі да Яна з сэрцамі, гатовымі мяняцца і рыхтавацца да з'яўлення Сына Божага.

У хуткім часе прыйшоў Ісус, каб Ян ахрысціў Яго ў рацэ Ярдан. Хоць Ян і адчуваў сябе недастойным гэта зрабіць, Ісус настаяў на

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 5. Жывіце ў намёце, не будуйце дом**

Ніколі не забывайце: пустыня часовая, вы проста праходзіце праз яе. Таму, пакуль вы ў пустыні, жывіце ў намёце. Вам дакладна не трэба будаваць дом!

Хоць ізраільцяне правялі ў пустыні некалькі дзесяцігоддзяў, блукаючы туды-сюды, першапачаткова Божая задума была зусім іншая. Ён не казаў ім знайсці найлепшае месца і пасяліцца там – гэта значыла б зміріцца з рэальнасцю, збудаваўшы дамы. Не, яны жылі ў намётах, хоць заўсёды і былі гатовыя сабрацца і выправіцца ў дарогу, калі падымецца воблака. Пустыня мусіла быць толькі часовым месцам, не канчатковай кропкай іх дарогі. Бог ніколі не казаў: «Слухайце, а ў пустыні не так ужо і кепска. Няўжо камусьці яшчэ патрэбная Абяцаная Зямля? Давайце пачнем закладаць падмуркі і збудуем добрыя дамы – для вас і для Мяне». Так, нават Сам Бог жыў у намёце ўвесь час пустыні.

Кемпінг можа быць вясёлай і нават прыемнай справай на кароткі перыяд часу, але большасць з нас усё ж абрала бы жыццё ў сапраўдным доме. Не губляйцеся і не закладайце падмуркі ў пустыні. Будзьце гатовыя ў любы час сабрацца і вырушыць у дарогу, а ўрэшце – скласці стары намёт на захаванне.

гэтым. Служэнне Ісуса мусіла пачацца ад таго, што Божы Дух рабіў у гэты час на зямлі. Пасля Ісус быў напоўнены Духам і адразу ж паведзены Ім у пустыню.

Біблія вельмі выразна кажа: калі Ісус быў паведзены ў пустыню, Ён быў *напоўнены* Духам, але праз сорак дзён выпрабаванняў і спакусаў Ён вярнуўся з пустыні ў *сіле* Духа. Цяпер Ён быў падрыхтаваны і ўзброены для служэння, дзеля якога прыйшоў на

зямлю. Усяго праз некалькі месяцаў служэння Яна Хрысціцеля з пустыні з'явілася нешта новае: служэнне Ісуса Хрыста.

## Новыя мяхі

У хуткім часе пасля пачатку служэння Ісуса мы чытаем: «А яны сказалі Яму: «Чаму вучні Яна посьцяць часта і моляцца, таксама і фарысэйскія, а Твае ядуць і п'юць?» (Лукі 5:33). Першае пытанне, якое варта тут задаць: «Хто гэтыя людзі?» Адказ мы знаходзім у Эвангеллі паводле Мацвея: «Тады прыходзяць да Яго вучні Янавы, кажучы...» (9:14). Шмат год я думаў, што гэта былі фарысеі, але калі я зразумеў, што гэта былі вучні Яна Хрысціцеля, я ўбачыў гэты ўрывак Пісання ў цалкам новым святле! Гэтыя людзі былі пакрыўджаныя, бо часта пасціліся і шмат маліліся, але вучні Ісуса не трымаліся такіх практык. Вучні Яна былі вельмі ахвярнымі, але ў цэнтры ўвагі апынуліся вучні Ісуса.

У часы Яна Дух Божы дзейнічаў у тым ліку і праз пост – праз вялікую колькасць пастоў. Але вучні Яна не перайшлі ад узора служэння Яна да таго, што *цяпер*, у дні Ісуса, рабіў Дух Божы. Яны лічылі, што менавіта іх *метад* служэння і пакланення прыносіў плён. Яны заплацілі вялікі кошт, каб ісці за Янам Хрысціцелем: пакінулі сваё сем'і, жылі ў пустыні, елі насякомых, а зараз іх кіраўнік і настаўнік быў у вязніцы. У гэтага новага Чалавека былі вучні, якія дзейнічалі не па правілах. Каманда Яна была пакрыўджаная і лёгка магла саслізнуць у рэлігійны дух.

Памятайце: рэлігійны дух заўсёды трымаецца за тое, што Бог *рабіў*, і супрацьстаіць таму, што Бог *робіць.* Магчыма, вучні Яна сталі больш турбавацца пра сваю вернасць настаўніку і пра тое, як ім трэба сябе паводзіць, чым пра тое, што *у той момант* рабіў і казаў Бог. Яны ўжо больш не засяроджваліся на Божым сэрцы. Цяпер яны засяродзіліся на *метадзе*, што некалі, магчыма, вёў да Божага сэрца.

Пыха і крыўда становяцца асноўнымі пачуццямі. Тыя, хто быў разам з Янам, ахвяравалі ў служэнне шмат часу, а магчыма, і грошай. Цяпер пад пагрозай было ўсё тое, што яны рабілі, за што выступалі

або што прыдбалі. Таму вучні Яна і заўпарціліся, супрацьстаўшы пераменам, хоць і іх настаўнік абвесціў пра Ісуса: «Яму трэба расьці, а мне — малець» (Ян 3:30).

Паслухайце, што адказаў ім Ісус: «Ці можаце прымусіць сыноў вясельля посьціць, калі з імі жаніх?» (Лукі 5:34) Ён выкрывае іх рэлігійнасць, кажучы: «Навошта Маім вучням пост, калі Сын Божы стаіць сярод іх? Усё, што патрабуецца, калі хочаце нешта атрымаць ад Бога, — прыйсці да Мяне» (перафразавана). Рэлігійнае мысленне прымусіла вучняў Яна паверыць, што ім трэба заслужыць Божую ласку праз пост і іншую рэлігійную дзейнасць. Яны лічылі, што пост — сродак доступу да Бога, і гэта ставіла іх вышэй за тых, хто не пасціўся і не выкарыстоўваў іншыя зразумелыя ім метады. Так з’яўлялася пыха. Метад стаў важнейшым за яго першапачатковы плод.

Хоць ва ўстрыманні ад ежы (посце) і ёсць карысць, пост патрэбны не каб маніпуляваць Богам, але каб прыйсці ў такі стан, калі мы зможам лепей пачуць Бога. Дык навошта было вучням пасціцца, каб пачуць Божы голас, калі Бог быў побач? Давайце зноў прачытаем Лукі 5:34-35: «Ісус адказаў: «Ці можаце прымусіць сыноў вясельля посьціць, калі з імі жаніх? Але прыйдуць дні, калі возьмуць у іх жаніха, і тады будуць посьціць у тыя дні».

Ісус не кажа: *магчыма*, яны будуць пасціцца ў тыя дні. Ён кажа: яны *будуць* пасціцца. Гэтыя вучні мелі на ўвазе звычайнае ўстрыманне ад ежы, але Ісус гаворыць пра іншы пост. Звярніце ўвагу: пост будзе ў тыя дні, калі ад іх забяруць Жаніха. Ісус кажа пра пост ад Яго яўнай прысутнасці, а не толькі пра пост-устрыманне ад ежы. Мы разумеем гэта дзякуючы Яго тлумачэнням у наступнай прыповесці. Памятайце, што ў пустыні мы можам не адчуваць Божай прысутнасці. І гэта адна з характарыстык пустыні. Давайце паслухаем прыповесць, з дапамогай якой Ісус тлумачыць Свае словы:

> «І ніхто не ўлівае маладога віна ў старыя мяхі, бо маладое віно прарве мяхі, і само выцячэ, і мяхі прападуць» (Лукі 5:37).

У Біблії віно – сімвал Божай прысутнасці. У Эфэсцам 5:18 Павал кажа: «І не ўпівайцеся віном, бо ў ім распуста, але напаўняйцеся Духам».

Мы мусім напаўняцца віном, Божай прысутнасцю! Новае віно – гэта свежы рух Яго Духа.

Давайце хутка падумаем над адным важным пытаннем. Ці памятаеце вы, як было цудоўна, калі вас упершыню напоўніў Дух? Божая прысутнасць была прыемнай і моцнай. Кожны раз падчас малітвы адразу ж з’яўлялася Яго прысутнасць, і вы ўвесь дзень адчувалі, што Ён блізка. Часам вы проста сядзелі і плакалі ў царкве, таму што Ён быў вельмі блізка.

Але аднойчы вы заўважылі, што Яго прысутнасць не адчуваецца так выразна. Вы моліцеся, як і раней, але пачынаеце задумвацца: *Дзе Ты, Бог?* Вы прыйшлі ў пустыню!

Гэтая пустыня, або пост ад адчування Божай прысутнасці, мае свае прычыны. Бог рыхтуе вас да таго, каб вы сталі новымі мяхамі. Немагчыма ўліць новае віно (новае дзеянне Духа Божага) у старыя мяхі.

У часы Ісуса выкарыстоўваліся мяхі, зробленыя з авечай скуры. Калі ў іх першы раз налівалі віно, яны лёгка расцягваліся, бо былі гнуткімі і мяккімі. Ішлі гады, сухое паветра Бліжняга Усходу ўплывала на мяхі, і яны станавіліся крохкімі і цвёрдымі. Калі віно вылівалі і запаўнялі мяхі зноў, яны не вытрымлівалі вагу новага віна і працэс бражэння, таму з лёгкасцю рваліся або трэскаліся. Каб працягнуць тэрмін службы, старыя мяхі некалькі дзён вымочвалі ў вадзе і націралі аліўкавым алеем, што рабіла іх зноў гнуткімі і мяккімі.

Гэта сімвал таго, што адбываецца з намі, бо мы – мяхі для новага духоўнага віна. Мы пакліканы несці Божую прысутнасць. Атмасфера, у якой мы жывём, можа зрабіць нас нечуллівымі да Божых шляхоў. Мы жывём не ў нябёсах, а ў сапсаваным асяроддзі, якое называецца “свет”. Таму нашаму розуму неабходна абнаўленне. Каб нашы мяхі заставаліся мяккімі і заўсёды гатовымі да новага віна, мы мусім “адмакаць” у Слове Божым. У Эфэсцам 5:25-26 Павал піша: «Хрыстос

палюбіў Царкву і выдаў Сябе за яе, каб асьвяціць яе, ачысьціўшы абмыцьцём водным у слове». Для нас націраць мяхі алеем значыць шукаць Бога ў малітве. Калі мы праводзім час з Богам, у Яго Слове і ў малітве, наш розум абнаўляецца і мы не застаемся зацвярдзелымі ў шляхах і метадах.

Але каб аднавіць старыя мяхі, спачатку трэба выліць старое віно! У ёмістасці няма віна – значыць, няма адчувальнай Божай прысутнасці! Гэта і ёсць пост, або адсутнасць Яго адчувальнай прысутнасці. Ці, як мы ўжо казалі, засушлівыя часы! Гэта падрыхтоўка да *пераменаў*!

Чаму Бог прыбірае Сваю адчувальную прысутнасць? Каб расстроіць вас? Не, хоць вы і расстроіцеся. Можа, Ён так робіць, бо хоча пакласці вас на паліцу, пакуль вы яму не спатрэбіцеся? Не! Прычына таго, што Ён аддаляе ад вас Сваю прысутнасць, у тым, каб вы пачалі шукаць Яго яшчэ старанней. Калі вы шукаеце Яго, вы зноў становіцеся гнуткімі і мяккімі. Зацвярдзелыя і нягнуткія людзі перастаюць шукаць Бога. Яны спыняюцца ў сваіх метадах. Яны закаранелыя ў формулах, якія самі вывелі з ранейшых шчырых перажыванняў.

Такім быў стан вучняў Яна Хрысціцеля. Яны прывязаліся да свайго настаўніка, бо бачылі: Госпад магутна дзейнічае праз яго. Але замест таго, каб імкнуцца да нябеснай ўзнагароды блізкага ведання Бога, яны зацвярдзелі ў сваіх пераканаННях і метадах.

У кожным дзеянні Божым ёсць абноўленае вучэнне. Вучэнне і здаровая дактрына – гэта сродкі наблізіць нас да сэрца Божага. Калі ж мы засяродзімся толькі на вучэнні ці на дактрыне як такой, урэшце гэта прывядзе нас да рэлігійнага ярма, законніцтва ці памылкі – або да ўсяго разам.

Немагчыма ведаць Бога праз механічнае пакланенне, а многія хрысціяне, самі таго не ўсведамляючы, трапляюць у пастку такога ладу жыцця. Яны вызначаюць крокі, мадэлі і звыклыя формулы пакланення. Калі такія людзі ўрэшце маюць патрэбныя веды, каб стаць узорным хрысціянінам, яны перастаюць *шукаць* і рухаюцца

адпаведна тым узорам і традыцыям, якія для сябе выпрацавалі. Але чамусьці яны адчуваюць спустошанасць, нават нягледзячы на тое, што нібыта жывуць у паўнаце Эвангелля.

У Ярэміі 29:12-13 мы чытаем:

> «Вы будзеце клікаць Мяне, і пойдзеце, і будзеце маліцца да Мяне, і Я выслухаю вас. І будзеце шукаць Мяне, і знойдзеце, калі будзеце шукаць Мяне ўсім сэрцам вашым».

Каб знайсці Яго, адной малітвы недастаткова. Ёсць многа верных малітоўнікаў, звязаных рэлігійнымі формуламі. Бог кажа, што ў сваёй малітве вы мусіце старанна шукаць *Яго.* Тут выразна сказана, што трэба шукаць, і для гэтага патрабуецца болей, чым звычайныя намаганні. Для гэтага неабходна вялікае жаданне і імкненне да пазнання Яго сэрца. Вось чаму Бог кажа ў Гебраям 11:6: «Той, хто прыходзіць да Бога, мусіць верыць, што Ён ёсьць і тым, хто шукае Яго, нагароду дае».

Цяпер давайце зноў зірнём на тое, што кажа Ісус:

> «І ніхто не ўлівае маладога віна ў старыя мяхі, бо маладое віно прарве мяхі, і само выцячэ, і мяхі прападуць; але маладое віно трэба ўліваць у новыя мяхі; і захаваецца тое і другое. І ніхто, п’ючы старое віно, не захоча адразу маладога, бо кажа: “Старое лепшае”» (Лукі 5:37-39).

Ніхто з тых, хто каштаваў старое віно, не захоча адразу ж новага віна. Ключавое слова – «адразу», бо мы людзі, якія маюць пэўныя звычкі. Бог жадае разбурыць гэтыя зоны камфорту, выліўшы *старое віно* і дазволіўшы нам прайсці праз засушлівыя часы падрыхтоўкі, калі *віна няма*, каб мы запрагнулі *новага віна*. Калі вы смагнеце, а піць няма чаго, вы не будзеце скардзіцца: «Я не хачу гэтага маладога віна, я хачу старога». Калі вы прагнеце прысутнасці і сілы Божай, то

будзеце адкрытыя на новае дзеянне Божага Духа ў вашым жыцці. Вы будзеце як Давід, які ў часы пустыні казаў:

> Божа! Ты — Бог мой! Цябе я шукаю, Цябе прагне душа мая, па Табе тужыць цела маё ў сухой і спрагнёнай зямлі, на бязводзьдзі. Гэтак я ўглядаўся на Цябе ў сьвятасьці Тваёй, каб убачыць моц Тваю і славу Тваю (Псальм 63 (62):2-3).

Давід прагнуў сілы і прысутнасці Божай. Калі ён пачаў займацца тым, да чаго пакліканы, ён быў гнуткім у тым, чаго жадаў Госпад, у адрозненне ад цара Саўла, які ішоў сваімі шляхамі, а не шляхамі Божымі.

## Яшчэ адна пустыня

Я ўжо згадваў раней, што маё першае служэнне было ў якасці моладзевага пастара. Тэлеслужэнні былі вельмі паспяховымі. Таксама мы праводзілі эвангелізацыйныя радыёперадачы на другой па папулярнасці свецкай радыёстанцыі нашага рэгіёна. Усё ішло добра.

Аднойчы, калі я маліўся, Дух Божы сказаў мне, што надыходзяць перамены. Ён сказаў: «Я здыму цябе са служэння моладзевага пастара і пашлю цябе ў цэрквы і на канферэнцыі ў гарады ад усходу да захаду Амерыкі, ад канадскай да мексіканскай мяжы, ад Аляскі да Гаваяў…»

Я сказаў Лізе пра тое, што мне адкрыў Дух Божы, і мы захоўвалі гэта ў сэрцы, не падзяліўшыся ні з кім, акрамя сябра-пастара ў іншым штаце. Бог сказаў, што зробіць гэта, і я ведаў: калі Ён сапраўды прамовіў да мяне, мне не трэба дапамагаць Яму гэта зрабіць.

На працягу года нічога не адбывалася. У гэты час чакання ўваходзіць у Божую прысутнасць было для мяне ўсё цяжэй і цяжэй, а потым стала амаль немагчыма. Я праводзіў у малітве болей часу, чым раней, і па-ранейшаму падавалася, што я нікуды не рухаўся.

Апроч гэтага і першапачатковае бачанне, якое я меў для моладзевай групы, пачынала блякнуць (старое віно вылівалася). Чым больш я маліўся, тым меней станавілася бачанне. Знешне нічога не змянілася, але маё ўнутранае жаданне малела.

Перад пачаткам моладзевых служэнняў я праводзіў па некалькі гадзін у малітве, і пару раз нават прасіў Бога паставіць іншага прапаведніка. І прыходзіў на служэнні, адчуваючы пустату, але Божая прысутнасць ахінала мяне, калі я служыў. Калі я заканчваў служэнне і ішоў дадому, Яго прысутнасць пакідала мяне яшчэ на тыдзень!

Да таго ж, пасярод усіх гэтых складанасцяў, мы праходзілі праз унутраныя і знешнія выпрабаванні, роўных якім у нашым жыцці не бывала. Я разважаў, ці была праблема ўва мне, таму пачаў вызнаваць любы грэх, пра які толькі мог падумаць, але засушлівы час не адступаў.

Аднойчы, калі я спрабаваў вылічыць, які ж дакладна грэх здзейсніў, Госпад сказаў мне: «Ты ў пустыні не таму, што саграшыў! Я рыхтую цябе для надыходзячых пераменаў».

Бог фармаваў ува мне характар, неабходны, каб справіцца з выклікамі наступнага этапа служэння. Звернемся да Ісаі 43:18-19:

> «Але вы ня ўзгадвайце пра мінулае і пра старадаўняе не разважайце. Вось, Я раблю новае, цяпер яно вырастае. Ці ж вы гэтага ня ведаеце? Вось, Я раблю шлях у пустыні, а рэкі — у стэпе».

Далей у кнізе я патлумачу, як у Свой час Госпад цудоўным чынам адкрыў канкрэтныя падрабязнасці «надыходзячых пераменаў». Увесь час, у самыя складаныя дні пустыні, Госпад рыхтаваў нараджэнне нашага служэння Амерыцы, а потым – іншым народам.

Сябры, запомніце: Бог выл’е ваша *старое* віно, бо Ён жадае, каб у часы прыходу *новага* віна і *новых* выпрабаванняў вы не запрагнулі вярнуцца да *старога.*

6

# НЯБЕСНАЯ ЎЗНАГАРОДА

*Некаторыя людзі азіраюцца ў мінулае і варушаць усе свае беды, потым узіраюцца ў будучыню і чакаюць яшчэ большых праблем; і так усё жыццё яны хістаюцца і спатыкаюцца.*

**– Д.Л. Мудзі**

*Браты, я не лічу сябе, што дасягнуў, а толькі, забываючыся пра тое, што ззаду, і імкнучыся да таго, што наперадзе, імчу да мэты, да ўзнагароды пакліканьня Божага, якое з гары ў Хрысьце Ісусе.*

**– Філіпянам 3:13-14**

Апостал Павал напісаў дзве траціны пасланняў Новага Запавету і адкрыў шмат цэркваў сярод тых, хто не належаў да габрэйскага народа. Яго служэнне распаўсюдзілася на ўвесь свет, аднак пад канец жыцця Павал сказаў: *«Я не лічу, што дасягнуў»*. Ён не быў задаволены – і не задаволіўся, пакуль не дасягнуў канца і нябеснай узнагароды.

Мы яшчэ не дасягнулі – нам трэба сцвердзіць гэта ў сэрцы, каб завяршыць свой шлях і атрымаць узнагароду.

Мы недасканалыя, нам неабходна мяняцца і расці.

У Майсея таксама было вялікае пакліканне: ён вёў трохмільённы народ і, як ніхто іншы ў Старым Запавеце, браў удзел у цудоўных знаках і падзеях. Аднак Бог сказаў, што Майсей быў самым рахманым (тым, каго лёгка вучыць) чалавекам на зямлі. Майсей не лічыў, што дасягнуў, але ішоў далей, каб завяршыць шлях і атрымаць нябесную ўзнагароду. Каб расці і мяняцца, нам патрэбна здольнасць вучыцца.

Другая рэч, якую нам трэба зрабіць, каб завершыць наш шлях у волі Божай, - гэта *забыць перамогі і паразы, што засталіся ззаду*! Звернемся да таго, што Бог кажа ў Ісаі 43:18-19:

> «Але вы ня ўзгадвайце пра мінулае і пра старадаўняе не разважайце. Вось, Я раблю новае, цяпер яно вырастае. Ці ж вы гэтага ня ведаеце? Вось, Я раблю шлях у пустыні, а рэкі — у стэпе».

Мінулыя няўдачы, адрынутасць ці грахі, якія мы ніяк не можам забыць, перашкодзяць нам рухацца наперад у Хрысце. Але нас могуць трымаць і мінулыя *трыумфы.* Калі мы пачуваемся занадта самаўпэўнена і маем высокую самаацэнку, абапіраючыся на старыя дасягненні, мы прапусцім тое, што Бог падрыхтаваў для нас. Менавіта гэта Бог кажа ў Ісаі 43. Мінулае – ад Яго, але каб рухацца наперад і дасягаць тое, што Ён для нас запланаваў, трэба быць гатовым пакінуць тое, як Бог дзейнічаў праз нас раней. Калі гэтага не адбудзецца, мы рызыкуем стаць старымі мяхамі.

Павал таксама падкрэслівае гэтую ісціну:

> Калі я быў немаўлём, як немаўлятка гаварыў, як немаўлятка думаў; а калі стаўся мужам, пакінуў тое, што немаўляці. Бо цяпер мы бачым праз [мутнае] шкло, невыразна; а тады — аблічам да абліча; цяпер я разумею часткова, а тады пазнаю [гэтаксама], як я сам пазнаны (1 Карынцянам 13:11-12).

Дзіця не памыляецца, яно проста няспелае. Калі мне было пяць гадоў, увесь мой свет, як падавалася, складаўся з цацачных машынак і канструктараў «Лега». Расказаць на памяць алфавіт было вялізным дасягненнем. Я бачыў жыццё праз мутнае шкло, бо яшчэ не быў дастаткова дарослым, каб справіцца з больш складанымі аспектамі.

Калі мне было васямнаццаць, машынкі і «Лега» засталіся ў мінулым. Цяпер, праз шмат гадоў сталення, я бачыў жыццё праз шкло, якое было ўжо не такім мутным. Мой узровень разумення і здольнасці выраслі. Калі васямнаццацігадовы паводзіць сябе, як пяцігадовы, гэта ненармальна. Калі мы расцём, мы адкладаем або забываем старыя, дзіцячыя шляхі і ўяўленні, больш непрыдатныя або некарысныя для нашых патрэбаў ці радасці.

Падобным чынам, калі мы ўзрастаем у справах Божым, ідучы праз розныя этапы жыцця, нам трэба пакідаць мінулыя, няспелыя справы. Павал казаў: цяпер мы бачым шляхі Божыя і Яго славу як праз

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 6. Спіс таго, што *не трэба* рабіць**

Паводле таго, што Пісанне кажа пра сумны досвед ізраільцян, падчас нашага побыту ў пустыні не варта рабіць некаторыя рэчы. Па шчырасці, перад вамі добры спіс таго, што ***не трэба*** рабіць у любы час хрысціянскага жыцця, але гэтыя грахі спакушаюць больш, калі мы праходзім змаганне ў пустыні. Вось асноўнае з гэтага спісу:

1. Жадаць злога. Калі мы чагосьці пазбаўленыя, здаецца, што няправільныя рэчы дапамогуць нам адчуць сябе лепей і прынясуць шчасце.

2. Імкнуцца да ідалаў. Гэта патуранне сваім жаданням, калі мы ведаем, што яны супярэчаць Божаму Слову. Гэта значыць любіць кагосьці або штосьці больш за Ісуса.

3. Паддавацца сэксуальным спакусам і амаральнасці.

мутнае шкло, але калі мы імкнёмся атрымаць нябесную ўзнагароду, мы будзем бачыць лепей, пакуль не ўбачым Бога аблічча да аблічча. Іншымі словамі, мы пазнаем Яго, як мы пазнаныя Ім!

Пра якую нябесную ўзнагароду згадваў Павал? Ён адказаў на гэта пытанне ў папярэднім вершы. У Філіпянам 3:10 напісана: «Каб пазнаць Яго, і сілу ўваскрасеньня Яго, і супольнасьць пакутаў Яго, прыпадабняючыся сьмерці Яго». Божая нябесная ўзнагарода – пераўтварацца на вобраз Яго Сына, Ісуса Хрыста, і ведаць Яго, як Ён ведае нас! Пакуль мы не дасягнём гэтай мэты, мы не будзем задаволены, таму нам трэба ніколі не пераставаць шукаць Божага сэрца.

Трэцяя рэч, якую нам неабходна рабіць, каб дасягнуць нябеснай узнагароды, – «імчаць да мэты»! Слова «імчаць» азначае, што будзе

4. Спакушаць Госпада.
5. Скардзіцца, скардзіцца і яшчэ раз скардзіцца.

У першым лісце да вернікаў у Карынце Павал згадвае: нашы папярэднікі могуць навучыць нас, як не трэба жыць у пустыні.

> Не хачу, браты, каб вы ня ведалі, што бацькі нашыя ўсе былі пад воблакам… Але ня многіх з іх упадабаў Бог, бо яны палеглі ў пустыні. А гэта сталася прыкладам для нас, каб мы ня мелі пажаданьня ліха, як пажадалі яны (1 Карынцянам 10:1, 5-6).

Ізраільцяне заплацілі вялікі кошт, таму давайце ў іх вучыцца.

Сябры мае, у пустыні вы можаце знайсці Божыя шляхі і нават спазнаць Яго сэрца, але вы мусіце быць настойлівымі і цвёрда сказаць у сэрцы: «Бог, я веру, што Ты добры і любіш мяне, нават калі я не адчуваю Тваю дабрыню і любоў».

супрацьстаянне або ціск, пэўная адлегласць. Нашаму пазнанню Госпада заўсёды будзе нешта супрацьстаяць.

Найбольшая пагроза для д’ябла – чалавек, які прыпадобніўся да Ісуса Хрыста, таму сілы цемры будуць упарта з гэтым змагацца. Калі вернікі пераМяняюцца на вобраз Хрыста, яны перастаюць жыць для сябе і жывуць для Таго, хто жыве ў іх. Тады іх жыццё ў Хрысце становіцца мацнейшым і больш насычаным. Вось чаму Павал сказаў: каб пазнаць Ісуса, нам трэба пазнаць супольнасць Яго пакутаў. Пакуты цела, пра якія кажа апостал, азначаюць смерць для сябе, і гэта прыносіць жыццё ўваскрасення! Пётр піша:

> Дык як Хрыстос цярпеў за нас целам, і вы ўзбройцеся такой думкаю, што той, хто церпіць целам, перастае грашыць, каб

> рэшту часу ў целе жыць не паводле чалавечых пажаданьняў, але паводле волі Божае (1 Пятр.4:1-2).

Калі мы пакутуем целам, намі ўжо не кіруюць нашыя шляхі, мы не пераследуем грэшныя жаданні свету. У нас дзейнічае характар Хрыста! Вось да якой мэты нам трэба імкнуцца.

## Пакуты з Хрыстом

Што такое пакуты або цярпенні Хрыстовы? Многія няправільна разумеюць гэтыя словы, бо пэўныя рэлігійныя вучэнні сказілі гэты біблійны тэрмін. Пакуты або цярпенні - гэта *не* смерць ад хваробы або недахоп грошай для аплаты рахункаў. Гэта *не* ўстрыманне ад ежы тыднямі дзеля таго, каб расчуліць Бога такой ахвярай. Цярпенні – гэта не ахвяра, гэта паслухмянасць! Аўтар Паслання да Гебраяў выразна паказвае, што такое пакуты Хрыста:

> Ён у дні цела Свайго з вялікім крыкам і сьлязьмі прыносіў просьбы і ўпрошваньні да Таго, Які мог збавіць Яго ад сьмерці, і быў выслуханы дзеля багабойнасьці. Хоць Ён — Сын, але навучыўся паслухмянасьці праз тое, што перацярпеў (Гебраям 5:7-8).

Ісус не прынёс паслухмянасць на зямлю; Яму давялося гэтаму навучыцца праз паслухмянасць Айцу, калі прасцей было не слухацца. Ён імкнуўся дагаджаць не людзям, але Богу. Ён ведаў, што ўрэшце Яго паслухмянасць прынясе людзям вялізную карысць. Пётр акрэслівае сапраўдныя цярпенні як жыццё паводле волі Божай, а не паводле жаданняў людзей (1 Пят. 4:2).

Выраз «цярпенні Хрыста» азначае «ісці Божым шляхам, калі наш розум, эмоцыі і фізічныя пачуцці клічуць рухацца ў бок лёгкага шляху, кампрамісу або прыемнасці». Так часта адбываецца ў сітуацыях канфлікту, калі Бог кажа *нам* ісці ў адзін бок, а сябры, сям'я, калегі і іншыя людзі хочуць, каб мы рухаліся ў іншы. На жаль,

звычайна мы сустракаемся з супрацьстаяннем з боку бліжніх. Класічны прыклад – сітуацыя, калі Пётр не згаджаецца з Ісусам адносна Яго смерці і пахавання:

> Ад таго часу пачаў Ісус паказваць вучням Сваім, што Ён мусіць пайсьці ў Ерусалім і шмат перацярпець ад старшыняў, і першасьвятароў, і кніжнікаў, і быць забітым, і на трэці дзень уваскрэснуць. І, адклікаўшы Яго, Пётар пачаў забараняць Яму, кажучы: «Будзь міласьцівы да Сябе, Госпадзе! Няхай ня будзе гэтага з Табою!» Ён жа, павярнуўшыся, сказаў Пятру: «Адыйдзі ад Мяне, шатан! Ты Мне згаршэньне, бо думаеш не пра тое, што Божае, але пра тое, што чалавечае». (Мацвея 16:21-23).

Ісус абвясціў Сваім вучням, што дзеля паслухмянасці Богу Ён мусіць пайсці ў Ерусалім, пакутаваць, быць забітым і ўваскрэснуць на трэці дзень. Пётр відавочна не пачуў словы Ісуса пра ўваскрасенне, інакш бы ён так не ўсхваляваўся, пачуўшы словы Ісуса пра смерць, што Яго чакала.

Думкі Пятра лёгка ўявіць:

> *Так, пачакай, Настаўнік, Ты ж – Мэсія [гэта было адкрыта Пятру], і Ты адновіш Валадарства і Ізраіль. Я пакінуў бізнес, жонку і сям’ю, каб ісці за Табой. Я страціў сяброў, каб ісці за Табой. Я аддаў на гэта шмат часу. Я маю пэўную рэпутацыю. Начальнікі сінагогі лічаць Цябе за вар’ята, ва ўсіх часопісах і газетах пастаянна выходзяць артыкулы пра супярэчлівасць Тваіх паводзінаў. Усе сацыяльныя сеткі толькі Цябе і абмяркоўваюць, і шмат выказванняў – не на Тваю карысць. Многія вядомыя багасловы і начальнікі лічаць Цябе ерэтыкам. А цяпер Ты кажаш пра смерць. І што будзе са мной? Я прысвяціў столькі часу, каб ісці за Табой, а мне застанецца толькі кепская рэпутацыя.*

Потым Пётр выпаліў: «Не, Госпад, Ты не можаш гэта зрабіць!» (мой парафраз)

Ісусу прыйшлося адразу ж паказаць Пятру: такія думкі былі эгаістычнымі і свецкімі. Ён не глядзеў вачыма Божымі. Шатан («бог веку гэтага», 2 Карынцянам 4:4) вучыць свет шукаць сваіх інтарэсаў. У Валадарстве Нябесным усё наадварот. Таму, каб выканаць Божую волю, нам трэба ісці супраць плыні культуры, нават калі гэта значыць, што нам трэба супрацьстаць «брату ці сястры ў Госпадзе», на разважанні якіх моцна паўплываў свет. Пётр не быў беззаконнікам, але яго разважанні ў гэтай справе прыпадобніліся разважанням свету, а не Хрыста. Ён супрацьстаяў пераменам, сыходзячы са свайго пункту гледжання на тое, як усё мусіць развівацца і адбывацца.

Яшчэ адзін прыклад — ізраільскія выведнікі ў Ханаане. Яны хадзілі па пустыні больш за год. Бог сказаў Майсею выправіць людзей, каб агледзець Абяцаную Зямлю, якую Бог хацеў даць народу. Майсей абраў дванаццаць князёў, па адным з кожнага племя. Сярод іх былі Егошуа і Халеў.

Калі выведнікі вярнуліся, агледзеўшы зямлю, яны па-рознаму апісалі тое, што бачылі, і тое, што неабходна зрабіць. Дзесяць выведнікаў сказала:

> Але народ, які жыве на ёй, дужы, і гарады вельмі вялікія і ўмацаваныя. Бачылі мы там таксама нашчадкаў Анака. Амалекцы жывуць у зямлі Нэгеў; Хеты, Евусэі і Амарэйцы жывуць у гарах, а Хананейцы жывуць каля мора і на беразе Ярдану»… «Ня зможам мы ваяваць з тым народам, бо ён дужэйшы за нас». І гаварылі ліхія весткі пра зямлю, якую аглядалі, паміж сыноў Ізраіля, кажучы: «Зямля, якую мы прайшлі, каб выведаць яе, пажырае жыхароў сваіх, а ўвесь народ, які мы бачылі ў ёй, — высокага росту» (Лікі 13:28-29, 31-32).

Халеў і Егошуа расказалі зусім іншае:

> І Халеў супакойваў [абурэньне] народу супраць Майсея, і казаў: «Пойдзем і здабудзем зямлю, бо мы [можам]

> авалодаць ёю» … «Калі ласкавы будзе ГОСПАД, Ён увядзе нас у зямлю гэтую і дасьць нам зямлю, якая ацякае малаком і мёдам. Не бунтуйцеся супраць ГОСПАДА і ня бойцеся народу той зямлі, бо яны як хлеб для нас. Адыйшла абарона іхняя ад іх, а з намі ГОСПАД. Ня бойцеся іх» (Лікі 13:30; 14:8-9).

Усе дванаццаць разам хадзілі ў Абяцаную Зямлю. Яны бачылі адну і тую ж зямлю, гарады і народы. Чаму ж дзесяць чалавек вярнуліся з адной інфармацыяй, а двое – з супрацьлеглай? Пытанне ў перспектыве!

Бог сказаў, што Халеў і Егошуа мелі іншы дух, бо ўсім сэрцам ішлі за Ім (Лікі 14:24). Гэта значыць, яны выконвалі Божую волю, а не жаданні людзей і глядзелі на тую зямлю вачыма Бога, а не з перспектывы самазахавання. Вось ключ да разумення, чаму дзесяць выведнікаў убачылі ў Ханаане не тое ж самае, што Егошуа і Халеў. Дзесяць чалавек былі больш заклапочаныя сваім камфортам, бяспекай і сем’ямі, чым Божымі жаданнямі. Іх жыццё кіравалася не Валадарствам Божым, а тым, што на іх уплывала. Яны не здолелі пазнаць, што Бог ніколі іх не пакіне і дасць поспех у тым заданні, якое перад імі паставіць. Такое памылковае мысленне было ўласцівае і астатнім ізраільцянам, бо яны сказалі:

> І ўся грамада казала: «Лепш, каб мы памерлі ў Эгіпце, або ў пустыні гэтай. Навошта завёў нас ГОСПАД у зямлю гэтую, каб мы загінулі ад мяча, а жонкі нашыя і дзеці нашыя пайшлі ў палон? Ці ня лепш нам вярнуцца ў Эгіпет?» (Лікі 14:2-3).

Народ Ізраіля азіраўся назад, у «старыя добрыя часы» ў Эгіпце. Тады іх жываты былі поўныя і была стабільнасць. Нягледзячы на тое, што ў Эгіпце яны былі рабамі, цяпер сітуацыя падавалася больш складанай, чым рабства. Ізраільцяне супрацьстаялі неабходным пераменам. Яны знаходзілі супакой у знаёмых умовах пустыні, хаця

іх качэўны лад жыцця і харчаванне былі далёкімі ад ідэальных. Яны так і не ўбачылі Абяцанай Зямлі і не выканалі Божую волю для свайго жыцця.

Егошуа і Халеву, аднак, трэба было *імчаць* далей! Супрацьстаянне з боку іх «братоў» было такім, што тыя хацелі прымусіць іх замаўчаць назаўсёды: «І казала ўся грамада, каб закідаць іх камянямі» (Лікі 14:10). Людзі, якія супрацівіліся Егошуа і Халеву, мелі неадноўлены розум, думалі і бачылі ўсё так, як гэта робіць свет. Яны спыніліся на сваіх шляхах… і засталіся ў мысленні пустыні.

Як Егошуа і Халеў, апостал Павал казаў, што яму трэба забываць мінулае ды *імчаць* да мэты нябеснай узнагароды (Філіпянам 3:14). Давайце яшчэ раз вернемся да Ісаі 43:18-19, дзе мы знаходзім настаўленні, што дакладна натхняць і падтрымаюць нас:

> «Але вы ня ўзгадвайце пра мінулае і пра старадаўняе не разважайце. Вось, Я раблю новае, цяпер яно вырастае. Ці ж вы гэтага ня ведаеце? Вось, Я раблю шлях у пустыні, а рэкі — у стэпе».

На жаль, нават сёння шмат хто з нас хутчэй застанецца ў «бяспецы» рабства, чым памчыць да свабоды, выконваючы Божую волю для свайго жыцця. Мы баімся будучых пераменаў больш, чым сваіх знаёмых, але рабскіх умоваў. Таксама сустракаюцца людзі, задаволеныя тым, што Бог зрабіў у мінулым. Яны не хочуць імчаць да новых выклікаў. Бог зрабіў праз іх вялікія справы, але яны вырашылі пасяліцца на плато мінулых поспехаў.

Паслухмянасць Божай волі дае жыццё і свабоду. Гэта адзіны спосаб рэалізавацца ў жыцці. Але часам сітуацыя выглядае такой складанай, што нам здаецца немагчымым імкнуцца да нябеснай узнагароды. Праз Ісаю Бог сказаў, што зробіць новае, але яно вырасце ў пустыні. Іншымі словамі, калі мы ідзём за Божым Духам, выконваем тое, што Ён хоча, мы апынёмся ў нясцерпнай засушлівай

пустыні. Аднак мы ведаем: немагчымае людзям магчыма Богу (Лукі 18:27). На другім баку пустыні вас чакае жыццё ў дастатку, перамога і задаволенасць.

Не будзьце такім, як дзесяць выведнікаў і ўсе тыя, хто не прыняў Божыя жаданні і супрацьстаў пераменам, што маглі вызваліць іх ад складанасцяў пустыні. Наадварот, з упэўненасцю імкніцеся да Абяцанай Зямлі, дзе знаходзіцца Божая нябесная ўзнагарода!

7

# БОЖАЯ АЎТАМАГІСТРАЛЬ

*Праблемы – гэта не проста інструмент. Гэта найбольш эфектыўны Божы інструмент, які развівае наша духоўнае жыццё. Абставіны і падзеі, якія мы лічым фіяска, часта спрыяюць нашаму інтэнсіўнаму духоўнаму росту. Калі мы пачынаем гэта разумець і прыймаць як духоўны факт жыцця, нам становіцца лягчэй вытрымліваць праблемы і цяжкасці.*

**– Чарльз Стэнлі**

*Голас таго, хто кліча: «У пустыні рыхтуйце шлях ГОСПАДУ, прастуйце ў стэпе сьцежкі Богу нашаму!»*

**– Ісаі 40:3**

Як бы дзіўна ні гучала, пустыня – гэта месца, дзе Бог змясціў аўтамагістраль! Там рыхтуецца Яго шлях, што ўзносіць нас на ўзровень Божага жыцця і Божых думак.

Мала хто ў гісторыі па ім ішоў. Але цяпер Бог рыхтуе многіх прайсці гэтай дарогай. Так запісана ў Ісаі 35:6, 8:

> Тады кульгавы будзе скакаць, як алень, і засьпявае язык нямога, бо пацякуць воды ў пустыні і струмяні ў стэпе… І будзе там гасьцінец і шлях, і назавуць яго шляхам сьвятым, і ня будзе хадзіць па ім нячысты, і будзе ён толькі для іх, і неразумны не заблукае, калі пойдзе шляхам [гэтым].

Божы шлях у пустыні не мае звыклага нумару, напрыклад М-3 або Р-46. Ён проста называецца *святасць.*

Адно з азначэнняў святасці – «стан чысціні». Ісус кажа: «Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць» (Мацвея 5:8). Ісус прыйдзе па царкву без плямы і заганы, а не па нячыстую або несвятую царкву.

Некалькі дзясяткаў год таму, калі я быў маладым чалавекам і толькі пачынаў служэнне, Госпад паказаў падчас малітвы, што збіраецца ачышчаць маё жыццё. Я быў усхваляваны і сказаў Лізе: «Бог будзе ачышчаць мяне», – і расказаў ёй пра ўсё непажаданае, што Бог прыбярэ (яна магла б дадаць яшчэ некалькі момантаў, пра якія я забыўся!).

Потым, на працягу наступных трох месяцаў, нічога не адбывалася. Наадварот, усё толькі ўскладнялася. І я ўсё больш разумеў, што мне трэба ачышчэнне. Я звярнуўся да Госпада і спытаўся: «Чаму мае кепскія звычкі ўзмацняюцца, а не адступаюць?»

«Сын Мой, – адказаў Госпад, – Я сказаў, што *Я* буду ачышчаць цябе. Ты спрабуеш зрабіць гэта сам. Цяпер Я буду рабіць гэта так, як *Я* жадаю». Я не ведаў, што вось-вось увайду ў першую ў маім жыцці пустыню, якая будзе доўжыцца васямнаццаць месяцаў.

## Яго шляхі – не нашы шляхі

На пачатку хрысціянскага жыцця я пазнаёміўся са служэннем Ц. Л. Осбарна, выбітнага служыцеля і аўтара кніг. Ён разам са сваёй жонкай Дэйзі на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў нёс моцнае служэнне эвангелізацыі і цудоўнага ацалення па ўсім свеце. Іх служэнне прывяло да збаўлення дзясяткі мільёнаў чалавек.

Можаце сабе ўявіць, як я быў рады ўбачыць д-ра Осбарна, калі той прыехаў у Далас, каб прапаведаваць у нашай царкве. Я пазнаёміўся з ім асабіста, бо быў адказным за сустрэчу і прыём тых, хто да нас прыязджаў. Ён быў выдатным хрысціянінам, і побач з ім я пачуваўся як быццам у прысутнасці Ісуса.

Ці Эл быў у нашай царкве некалькі разоў, і мы пасябравалі. Ён прывозіў мне кнігі, якія вывучаў падчас падрыхтоўкі да служэння ў маладосці, таксама некалькі разоў перадаваў мне адзенне (мы насілі аднолькавы памер). Тады наш бюджэт не дазваляў набываць шмат вопраткі, і мне вельмі прыдаліся перададзеныя ім рэчы. З часам д-р Осбарн і Дэйзі сталі для нас з Лізай як бацька і маці.

Шмат гадоў раней, калі я працаваў у свецкай кампаніі, падчас служэння, на якім прапаведаваў Ці Эл, Дух Святы прамовіў да мяне: *«Аднойчы ты будзеш служыць яму. Ты будзеш працаваць на д-ра Осбарна».* Я зразумеў гэта так: я стану часткай яго каманды і ў будучыні пачну падобнае эвангелізацыйнае служэнне.

Час ішоў, але нічога не адбывалася. Я ўсё яшчэ быў у пустыні. Галоўны офіс служэння Осбарнаў быў у Талсе, аднак жылі яны ў Арланда. Паступова я стаў адчуваць такі ўнутраны ціск і патрэбу рухацца наперад у служэнні, што вырашыў: мне трэба пераехаць у Арланда, каб быць бліжэй да Осбарнаў. Мае думкі дваіліся. Па-першае, такім чынам Ці Эл зразумее, што я ўжо не працую ў царкве. Ён быў сумленным чалавекам і не стаў бы перапыняць мой кантракт з нашай царквой. Па-другое, калі б мы з Лізай жылі ў Арланда, нам было б лягчэй далучыцца да Осбарнаў у служэнні. Пераехаўшы ў

Флорыду, я быў бы адкрытым на яго прапановы.

Гэта было занадта, я ведаю. Але я вельмі прагнуў «дапамагчы» Богу скіраваць мяне да майго сапраўднага паклікання.

Таму я дамовіўся сустрэцца са сваім пастарам у Даласе, каб паведаміць, што я звальняюся і пераязджаю ў Арланда. Аднак у вечар перад сустрэчай мне пазванілі трое пастароў з трох розных гарадоў. Калі яны даведаліся, што я хачу зрабіць, то задалі аднолькавае пытанне: «Ліза цалкам згодная з тым, што ты робіш?»

Яна не была згодная і некалькі разоў казала мне: «Джон, я пайду разам з табой. Але ў сэрцы я не адчуваю, што ты робіш патрэбнае». Я праігнараваў яе словы і падумаў: *«Ліза проста не разумее! Я – галава сям'і. Ліза мусіць слухацца мяне».* Вох, якія няспелыя, глупыя думкі!

Позна ўвечары ў той дзень мне патэлефанаваў трэці пастар, які задаў тое ж пытанне, што і першыя двое. Унутры мяне штосьці зламалася. Мае ўнутраныя вочы расплюшчыліся. Я зразумеў, што спрабаваў дапамагчы Богу здзейсніць Яго план замест таго, каб проста чакаць Яго дзеяння.

Назаўтра мы з Лізай сустрэліся з нашым пастарам і яго жонкай. Я расказаў, чаму прасіў сустрэцца, і дадаў, што памяняў рашэнне пасля трох званкоў за адзін вечар. Яны паставіліся да нас вельмі прыязна і сказалі, што па-ранейшаму не супраць, каб мы з Лізай засталіся з імі. Мяне не звольнілі.

Цяжар зваліўся з маіх плеч. Я хацеў бачыць, як Бог будзе дзейнічаць у гэтай справе. Я зусім не ведаў, што працэс майго ачышчэння яшчэ не завяршыўся. Мяне чакала яшчэ адна хваля, якая распачалася ў той самы дзень.

Усяго праз шэсць гадзін пасля сустрэчы з пастарам і яго жонкай я пераапрануўся ў спартовае адзенне, каб пагуляць у баскетбол з калегамі з царквы. Зазваніў тэлефон. Гэта быў Ці Эл Осбарн! Сказаць, што я быў шакаваны – гэта не сказаць нічога!

На працягу размовы, якая доўжылася паўтары гадзіны, ён

прапанаваў мне і Лізе пасады ў яго служэнні. Нам трэба было дапамагаць яму і Дэйзі і падарожнічаць з імі па ўсім свеце. Таксама ён прапанаваў заснаваць у Талсе царкву, што ў далейшым стане прататыпам для іншых цэркваў, якія будуць адчынены ў розных краінах свету, дзе Осбарны будуць праводзіць масавыя эвангелізацыі.

Падчас доўгай тэлефоннай размовы я зноў і зноў думаў: *«Ойча, я ведаў, што Ты будзеш дзейнічаць, але я не чакаў, што гэта адбудзецца настолькі хутка!»* Цяжка перадаць здзіўленне і хваляванне, якія я перажываў, размаўляючы з Ці Элам. Я быў упэўнены: вось ён, выхад з пустыні, якога я так чакаў! Я так радаваўся, што ледзь не скокаў ад радасці! Паклаўшы слухаўку, я выйшаў на вуліцу, каб падзякаваць Богу, але ў духу адчуў ваганне. Дзесьці ўнутры было няўтульнае, згрызотнае пачуццё.

Я думаў: *«Не, Божа, толькі не гэта! Ты не можаш так зрабіць. Ты абяцаў мне вельмі даўно, што я буду працаваць на Ці Эла Осбарна! Ты не можаш зараз усё адмяніць!»*

Ваганне не сыходзіла. Тры дні я з усіх сіл змагаўся і спрабаваў пазбавіцца няўтульнага пачуцця. «Бог, дай мне радасць у гэтым!» – крычаў я. Ліза таксама адчувала няўтульнасць і ваганні, хоць вельмі хацела працаваць з Осбарнамі.

Урэшце я вырашыў не давяраць унутранаму голасу, які падказваў, што мае ваганні былі ад Бога (яшчэ адно няспелае і нават небяспечнае рашэнне). Мы з Лізай паляцелі на сумоўе ў Аклахому. Здавалася, усё атрымліваецца і зыходзіцца. Ці Эл і Дэйзі афіцыйна прапанавалі нам пасады, а потым на вячэры, напярэдадні Раства, прадставілі нас сваёй камандзе.

Мы вярнуліся ў Далас. Я звольніўся з царквы. Аднак ваганні не сыходзілі. Я маліўся гадзінамі, але неспакой унутры заставаўся. Я спрабаваў маліцца яшчэ даўжэй. Неспакой заставаўся. Нічога не мянялася.

Урэшце я сказаў Лізе: «Не ведаю, што адбываецца. Нешта не так». Яна пагадзілася: «Мне таксама так здаецца».

Я пазваніў Ці Элу і расказаў яму пра наш з Лізай стан. Ён адказаў:

## Парады па выжыванні ў пустыні

### # 7. Абачліва выбірайце сяброў

Магчыма, вас не здзівіць: часта нашымі самымі суровымі крытыкамі і апанентамі становяцца тыя, што гуляюць на нашым баку! Пераслед часта ідзе ад тых, каго мы лічым сябрамі.

У пустыні могуць быць ганенні, таму трэба разумець: на шляху за Хрыстом нас чакае пераслед. Апостал Павал кажа: «Дый усе, якія хочуць жыць пабожна ў Хрысьце Ісусе, перасьледаваны будуць» (2 Цімафею 3:12). Пераслед – гэта частка працэсу ачышчэння. А хто можа пераследаваць? Напрыклад, падманшчыкі: тыя, хто далучаецца да народа Божага, робячы выгляд вернікаў, хоць у сэрцы яны не любяць Бога. Вось чаму Павал кажа пра егіпецкіх чараўнікоў Яннэса і Ямбрэса, якія супрацьстаялі Майсею. Гэтыя людзі былі ў царкве Божай, яны не былі чужынцамі.

«Ведаеце, давайце сустрэнемся і паразмаўляем». Мы паляцелі ў Талсу, і пасля двухгадзіннай сустрэчы Ці Эл сказаў: «Мы прапанавалі вам пасады, таму што любім вас і ведаем, што вы любіце нас. Аднак, як нам здаецца зараз, гэта было не ад Бога».

«Я таксама нічога не разумею, – сказаў я, – але думаю, што гэта так». Я не мог паверыць, што кажу гэта. Мне нібы абрэзалі крылы. Усё жыццё я марыў працаваць з Ці Элам Осбарнам.

У тыя гады я звычайна падымаўся вельмі рана і выходзіў, каб памаліцца паўтары-дзве гадзіны на вуліцы. Але пасля такога расчаравання ў маім герою, д-ру Осбарне, я амаль не маліўся, выходзячы зранку на вуліцу. Падавалася, я мог толькі плакаць. У

Апостал Павал апісвае пераслед і небяспекі, з якімі ён сутыкаўся, і кажа, што некаторыя з бедаў у яго жыцці былі ад «фальшывых братоў» (2 Карынцянам 11:26).

У пустыні добра мець побач людзей, якія вас любяць, пра вас клапоцяцца і адкрываюць Божую волю ў вашым жыцці. Вам не патрэбны крытыкі і тыя, хто натхняе вас не слухацца Бога, як рабілі жонка і сябры Ёва. І вам не патрэбныя лжэпракрокі, якія ліслівяць тады, калі вам патрэбнае Божае выпраўленне. Вы патрабуеце тых, хто любіць вас і падзеліцца з вамі Божай мудрасцю.

Але будзьце ўважлівыя: калі нехта вас крытыкуе і кажа, што вы самі і ёсць прычына вашай пустыні, хутчэй за ўсё гэты чалавек не з'яўляецца вашым сапраўдным сябрам. Дух Святы кажа пра грэх, і часта Ён выкарыстоўвае людзей, каб дапамагчы нам убачыць памылкі і пакаяцца. Але пастаянныя абвінавальнікі, якія не прапануюць ніякай надзеі, - гэта наш вораг. Будзьце асцярожныя!

збянтэжанасці я згадваў усё, што адбылося на працягу апошніх месяцаў. Мой смутак было цяжка апісаць. Я пачуваўся, нібы быў у жалобе па памерлым блізкім чалавеку. Праз два тыдні я пайшоў у месца, дзе мяне ніхто не мог пачуць, і з усяе сілы крычаў да Бога: «*Чаму?!* Чаму Ты захацеў, каб я адмовіўся ад гэтага? Шэсць год таму Ты прамовіў да мяне і сказаў, што я буду працаваць з ім. *Чаму?»*

Я ніколі не забуду, што Госпад сказаў мне: «Бо я хацеў убачыць, каму ты служыш: Мне ці мары».

Я знерухомеў.

Потым Ён сказаў: «Вось чаму Я сказаў Абрагаму прынесці Ісаака ў ахвяру: Я хацеў убачыць, ці любіць ён абяцанае дабраславенне, што

Я даў яму, *больш* за Мяне. Гэта паказала б, каму ён служыць: сваёй мары або Мне, дзеля дасягнення мары, або проста Мне, давяраючы Мне ў здзяйсненні гэтай мары».

Здавалася, гэта быў адказ на ўсе пытанні, якія не давалі мне супакою апошнія два тыдні. І ўпершыню за апошнія паўтара года я адчуў выбух радасці ў духу. Як быццам маё жыццё вярнулася да мяне і я зразумеў, колькі дабраславенняў я меў. Я ўсвядоміў, што ў мяне была цудоўная жонка і выдатнае дзіця. Я зноў закахаўся ў сваю жонку і нанова палюбіў сына. Я прыгадаў, што мы жывём у новай кватэры ўсяго за трыццаць крокаў ад прыгожага басейна. І надвор'е амаль кожны дзень цудоўнае. Я перастаў усё гэта заўважаць, бо мяне паглынулі клопаты служэння, якімі я лічыў неабходным займацца, каб дагадзіць Богу.

Азіраючыся назад, я зразумеў: Бог казаў, што я буду працаваць з Ц.Л. Осбарнам, і ў мяне ўжо быў гэты прывілей: я служыў яму, калі той наведваў нашую царкву ў Даласе.

Цяпер у мяне не было працы. Я скорана вярнуўся ў сваю царкву, каб даведацца, ці можна вярнуцца на маю пасаду. Памятаю, як я глядзеў на сябра, аднаго з малодшых пастароў, і казаў: «Я адчуваю сябе такім маленькім, што, здаецца, змясціўся б у шчыліну пад дзвярыма». Дакладна памятаю гэтыя словы. Я ўжо расказаў усім, што буду працаваць з Ці Элам і Дэйзі. Наш пастар нават аб'явіў гэта са сцэны, але сказанаму не было наканавана здзейсніцца.

У царкве да мяне паставіліся з разуменнем і далі мне працу на няпоўную занятасць. Я працаваў там яшчэ восем месяцаў. Потым надышоў наступны этап майго паклікання – тое, што падрыхтаваў для мяне Бог. Мяне запрасілі далучыцца да каманды адной з цэркваў, якая на той момант найбольш дынамічна расла. Я мусіў стаць там моладзевым пастарам. Гэта адбылося цудоўным чынам. Мы з Лізай ведалі, што Бог адчыніў гэтыя дзверы. Цяпер я меў новае жыццё і новае бачанне, бо быў падрыхтаванымі мяхамі для новай пасады, якія будуць утрымліваць новае віно.

## Шлях ачышчэння

Шмат стагоддзяў пасля таго, як Ісус пакінуў зямлю, Яго вучні спрабавалі дасягнуць святасці сваімі сіламі. Фактычна, у марных спробах быць чыстымі нараджаліся цэлыя дэнамінацыі. Але ўсё, што мы змаглі, - гэта стаць рабамі законніцтва, бо святасць – Божая справа, а не знешняе абмежаванне цела.

Бог дае ласку пакорлівым, а не пыхлівым. Пыхлівы чалавек лічыць, што святасці можна дасягнуць без Божай дапамогі, проста трымаючыся пісьмовых інструкцый, правіл і настаўленняў. Упакораны чалавек ведае, што гэта марна, і разлічвае на ласку і сілу Госпада. Блізкія адносіны з Госпадам чыстыя, бо толькі праз такія адносіны можна атрымаць сілу выконваць законы, запісаныя ў сэрцы.

Многія з нас спрабавалі дасягнуць святасці, слухаючыся літары Новага Запавету або перакананняў, якіх няма ў Пісанні, і пацярпелі жахлівую няўдачу. Габрэі беспаспяхова спрабавалі атрымаць збаўленне, трымаючыся літары закона, гэтаксама і мы нянздольныя хадзіць у святасці, выконваючы гэтыя правілы. Многія абмяжоўвалі сябе законніцкімі ідэямі адносна пэўных паводзінаў або відаў дзейнасці. Усе гэтыя знешнія абмежаванні – спроба атрымаць унутраную чысціню.

Аднак Бог не шукае выключна знешняй чысціні; Ён хоча ўнутраных пераменаў вашага сэрца, бо чыстае сэрца прывядзе да чыстых паводзінаў. У Мацвея 23:26 Ісус сказаў: «Ачысьці перш знутры келіх і місу [сэрца], каб і звонку сталіся чыстымі».

Калі ваша сэрца чыстае, вы не захочаце, каб вашы ўчынкі знеслаўлялі Ісуса. Вы не будзеце заходзіць на парнаграфічныя сайты і не будзеце насіць правакуючае адзенне. Людзі могуць хваліцца, што не разваліся, і хаваць у сэрцы пажадлівасць адносна кагосьці на працы або час ад часу наведваць парнаграфічныя сайты. Хіба гэта святасць?

Калі ваша сэрца чыстае, то камп’ютар або смартфон не прымусяць вас шукаць неналежныя сайты. Сама тэхналогія не робіць нас

нячыстымі. Да гэтага прыводзіць тое, што ў нашым сэрцы. Калі ваша сэрца чыстае, вы будзеце жадаць толькі таго, чаго жадае Бог.

Пустыня – гэта адна з плавільных печаў, якія Бог выкарыстоўвае, каб ачысціць нашы матывы і намеры. Бог заняты падрыхтоўкай нашых сэрцаў перад тым, як прыйдзе па Сваю царкву. Бог гадуе пакаленне людзей, што праявяць *Яго* славу, а не сваю, узрошчвае людзей, якія створаны на Яго вобраз і маюць Яго характар:

> А ў вялікім доме ёсьць посуд ня толькі залаты і срэбны, але і драўляны, і гліняны; і адзін — у пашане, а другі — у ганьбе. Дык калі хто ачысьціць сябе ад гэтага, той будзе пасудзінаю ў пашане, асьвячонаю і патрэбнаю Уладару, падрыхтаванаю на ўсякую добрую справу. (2 Цімафею 2:20-21)

Звярніце ўвагу, што ёсць два віды посуду: у пашане і ў ганьбе. Грэцкае слова «ганьба» *(atimia)* значыць «ганьба, нікчэмнасць, дакор, бясслаўе». Грэцкае слова «пашана» *(time)* значыць «каштоўны». Бог кажа: «І калі ты здабудзеш каштоўнае з нікчэмнага, ты будзеш як вусны Мае» (Ярэміі 15:19). Каштоўнае здабываецца з нікчэмнага праз руплівае ачышчэнне або вызваленне ад нячыстага.

Малахія – старазапаветны прарок, які шмат прарочыў пра часы Новага Запавету. Але праблема ў тым, што ў яго не было новазапаветнай тэрміналогіі. Таму ён карыстаўся такімі тэрмінамі, як «лявіты» і «святары», каб апісаць, што бачыў і чуў ад Духа Святога пра хрысціян Новага Запавету.

Малахія сказаў: Госпад прыйдзе *ў* Сваю святыню (Сваю царкву) да таго, як прыйдзе *па* Сваю святыню. Мэта гэтага – ачышчэнне. Ён піша:

> І Ён сядзе, каб растапіць і ачысьціць срэбра, і Ён ачысьціць сыноў Левія, іператопіць іх як золата і срэбра, і яны будуць для ГОСПАДА прыносіць дары ў праведнасьці (Малахіі 3:3).

Лявіты, сыны Левія – гэта прадвеснікі «валадарнага святарства» (1 Пят. 2:9), вучняў Хрыста ў царкве. Бог параўноўвае ачышчэнне святарства з працэсам ачышчэння золата і срэбра, і таму карысна разумець уласцівасці золата і срэбра, а таксама тое, як яны ачышчаюцца. Я буду казаць пра золата, бо працэс ачышчэння гэтых металаў падобны.

Золата мае прыгожы жоўты колер і мяккі металічны бляск. Яно распаўсюджана ў прыродзе ў маленькіх колькасцях і рэдка сустракаецца ў чыстым выглядзе, без дамешкаў. Ачышчанае золата мяккае, гнуткае, не мае дамешкаў іншых рэчываў і не паддаецца карозіі. Калі золата змяшаць з іншымі металамі (меддзю, жалезам або нікелем), яно становіцца цвярдзейшым, не такім гнуткім і больш падлягае карозіі. Такая сумесь называецца сплавам. Чым большая колькасць іншых металаў, тым цвярдзейшае золата. І наадварот: калі дамешкаў менш, золата мякчэйшае і больш гнуткае.

Мы адразу ж бачым паралель: сэрца, чыстае перад Богам, падобнае на чыстае золата. Чыстае сэрца мяккае, гнуткае і паддаецца фармаванню. Таму Дух Святы гаворыць:

> Дзеля гэтага, як кажа Дух Сьвяты: «Сёньня, калі пачуеце голас Ягоны, не закамяняйце сэрцы вашыя, як у раздражненьні, у дзень спакусы ў пустыні,.. Дык прысягнуў Я ў гневе Маім, што ня ўвойдуць яны ў супачынак Мой» (Гебраям 3:7-8, 13).

Грэх – гэта дамешак, які пераўтварае наша *чыстае* золата ў сплаў, робіць нашыя сэрцы цвярдзейшымі. Калі сэрцу бракуе мяккасці, страчваецца чуллівасць, таму мы не здольныя чуць голас Госпада.

На жаль, у такім стане зараз вельмі шмат людзей. Яны выглядаюць пабожна, але ў іх няма мяккага сэрца, якое гарыць для Ісуса. Трывалая любоў да сябе заняла месца любові да Бога, таму яны шукаюць толькі ўласнай прыемнасці, камфорту і карысці. Мяркуючы, што пабожнасць – гэта сродак асабістага прыбытку (1 Цімафею 6:5), яны шукаюць толькі абяцаных выгодаў і па няведанні або дзеля зручнасці

выключаюць са свайго жыцця Таго, Хто абяцаў. Падманутыя, яны атрымліваюць асалоду ад рэчаў гэтага свету, чакаючы атрымаць таксама і нябёсы! Але Бог жадае не гэтага:

> Чыстая і беззаганная пабожнасьць перад Богам і Айцом ёсьць у тым, каб адведваць сіротаў і ўдоваў у горы іхнім і захоўваць сябе неапаганеным ад сьвету (Якуба 1:27).

Ісус прыйдзе па святую царкву, без заганы або нячыстасці (Эфэсцам 5:27), па людзей, чые сэрцы не апаганеныя шляхамі свету.

Яшчэ адна ўласцівасць золата – яго здольнасць супрацьстаяць іржы або карозіі. Хоць іншыя металы псуюцца ад атмасферных умоваў, на чыстае золата гэтыя ўмовы так не ўплываюць. Латунь (жоўты сплаў медзі і цынку) нагадвае золата па знешнім выглядзе, але мае іншыя ўласцівасці. Латунь лёгка цямнее. Яна мае выгляд золата, але пазбаўлена яго ўласцівасцяў. У нашай царкве ёсць латунны посуд: ён выглядае, як золата, але не з’яўляецца залатым. Толькі агонь, які ачышчае, пакажа розніцу паміж гэтымі двума металамі. Малахія кажа пра стан пасля ачышчэння:

> «І вы навернецеся, і ўбачыце розьніцу паміж праведнікам і бязбожнікам, паміж тым, хто служыць Богу, і тым, хто ня служыць Яму» (Малахія 3:18).

Вернемся да абмеркавання, як ачышчаецца золата. Высокае ўтрыманне дамешкаў робіць золата не толькі цвярдзейшым, але і больш уразлівым да карозіі і псавання. Атмасфера свету, у якім мы жывём, уплывае на яго мацней.

У наш час свецкія каштоўнасці прасачыліся ў царкву. Да нас прыйшла культура свету, і праз гэта мы апаганіліся. У Амерыцы ўплыў свету апаганіў каштоўнасці царквы. Многія страцілі чуллівасць і не ўсведамляюць патрэбы ў ачышчэнні.

Малахія 3:3 паказвае, як ачышчаецца золата і як Ісус будзе ачышчаць Сваю царкву ад уплыву свету. У працэсе ачышчэння золата мелюць у парашок і змешваюць з рэчывам, якое называецца флюс. Парашок і флюс змяшчаюць у печ і моцна награюць. Сплавы або дамешкі прыцягваюцца да флюса і падымаюцца на паверхню. Золата цяжэйшае, таму яно застаецца на дне. Пасля гэтага нячыстасці або дамешкі (медзь, жалеза і цынк разам з флюсам) прыбіраюць.

Цяпер давайце прыгледзімся да таго, як Бог дзейнічае ў ачышчэнні:

> І павярну руку Маю на цябе, і лугам ачышчу руду тваю, і прыбяру ўсё волава тваё. І ўзнаўлю судзьдзяў тваіх, як былі раней, і раднікаў тваіх — як было на пачатку. Тады назавуць цябе Горадам Праведнасьці, Цьвярдыняй вернай (Ісая 1:25-26).

Які агонь Бог выкарыстоўвае, каб нас ачысціць? Адказ у наступным урыўку:

> З гэтага радуйцеся, крыху цяпер, калі трэба, ад розных спакусаў пасмуткаваўшы, каб выпрабаваньне веры вашае, якая шмат каштоўнейшая за золата, што гіне, хоць і агнём выпрабоўваецца, было знойдзена на хвалу, і пашану, і славу ў адкрыцьці Ісуса Хрыста (1 Пятра 1:6-7).

Божы агонь ачышчэння – гэта *выпрабаванні* і *пакуты*, якія, вядома, з’яўляюцца цэнтральнай тэмай пустыні. Іх гарачыня аддзяляе нашую нячыстасць ад Божага характару ў нашым жыцці. Гэта мае патэнцыял прывесці да святасці (неўзабаве я патлумачу, чаму кажу «мае патэнцыял»).

Яшчэ адна ўласцівасць золата ў чыстым стане – гэта празрыстасць (праз яго можна бачыць, як праз шкло). «І дванаццаць брамаў — з дванаццаці пэрлінаў, кожная брама — з аднае пэрліны. І вуліца гораду — з чыстага золата, празрыстага, як шкло» (Адкрыццё 21:21).

Калі вы ачышчаныя праз вогненныя выпрабаванні, вы становіцеся празрыстымі! Празрыстае начынне прыносіць славу не сабе, але таму, што ўтрымлівае. Само ж начынне ненавязлівае і амаль незаўважнае.

Калі мы ачышчаемся, свет можа зноў бачыць Ісуса. Калі мы празрыстыя – кажам праўду, не пыхлівыя, трымаем слова, маем унутраную цэласнасць, нічога не хаваем – людзі ў свеце гэта заўважаць.

У Ісаі гэта выходзіць на наступны ўзровень:

> Вось, Яператапіў цябе, але не як срэбра, Я выспрабаваў цябе ў печы нядолі. Дзеля Сябе, дзеля Сябе Самога Я раблю [гэта], каб не было зьняважана [імя Маё]. І славы Маёй Я не аддам другому (Ісая 48:10-11).

Агонь або печ – гэта пакуты, не літаральны фізічны агонь, у якім ачышчаецца срэбра або золата, гэта тлумачыць выраз «не як срэбра». Нашы выпрабаванні – гэта распаленая печ, якая аддзяляе каштоўнае ад нікчэмнага.

Бог не робіць так супраць нашай волі. Вось чаму Павал кажа ў 2 Цімафею 2:21, што чалавек, які хоча быць ачышчаным, «ачысьціць сябе». Калі вы хочаце шукаць апраўданняў і дазваляць грахам і недахопам стрымліваць вас, Бог не прымусіць вас адпусціць іх. Працэс пакутаў будзе бессэнсоўным (вось чаму раней я напісаў «мае патэнцыял»). На шляху святасці ачышчэнне — пастаянны і часта балючы працэс. Але, ведаючы плён, я з радасцю яго вітаю.

Аўтар Паслання да Гебраяў сцвярджае: «Імкніцеся да супакою з усімі і да сьвятасьці, без якое ніхто ня ўбачыць Госпада» (12:14). Ісус кажа: «Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць» (Мацвея 5:8). Давід, якога Бог называў мужам паводле Свайго сэрца, плакаў: «Хто зразумее памылкі свае? Ад схаваных [грахоў] вызвалі мяне!» (Псалом 19 (18):13).

Няхай такім будзе наш крык да Бога. Калі мы просім Бога ачысціць нашыя сэрцы, Ён прыбярэ нячыстасць, схаваную ад нашых вачэй. Бог ведае нашыя глыбінныя думкі і намеры, хоць мы самі не ведаем іх.

Я заклікаю вас навучыцца бачыць і вітаць духоўную пару і час пустыні. Калі прыходзяць вогненныя выпрабаванні, шукайце іх мэту. Перастаньце злавацца на іншых і вінаваціць іх. Правярайце сваё сэрца і дазвольце Богу аддзяліць каштоўнае ад нікчэмнага. Ён загадвае: «Будзьце сьвятыя, бо Я – сьвяты» (1 Пятра 1:16).

Памятайце: ачышчэнне ўмацоўвае добрае і прыбірае тое, што слабое ці бруднае. Вітайце Яго ачышчэнне, каб вы былі пасудзінаю ў пашане, здольнай прыгожа і празрыста паказваць Яго славу.

# 8

# БУДУЙЦЕ ДОБРА

*Самыя яркія зоркі ззяюць у палярным небе. Самая салодкая вада – у крыніцы сярод пяскоў пустыні. Самая каштоўная вера – тая, што жыве і трыумфуе ў складанасцях і супрацьстаяннях. Выпрабаваная вера прыносіць досвед. Вы ніколі не паверылі б у сваю слабасць, калі б вам не давялося прайсці выпрабаванні. І вы ніколі б не зведалі Божую сілу, калі б не мелі ў ёй патрэбу, каб прайсці праз выпрабаванні.*

**– Чарльз Спэрджэн**

*Бо тыя, што паводле цела, — пра цялеснае думаюць; а тыя, што паводле духа, — пра духоўнае.*

**– Рымлянам 8:5**

Мужчын і жанчын Божых вызначае характар, а не памазанне. Ачышчэнне, неабходнае для фармавання характару, адбываецца менавіта ў пустыні — у тым месцы, дзе ўзмацняецца ціск, накопліваецца расчараванне, а мары здаюцца недасягальнымі.

Я прыгадваю час у пустыні, калі я змагаўся, каб пераадолець моцны гнеў. Я дзяліўся гэтым у першым раздзеле. Тады я запытаўся ў Бога: «Чаму я так на ўсіх гневаўся? Што мне трэба звязаць або выгнаць з жыцця?»

Ён адказаў: «Сын Мой, ты не можаш звязаць або выгнаць з жыцця сваё цела. Ты ўкрыжоўваеш яго».

Я быў збянтэжаны і яшчэ болей засмучаны, таму і запытаўся: «Добра, адкуль жа прыходзіць гэты гнеў? Я ніколі яго раней не перажываў, нават калі не быў збаўлены!»

«Ён жыў у табе шмат год, — адказаў Гаспад, — але заставаўся нябачным, як дамешкі ў тваім залатым пярсцёнку: пакуль яго не расплавіш, іх немагчыма заўважыць. Калі ж расплавіць яго ў вогненнай печы, дамешкі падымуцца на паверхню. Цяпер Я зрабіў твой гнеў бачным для цябе, бо прывёў цябе ў печ пакутаў».

Я не да канца разумеў тое, што адкрыў мне Бог. Ён дадаў: «Ты можаш вінаваціць жонку, калег, сяброў, сваё нованароджанае дзіця або іншыя абставіны. Калі ты будзеш так рабіць, гнеў застанецца ў

табе, і калі жар вогненнай печы адступіць, гнеў не знікне. Таму ўвесь працэс трэба будзе пачаць зноў. Ты можаш пакаяцца, папрасіць Майго прабачэння і папрасіць Мяне забраць гнеў з твайго сэрца. Калі ты выбярэш гэты варыянт, Я змагу ачысціць цябе ад гневу».

Я зрабіў менавіта так. Калі складанасці вогненнай пустыні выкрывалі мой гнеў, я вызнаваў гэты грэх, каяўся і прасіў Бога прыбраць гнеў з майго сэрца.

Вось чаму пустыня, якой бы складанай яна ні была, настолькі каштоўная і ўрэшце вядзе да вялікай радасці:

> З гэтага радуйцеся, крыху цяпер, калі трэба, ад розных спакусаў пасмуткаваўшы, каб выпрабаваньне веры вашае, якая шмат каштоўнейшая за золата, што гіне, хоць і агнём выпрабоўваецца, было знойдзена на хвалу, і пашану, і славу ў адкрыцьцi Ісуса Хрыста (1 Пятра 1:6-7).

Пустыня – гэта месца, дзе мы ачышчаемся, дзе ў нас фармуецца характар. Менавіта ў печы пакутаў і ганенняў фармуецца сапраўды пабожны чалавек. У Рымлянам 5:3-4 напісана: «І ня толькі [гэтым], але хвалімся і ў прыгнётах, ведаючы, што прыгнёт робіць цярплівасьць, а цярплівасьць — выпрабаванасьць, а выпрабаванасьць — надзею».

Бог ухваліў жыццё Давіда, бо той быў чалавекам, які шукаў не царства, а Божае сэрца! Цар Саўл ніколі не праходзіў пустыню ачышчэння, таму ён не быў ачышчаны, не меў супакою. А Давід, наадварот, прайшоў ачышчэнне ў пустыні. Бог нават выкарыстаў Саўла, каб адправіць туды Давіда!

Божыя шляхі могуць быць таямнічымі, але Яго намеры заўсёды добрыя!

## Адкладзеная мара?

Аднак ачышчэнне можа быць балючым. Не буду вас падманваць: пустыня – гэта не паездка ў Дыснэйлэнд. Пакуты – гэта пакуты, і

часам бываюць вельмі балючымі.

Магчыма, Бог даў вам мары і бачанне таго, што Ён паклікаў вас зрабіць. Ён мог казаць вам пра Свае задумы і намеры для вас. Але ў пустыні часта здаецца: чым болей вы шукаеце Госпада і слухаецеся Яго Слова, тым далей вы аказваецеся ад мары, якую Ён уклаў у ваша сэрца.

Прыгадайце Язэпа: ён марыў, што будзе кіраўніком. Нават браты і бацькі мусілі схіліцца перад яго ўладай. Што адбылося далей? Язэпа кінулі ў яму тыя, хто мусіў яго абараняць, яго старэйшыя браты. Неўзабаве яны ж прадалі яго ў рабства ў чужую зямлю. Вы можаце ўявіць яго шок, расчараванне і боль?

Язэп дакладна ўяўляў, што Бог цудоўным чынам умяшаецца ў сітуацыю і хутка яго выратуе. Гэтая надзея неўзабаве згасла, бо рабства доўжылася не некалькі месяцаў ці год, але расцягнулася больш чым на дзесяцігоддзе! Такі доўгі час! І пры гэтым Язэп ведаў: яго крыўдзіцелі жывуць на свабодзе і карыстаюцца багаццем заможнага бацькі.

Што ж зрабіў Язэп? Як ён рэагаваў у час сваёй пустыні? Ён захоўваў веру, працаваў і не забываў Божых абяцанняў. Ён быў верным, мудрым, стараннымі на выніку атрымаў дабраславенне і поспех.

Але сітуацыя ў хуткім часе зноў раптоўна памянялася і значна пагоршылася. Жонка гаспадара заглядалася на Язэпа. Яна імкнулася спакусіць Язэпа і зрабіць чужаложнікам. І не аднойчы, а шмат разоў. Але нават у такой сітуацыі Язэп заставаўся паслухмяным Богу і заўсёды ўцякаў ад сэксуальнай разбэшчанасці. Урэшце гэтая жанчына стала такой настойлівай, што Язэпу давялося літаральна вырывацца з яе рук. Цяпер яна пачувалася абражанай і абвінаваціла яго ў тым, што ён адмаўляўся рабіць увесь гэты час – у гвалце. Яго несправядліва «асудзілі» і кінулі ў вязніцу (як правіла, раб-чужынец, які спрабаваў згвалціць жонку кагосьці з прыдворных фараона, ужо ніколі не выходзіў на свабоду).

У турме чалавек мае шмат часу, каб разважаць. Вы можаце

сабе ўявіць, з якімі думкамі даводзілася змагацца Язэпу? *«Я верна служыў Богу ўсё сваё жыццё, і што ж мне гэта дало? Выходзіць, я гнію ў гэтай вязніцы, хоць нічога кепскага і не зрабіў. Маё жыццё скончанае! Мае злыя браты – на свабодзе. Яны цешацца дабрабытам і багаццем. Што я зрабіў не так? Я проста падзяліўся з братамі марай, якую, здаецца, мне даў Бог. І вось што выйшла! Што ж добрага ў тым, што я служыў Богу? Здаецца, чым больш Яго слухаюся, тым горшым становіцца маё жыццё!»*

Хто б наважыўся абвінаваціць Язэпа ў такіх думках? Здаецца, усё гучыць дастаткова лагічна, так?

І вось аднойчы ў вязніцы прыходзіць час найбольшага выпрабавання для Язэпа. Бог прывёў да яго двух вязняў – чашніка і пекара. Кожны з іх меў сон, які прынёс збянтэжанасць і разгубленасць. Чашнік і пекар не разумелі, што значаць іх сны. Калі б Язэп згубіў веру ў Бога і ў Яго абяцанні, было б лёгка засяродзіцца толькі на сабе і даць выхад пачуццям. Ён мог бы сказаць: «Вы ўчора бачылі сон? Ха! Аднойчы мне таксама прысніўся сон. Я таксама думаў, што сон быў ад Бога. Але праўда такая: сны не здзяйсняюцца. Сны бессэнсоўныя і глупыя. Таму пакіньце мяне, калі ласка, у спакоі».

Калі б Язэп зрабіў так, ён бы застаўся ў пустыні яшчэ на шмат гадоў. Магчыма, да канца жыцця. Ён страціў бы квіток на свабоду (чашнік пазней сказаў фараону пра здольнасць Язэпа тлумачыць сны, і гэта паспрыяла таму, што Язэпа вызвалілі з турмы і павысілі). Калі б Язэп шкадаваў сябе, ён урэшце памер бы ў вязніцы пакрыўджаным цынікам без надзеі, паўтараючы ў розныя спосабы: «Бог не трымае Сваіх абяцанняў, Ён – не верны Бог!»

Але Язэп не зрабіў так. Ён супрацьстаў думкам і логіцы, што пярэчылі яго асабістаму абяцанню ад Бога, і вырашыў паслужыць чашніку і пекару. Ён трываў у паслухмянасці Богу. І які вынік? Урэшце Язэпа вызвалілі і прызначылі другім чалавекам у Эгіпце!

Пасля павышэння Язэпа мінула дзевяць гадоў, і страшны голад прымусіў яго братоў прыйсці ў Эгіпет. Там яны, самі таго не ведаючы,

апынуліся перад Язэпам. Цяпер ён меў характар сапраўднага кіраўніка дзяржавы. Ён рабіў дабро тым, хто кепска з ім абышоўся, і быў не пакрыўджаным, а напоўненым верай, любоўю і прабачэннем да тых, хто некалі яму здрадзіў. Псальміст піша пра Язэпа:

> …і паслаў [Бог] перад абліччам іхнім чалавека, які быў прададзены як нявольнік, Язэпа. Зашчамілі ў кайданы ногі ягоныя, жалезам сьціснулі душу ягоную аж да часу, калі выйшла справа ягоная, слова ГОСПАДА ачысьціла яго (Псалом 105 (104):17-19).

Толькі Бог ведаў вызначаны час, калі здзейсніцца Яго абяцанне Язэпу (больш як праз дваццаць гадоў пасля сну). Пустыня загартавала характар Язэпа, і гэта дапаможа яму збудаваць жыццё, сям'ю і працаваць на пасадзе кіраўніка. Ключом да поспеху Язэпа стала пашана і страх Божы. Незалежна ад умоваў, Язэп прамаўляў Слова Божае, дзейнічаў паводле яго і выконваў яго.

А што наконт вас? Я казаў раней, што Бог мог паказаць вам мары і бачанне таго, да чаго вас паклікаў. Ён мог прамовіць пра планы, якія мае для вас. Але як і ў выпадку Язэпа, вы ў пустыні і, здаецца, чым больш вы шукаеце Госпада і слухаецеся Яго Слова, тым далей ад вас мара, якую Ён уклаў у ваша сэрца.

Магчыма, вы бачылі іншых, нават тых, хто супраць вас, але расце ў служэнні (ці ў іншай сферы жыцця), а вы, падобна, ідзяце ў напрамку, адваротным дадзенай вам Богам мары. Вы робіце ўсё магчымае, але ваша бачанне не становіцца рэальнасцю.

Магчыма, вакол вас ёсць іншыя людзі, цялесныя, якія не шукаюць Госпада, але яны атрымліваюць павышэнні і багацце. Яны маюць фінансавыя і сацыяльныя «дабраславенні». Магчыма, вакол вас людзі, якія ідуць наперад праз ліслівасць і маніпуляцыі. Людзі, якія робяць усё несумленна, дасягаюць поспеху праз хлусню і махлярства, але яны «дабраславёныя», а вы – як Язэп, сядзіце ў ланцугах у вязніцы.

Што вы робіце ў такой сітуацыі? Скардзіцеся і наракаеце? Глядзіце, што кажа пра гэта Бог:

> Прыкрыя былі супраць Мяне словы вашыя, кажа ГОСПАД. А вы кажаце: «Што мы гаварылі супраць Цябе?» Вы казалі: «Марнае служэньне Богу, і якая карысьць, што мы захоўвалі загады Ягоныя і што хадзілі ў жалобе перад абліччам ГОСПАДА Магуцьцяў? І цяпер мы шчасьлівымі называем свавольных. Уладкаваліся нават тыя, якія робяць нягоднасьць, нават тыя, якія выпрабоўваюць Бога, уцякаюць [ад кары]» (Малахія 3:13-15).

Што кажуць тыя, хто наракае? Яны кажуць: «Якая карысць у тым, што мы слухаліся Бога? Мы зусім не рухаемся наперад. Наперад ідуць бязбожнікі, цялесныя, падманшчыкі, а не мы. Яны маюць дабраславенні і заможнасць» (перафразавана аўтарам). Бог называе гэта прыкрымі або суровымі словамі, і Ён лічыць іх скіраванымі супраць Сябе. Прасцей кажучы, гэта наракання і скаргі.

Нараканні перашкодзілі народу Ізраіля ўвайсці ў Абяцаную Зямлю. Чаму скаргі – гэта абраза Богу? Чаму яны выклікалі такі суровы прысуд? Ускосна скаргі кажуць Богу: «Мне не падабаецца, што Ты робіш у маім жыцці, і на Тваім месцы я б зрабіў усё па-іншаму». Гэта поўная адсутнасць пашаны да Бога.

Бог высвятляе, хто будзе шукаць Яго, а хто будзе шукаць выгадаў і дабраславенняў. Адны рашуча шукаюць Бога, а другія скардзяцца, калі нешта падаецца ім няправільным. Тое, што некаторыя *называюць* дабраславеннем, і што *насамрэч* ёсць дабраславеннем – гэта дзве розныя рэчы. Некаторыя дабраславенні могуць не застацца з вамі, калі ваша стаўленне (сэрца) няправільнае. Тыя, хто маюць эгаістычныя матывы і скардзяцца, няхай паглядзяць на словы Госпада пра тое, што Ён зробіць з імі ды з іх дабраславеннямі:

> «І цяпер для вас прыказаньне гэтае, сьвятары. Калі вы не паслухаеце, і калі ня прыймеце да сэрца, каб даваць славу імені Майму, кажа ГОСПАД Магуцьцяў, Я пашлю на вас праклён і пракляну дабраславенствы вашыя, і нават ужо праклінаю, бо вы ня прыймаеце [гэтага] да сэрца» (Малахіі 2:1-2).

Наша ўзнагарода або спадчына не складаецца з рэчаў або пасадаў. Наша спадчына – Госпад!

У Эзэкіэля 44:28 напісана:

> « І [гэта] будзе ім за спадчыну. Я — спадчына іхняя. І не дасьцё ім уласнасьці ў Ізраілі, бо Я — уласнасьць іхняя».

Многія сучасныя хрысціяне не глядзяць на *сапраўдную* спадчыну, а замест гэтага засяроджваюцца на рэчах або пасадах, магчыма, нават на добрых рэчах, дадзеных Богам. Але гэта падобна на сына, які больш зацікаўлены ў тым, што дае яму бацька, чым у адносінах з бацькам. У мяне чацвёра сыноў, і я люблю нешта ім даваць. Аднак калі б гэта была адзіная прычына, па якой яны звярталі б на мяне ўвагу, то гэта разбіла б маё сэрца. Давайце прачытаем, што далей кажа Малахія:

> Тады тыя, якія баяцца ГОСПАДА, гаварылі адзін да аднаго. І прыхіліў вуха ГОСПАД, і пачуў, і была напісаная кніга памяці перад абліччам Ягоным пра тых, якія баяцца ГОСПАДА і якія шануюць імя Ягонае (Малахія 3:16).

Тут гаворыцца пра людзей, якія ішлі праз тую самую пустыню, што і «наракальнікі», але прыярытэт гэтай групы не ў пасадах, прызнанні або рэчах. Яны шукаюць сэрца Божага! У іх гарыць жаданне ведаць Яго. З імі можна размаўляць пра сацыяльныя пытанні ці пытанні бізнеса, але іх сэрца гарыць, калі вы гаворыце з імі пра Госпада і пра тое, што Ён кажа.

Гэта тыя людзі, пра каго Лука кажа: «І казалі яны адзін аднаму: «Ці ж не гарэла ў нас сэрца нашае, калі Ён гаварыў да нас у дарозе і калі адчыняў нам Пісаньне?» (Лукі 24:32). Іх жаданні *скіраваныя* на справы і рэчы Духа: «І казалі яны адзін аднаму: “Ці ж не гарэла ў нас сэрца нашае, калі Ён гаварыў да нас у дарозе і калі адчыняў нам Пісаньне?”». Важней за ўсё іх першая любоў – Ісус, а не пасада, статус або ўласнасць.

Паводзіны такіх людзей не змяняюцца ў залежнасці ад таго, дзе яны: у пустыні ці прапаведуюць мільёнам людзей.

Бо мы — супрацоўнікі Божыя, а вы — Божая ніва, Божая пабудова. Я, паводле дадзенай мне ласкі Божай, як мудры будаўнічы, заклаў падмурак, а другі будуе [на ім]. Кожны няхай глядзіць, як будуе (1 Карынцянам 3:9-10).

Трэба быць вельмі ўважлівымі, як мы будуем сваё жыццё! У Пісанні пабудова дома сімвалізуе пабудову нашага жыцця і служэння ў Валадарстве. Мы належым Богу, бо мы Яго пабудова:

… прыгледзьцеся да… Ісуса Хрыста, Які верны Таму, Які паставіў Яго, як і Майсей у-ва ўсім доме Ягоным. Бо Ён варты яшчэ большае славы за Майсея, як і большую пашану мае за дом той, хто яго збудаваў. Бо ўсякі дом некім будуецца; а Той, Які ўсё збудаваў, — Бог (Гебраям 3:1-4).

Звярніце ўвагу: Бог будуе дом, а не мы самі нашымі фізічнымі сіламі. Тое, што будуе Бог, трывае; тое, што будуем мы, змарнее. «Калі ГОСПАД не збудуе дом, надарэмна цяжка працуюць будаўнікі» (Псалом 127:1). Калі людзі будуюць дом без Бога, такое жыццё ці служэнне не ўстаіць.

У Быцці 11:4 мы бачым гэтаму прыклад: «Давайце зробім сабе горад і вежу, у якой верх будзе да неба, і гэтым зробім сабе імя, каб не расьцярушыліся мы па абліччы ўсёй зямлі».

З якой матывацыяй людзі будавалі Бабілонскую вежу? Яны хацелі дасягнуць сваіх мараў і ўзвесці пабудову дзеля сваёй славы. Яны прагнулі быць такімі, як Бог, але цалкам незалежнымі ад Яго.

Гэтае памкненне адпавядала іх жаданням і волі, але не адпавядала волі Божай. Калі мы будуем без Бога, вынік сумны: незалежна ад высакароднасці намераў, без Бога гэта марнасць! Вось чаму мы чытаем папярэджанне:

> Я, паводле дадзенай мне ласкі Божай, як мудры будаўнічы, заклаў падмурак, а другі будуе [на ім]. Кожны няхай глядзіць, як будуе. Бо ніхто ня можа закласьці іншага падмурку, апрача пастаўленага, які ёсьць Ісус Хрыстос. А калі хто будуе на гэтым падмурку з золата, срэбра, каштоўных камянёў, дрэва, сена, саломы, — работа кожнага выявіцца; бо дзень пакажа, таму што ў агні адкрываецца, і агонь выспрабуе работу кожнага, якая яна ёсьць (1 Карынцянам 3:10-13).

Золата, срэбра і каштоўныя камяні прадстаўляюць пабудову ў Божы спосаб. Дрэва, сена і салома прадстаўляюць нашы ўласныя метады пабудовы паводле планаў свету. Ці кажуць гэтыя вершы толькі пра суд нябесны? Не! Яны апісваюць прыход Бога ў Яго Святыню (Малахіі 3:16-4:1 і 1 Карынцянам 3:16-17). Ён прыйдзе як агонь, які або *паглыне* дрэва, сена і салому, або *ачысціць* золата і срэбра. Вось чаму далей гаворыцца: «Калі чыя работа згарыць, той згубіць яе, сам жа будзе збаўлены, але так, як праз агонь» (верш 15).

Калі вы будуеце жыццё, бізнес або служэнне з цэглы ўласнай вытворчасці, напрыклад, асабістай сілай або на падставе свецкіх праграм ці прыёмаў, калі вы будуеце з дапамогай маніпуляцый, кантролю і запалохвання людзей, калі вы лісліваце і карыстаецеся іншымі, каб дасягнуць пасады, калі падчас пабудовы вы ідзяце па галовах іншых, крытыкуючы іх або пляткарачы, тады ўсё дасягнутае такімі метадамі згарыць і будзе страчана.

Многія прасоўваюць сябе, выкарыстоўваючы падман, або нахабна хлусяць, каб атрымаць перавагі. Гэта таксама згарыць! «Ніхто няхай ня зводзіць сам сябе. Калі хто з вас думае быць мудрым

у гэтым веку, няхай будзе дурным, каб быць мудрым. Бо мудрасьць сьвету гэтага ёсьць глупства перад Богам, бо напісана: “Ён ловіць мудрых у падступнасьці іхняй”» (1 Карынцянам 3:18-19).

У Божых вачах любая сфера жыцця, дзе вы дзейнічаеце па эгаістычных матывах, лічыцца дрэвам, сенам або саломай. Незалежна ад таго, наколькі шмат гэтая сфера дапамагае іншым або дзейнічае ў імя Госпада, незалежна ад ахвяраванага часу, яна згарыць.

Мудрасць гэтага свету засяроджваецца на сабе. «А калі ў вашым сэрцы вы маеце горкую зайздрасьць і сварлівасьць … Гэта ня ёсьць мудрасьць, якая з вышыні зыходзіць, але зямная, душэўная, дэманава» (Якуба 3:14-15). Зайздрасць спараджае спаборніцтва і падазрэнні. Каб захаваць спакой і бяспеку ў сваёй сферы, мы можам пачаць гульню за ўладу, якая будзе каштаваць нам сяброў, унутранай цэласнасці або, што найважней, пашкодзіць нашым адносінам з Богам. Нават пастары і служыцелі могуць ахвяраваць блізкімі адносінамі з Богам дзеля пасадаў, тытулаў або заробку.

Тым, хто шчыра шукае Божае сэрца, можа падавацца: чым болей яны шукаюць, тым далей ад Яго адсоўваюцца. У роспачы яны крычаць Госпаду:

– Бог, чым больш я Цябе шукаю, тым я ніжэй, а не вышей!

– Глыбей капай! — адказвае Бог.

> «Усякі, хто прыходзіць да Мяне, і слухае словы Мае, і робіць паводле іх, пакажу вам, да каго падобны. Ён падобны да чалавека, што будуе дом, і ён капаў, і заглыбіўся, і заклаў падмурак на скале…» (Лукі 6:47-48)

Калі нашая сям’я жыла ў Даласе, я назіраў, як будаўнікі ўзводзілі хмарачосы. Спачатку праца ішла вельмі марудна, бо цэлыя месяцы сыходзілі на тое, каб закласці падмурак. Чым большы падмурак, тым глыбей рабілі катлаван. Зверху здавалася, што будаўнікі працавалі марудна і будоўля стаяла на месцы. Потым раптоўна вырастаў гмах.

У параўнанні з працэсам падрыхтоўкі падавалася, што хмарачос вырастаў за адну ноч.

*Рост уверх* быў дробяззю ў параўнанні з *падрыхтоўкай углыб.*

Я перакананы, што ў Целе Хрыста ёсць многа людзей у стане падрыхтоўкі ўглыб, асабліва,сярод маладога пакалення. Я слаўлю за гэта Бога! Яны пакліканы да служэння або атрымалі мару ад Госпада, але цяпер дапамагаюць іншым. Магчыма, усё рухаецца не вельмі хутка, але я веру, што Бог старанна рыхтуе іх у пустыні. Закладаецца падмурак, фармуецца характар Хрыста. Гэты характар будзе падпярэзваць усіх, хто ў далейшыя гады захоча служыць Хрысту і Яго Валадарству.

Людзі, што не знаходзяцца ў пустыні, здараецца, хутка рухаюцца па кар'ернай лесвіцы дзякуючы самарэкламе або палітычным хадам. Нашы вандроўнікі ў пустыні могуць адчуваць, што прастойваюць. Магчыма, у іх узнікне спакуса самастойна знайсці хуткі і лёгкі выхад з пустыні. Але ведаючы, што такое выйсце не дае трывалага характару і ставіць пад пагрозу характар ужо сфармаваны, яны вырашаюць, што рызыка занадта вялікая. Чакаючы Бога, яны дазваляюць Галоўнаму Будаўніку закласці цвёрды падмурак на Скале.

Таксама ёсць пастары, якія старанна шукаюць Бога, але ім зноў і зноў прыходзіць думка, што ў жыцці нічога не мяняецца. Знаходзячыся ў сухім месцы ці ў сухім часе, яны назіраюць, як іншыя паспяхова рэкламуюць сябе і свае служэнні праз свецкія маркетынгавыя прыёмы і ствараюць ілюзію шчасця і поспеху ў сацсетках. Аднак Бог не дазволіць нашым падарожнікам па пустыні будаваць такімі метадамі, бо Ён рыхтуе ім трывалы, надзейны падмурак.

Яшчэ ёсць тыя, каму Бог даў мару, але яшчэ не паказаў канкрэтнае месца ці пасаду. Ім невядома, калі і якім чынам здзейсніцца мара, яна ад іх нібыта ўцякае.

У засушлівы час пустыні Бог аддзяляе тых, хто згодны чакаць Яго ў паслухмянасці, ад тых, хто будуе з дапамогай падману, пралічанай

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 8. У Егошуа ўсё атрымалася.**

Калі пустыня мусіць быць нам на дабро, як нам утрымаць добрае і пазбегнуць кепскага?

Добры прыклад чалавека, сэрца якога было правільна настроена ў пустыні, — гэта Егошуа. Калі Майсей падняўся на гару Сінай, Егошуа застаўся ўнізе. Ён хацеў быць як мага бліжэй да Божай прысутнасці. Калі Майсей сустракаўся з Богам у Намёце, Егошуа таксама быў там, каб быць бліжэй да прысутнасці Госпада. Нават калі Майсей скончыў размову, Егошуа заставаўся ў Намёце Спаткання (Выхад 33:11).

У кнізе Егошуа мы бачым, што пяць сфер грэху, якія атакавалі ў пустыні бацькоў (папярэдняе пакаленне), не праяўляліся так выразна ў наступным пакаленні (пакаленні Егошуа). Мы памятаем, што аднойчы адбылося з чалавекам на імя Ахан. Але кіраўніцтва і народ адразу ж даверылі гэтую сітуацыю Богу. Наступнае пакаленне выправіла сітуацыю, таму што бачыла памылкі папярэднікаў: іх бацькі памерлі ў пустыні, не ўбачыўшы здзяйснення Божага абяцання.

Егошуа і яго пакаленне засяродзіліся на Творцы і ўвайшлі ў Абяцаную зямлю. Яны моцна трымаліся Божага Слова, былі свабодныя ад расчаравання, не скардзіліся і хутка прынялі рашэнне верыць Богу.

самарэкламы або маніпуляцыі. Божая падтрымка і выхад з пустыні падрыхтаваны тым, хто глядзіць на Бога і чакае Яго прыходу ў святыню. Ён кажа:

> «Калі Я прызначу [месца] спатканьня, Я буду судзіць паводле справядлівасьці»… Бо ані з усходу, ані з захаду, ані з пустыні

вывышэньне, але Бог ёсьць Судзьдзя, гэтага Ён паніжае, а таго вывышае (Псалом 75 (74):3-8).

## Марнасць цела

Праўда пра змаганне паміж целам і Духам кранае не толькі служэнне, але ўсе аспекты жыцця. Памятайце: цела ніколі не прывядзе да выканання Божых абяцанняў! Калі штосьці нараджаецца ад цела – што ж, зычу поспехаў! – целу прыйдзецца гэта падтрымліваць. Калі штосьці нараджаецца ад Духа, то і падтрымка будзе ад Бога.

Дзеянні паводле цела звычайна вядуць да маніпуляцый і кантролю. Кіраўнікі карыстаюцца ўладай або гуляюцца з пачуццямі і эмоцыямі людзей, каб дасягнуць вынікаў. Калі вы – адзін з іх падданых, то раптоўна станеце адказным за іх поспех або няўдачу – у залежнасці ад таго, як вы рэагуеце на іх указанні. Будзе шмат ціску, законніцтва, дамінавання або маніпуляцый.

Нягледзячы на тое, што я ў першую чаргу кажу пра служэнне, хачу падкрэсліць: гэта тычыцца *не* толькі служэння; я апісваю *ўсё* створанае паводле цела. Гэта можа тычыцца нашага паклікання ў бізнесе, адукацыі, ахове здароўя, ва ўрадзе і ў войску, прафесійным спорце і многіх іншых сферах, дзе Бог ставіць служыць Сваіх дзяцей.

І наадварот, народжаныя ад Духа зразумеюць: іх роля ў асабістым фармаванні была малой, таму яны не могуць падтрымліваць саміх сябе або расці на падставе ўласных сіл і здольнасцяў. Бог адказны за тое, каб забяспечыць тых, каго Ён узрасціў.

Калі нарадзіўся Ісаак, пазіцыя Ізмаэля была ўжо добра акрэсленая і абазначаная (Быццё 16-21). Я шмат разоў пераканаўся на сваім досведзе, што да нараджэння абяцанага Ісаака заўсёды прадставяцца магчымасці нарадзіць Ізмаэля. *Неабходна* супрацьстаяць спакусе выкарыстаць уласныя сілы, каб нарадзіць тое, што абяцаў Бог, Прыгадаем верш з Быцця 21:10 яшчэ раз:

«Выгані гэтую нявольніцу і сына ейнага, бо ня будзе мець спадчыну сын нявольніцы гэтай з сынам маім Ісаакам».

Надыходзіць час, калі Госпад скажа Свайму народу: «Выганіце намаганні Ізмаэля, бо сын цела не будзе мець спадчыны з сынам абяцання». Хаця і намаганні Ізмаэля здаюцца прадуктыўнымі, Бог скажа: «Ганіце іх!», бо цела не мае славу ў Яго прысутнасці!

Калі Божы суд ідавочны, любая частка вашага жыцця, збудаваная ўласнымі намаганнямі, не перажыве ачышчальнага агню. Калі вы будуеце жыццё на высілках самазахавання і самарэкламы, усё згарыць. Аднак вы «ўратуецеся, але так, нібыта праз агонь» (1 Карынцянам 3:15).

Застанецца толькі атрыманае праз абяцанне, пачатае і народжанае праз Божы Дух і Божую ласку.

9

# СІЛАВАЯ ТРЭНІРОЎКА

*Госпад рыхтуе Сваіх найлепшых ваяроў на высокагор’ях пакутаў.*

**– Чарльз Спэрджэн**

*А дзіцятка ўзрастала і ўмацоўвалася духам, і было ў пустыні да дня зьяўленьня свайго Ізраілю.*

**– Лукі 1:80**



Некалькі гадоў таму я сутыкнуўся з іншым выклікам, які добра ілюструе: мы, як вучні Хрыста, патрабуем падрыхтоўкі, і гэта дапаможа нам вырасці і ўмацаваць нашу веру. Хочаце верце, хочаце не верце: гэтае выпрабаванне адбылося не ў сухіх пустынных месцах, але ў трэнажорных залах і спартовых клубах.

Калі мне было трыццаць пяць гадоў, я ледзь не згубіў прытомнасць пасля пропаведзі ў царкве ў Атланце, штат Джорджыя. Я зразумеў, што ў мяне кепская фізічная форма, і вырашыў заняцца гэтым, калі хачу верна служыць Госпаду і далей.

Я вярнуўся з Джорджыі дадому і расказаў Лізе, што адбылося. І дадаў: «Я пайду ў трэнажорку».

Да майго здзіўлення, у адказ я пачуў: «Дзякуй Богу! Я малілася, каб ты пайшоў у спартовую залю!» Цудоўна мець жонку, якая ведае, як маліцца за мужа!

У той час мы жылі ў Флорыдзе, і праз два дамы ад нас жыў рэстлер Кіп, сябра сусветнай асацыяцыі рэстлінгу. Мы сябравалі сем'ямі, бо нашы дзеці былі равеснікамі. Кіп некалькі раз прапаноўваў мне схадзіць у трэнажорную залю пазаймацца, але я заўсёды адказваў: «Не, няма часу! Я заняты». Я сапраўды быў заняты, але таксама і напалоханы: вы хацелі б трэніравацца з прафесійным рэстлерам?

Кіп быў здаравяком: рост 195 см, вага – амаль 110 кг і ўсяго толькі 6 % тлушчу. У яго было «трохкутная» фігура: шырокія плечы і

вузкія клубы, а таксама добра накачаны прэс. Мы з нашымі дзецьмі часта гулялі ў вулічны баскетбол або хакей. Калі я налятаў на Кіпа, ён нават не хістаўся, а я адлятаў на паўтара-два метры назад!

Пасля паездкі ў Атланту я пайшоў да яго і сказаў: «Кіп, мне трэба ў трэнажорку. Ты казаў, можаш мяне патрэніраваць. Прапанова ў сіле?»

Ён хутка адказаў: «Так, вядома! Заўтра ідзем у трэнажорку». Калі б я быў больш уважлівы да яго здзеклівай усмешкі, я зразумеў бы, што мяне чакала!

Наступнай раніцай мы прыйшлі ў душную трэнажорку. Я адразу ж зразумеў, што там трэніруюцца сур’ёзныя спартоўцы. Атмасфера была перанасычана тэстастэронам і пахам успатнелых целаў. Першае, што я даведаўся ў трэнажорцы ў першы ж дзень: мышцы не нарошчваюцца, калі вы падымаеце лёгкі груз 20-30 разоў. Наадварот, трэба штурхнуць штангу з вялізнай вагой усяго тры-чатыры разы.

На трэці ці чацвёрты заход мышцы адчуваюць усё напоўніцу. Усё ўнутры крычыць: «Я болей не магу гэта падымаць!» А ўсе хлопцы вакол цябе крычаць: «Давай, штурхай, мацней!» - і тады штосьці ўнутры прымушае цябе знайсці дадатковыя сілы і падняць вагу чацвёрты ці пяты раз. Калі патлумачыць складанае простымі словамі, менавіта тады і фармуюцца сапраўдныя мускулы.

Мне сорамна сказаць, але ў першы раз я змог штурхнуць ад грудзей усяго 43 кг. Я ўпэўнены, тады Кіп зразумеў: з суседам прыйдзецца павожкацца! Праз пару тыдняў у трэнажорнай зале я дайшоў да 47 кг. Праз яшчэ некалькі тыдняў – да 52. Потым я дабраўся да 56 кг. Калі я ўрэшце змог штурхнуць 61 кг, я быў так рады, што мог паставіць на кожны бок штангі стандартны 15-кілаграмовы дыск! Мне больш не было сорамна.

Я вярнуся да маёй гісторыі ў гэтым раздзеле пазней. Такі працэс павольнага вяртання да добрай фізічнай формы – добрая аналогія таму, што адбываецца, калі Госпад бярэ нас у пустыні ў Сваю

«трэнажорную залю» і дапамагае нам аднавіць духоўныя мускулы.

Менавіта ў пустыні наш дух становіцца моцным, бо гэта не толькі сухое месца крыкаў «Божа, дзе Ты?», але і месца глыбокага выпрабавання і спакусаў. Добрая навіна: хаця і пустыня складаная, нам трэба памятаць, хто заўзее за нас, каб мы падняли патрэбную вагу падчас трэніроўкі духоўнай сілы:

> Калі Бог за нас, хто супраць нас? (Рымлянам 8:31)

Ён не проста за нас, не проста заўзее, але дае цвёрдае абяцанне:

> Вас наведала спакуса ня іншая, як чалавечая. Але верны Бог, Які не пакіне вас быць спакушанымі больш, чым вы можаце [вытрымаць], але са спакусай зробіць і выхад, каб вы маглі яе перанесьці (1 Карынцянам 10:13).

Незалежна ад таго, якое перад вамі выпрабаванне, праз якое змрочнае і сухое месца вы праходзіце, Бог абяцае: мы ніколі не будзем мець спакусы, на паспяховае праходжанне якой у нас не хопіць сілаў. Калі задумацца, гэта проста цудоўна.

Не забывайце, хто вы, сутыкаючыся з выпрабаваннямі. Ісус, улюбёнае Божае Дзіця, кажа: «Вось, Я даю вам уладу наступаць на зьмеяў і скарпіёнаў, і на ўсю сілу варожую, і нішто не пашкодзіць вам» (Лука 10:19). Такім чынам зразумела: якімі б ні былі нападкі ворага, мы можам іх пераадолець. Бог не дапусціць тое, што мы не можам пераадолець!

У гэтым палягае і праблема. Многія людзі не растуць у сваёй здольнасці спраўляцца з усё большымі выклікамі. Яны, так бы мовіць, пазбягаюць трэнажорнай залі  або там енчаць і наракаюць. Але Павал дэманструе зусім іншае стаўленне да сітуацыі. Ён піша:

«Бо вам *дадзена* дзеля Хрыста ня толькі верыць у Яго, але і цярпець дзеля Яго» (Філіпянам 1:29).

Вас не прымушаюць вас задумацца словы пра тое, што пакуты

вам «дадзеныя»? Што ж гэта значыць? Калі хтосьці гаворыць: «Гэта было мне дадзена», на мой погляд, такія словы гучаць як дабраславенне. Калі так сказаць пра мяне, я нават магу падумаць: *«Цікава, што ж я атрымаю?»*

Як жа словы «дадзена» і «цярпець» могуць быць у адным сказе? Гэта тое самае, што сказаць камусьці: «Бо табе дадзена на дзень народзінаў пайсці да стаматолага лячыць каналы!» *Праўда? Дзякуй! Не трэба.* Такія словы гучаць бессэнсоўным, бо жыццё, якое мы чакаем у такой сучаснай краіне, як ЗША, – гэта жыццё камфорту і адноснай лёгкасці. Калі ж нам дадзена «цярпець», мы бянтэжымся. Большасць людзей, сутыкнуўшыся з супрацьстаяннем, кажуць:

«Паверыць не магу! Гэта адбываецца са мной».

«Чаму я?»

«Чаму мне трэба гэта праходзіць?»

«Я не магу гэта цярпець».

«Ніхто не разумее, што я зараз праходжу!»

«Чаму я не магу жыць нармальным жыццём?»

«Бог, калі ласка, забяры гэта!»

«Навошта высіляцца? Прасцей здацца…»

Часам я ўпэўнены, што ўсе мы думалі або казалі такія словы, сутыкаючыся з пэўным супрацьстаяннем у жыцці. Сумна казаць, але так часта мы проста не разумеем мэты выпрабаванняў і пакутаў у пустыні.

Аднак Бог, як заўсёды, ведае, што нам трэба, каб вырасці і быць больш эфектыўнымі ў Яго Валадарстве. Вось чаму Павал паведамляе нам пра Божае абяцанне: нам будуць «дадзеныя» пэўныя стратэгічныя цярпенні (пакуты), каб узмацніліся мускулы нашай веры.

## Роля спакусы

Я ўжо згадваў раней: частка нашай трэніроўкі ў пустыні – гэта рост у здольнасці распазнаваць спакусы і супрацьстаяць ім. Ісус перажыў гэта на самым пачатку служэння, калі Айцец дазволіў шатану спакушаць Яго ў пустыні: «Ісус, напоўнены Духам Сьвятым,

вярнуўся з Ярдану і быў паведзены Духам у пустыню. Там сорак дзён Ён быў спакушваны д’яблам і нічога ня еў у гэтыя дні; а калі яны скончыліся, урэшце захацеў есьці» (Лука 4:1-2).

Я наўмысна абраў слова «дазволіў», таму што Бог ніколі не бывае аўтарам спакусы: «Спакушаны, ніхто няхай ня кажа: «Бог мяне спакушае», бо Бог не спакушаецца злом, і Сам нікога не спакушае» (Якуба 1:13).

Што на самай справе адбываецца з намі, калі спакушаемся? Мы ведаем, што намер шатана – прымусіць нас саграшыць і сысці ад радаснай паслухмянасці ў адносінах з Богам. Калі шатан хоча бачыць такі вынік спакусы, то чаго шукае Бог, дазваляючы нам спакушацца? Апостал Пётр прапануе наступную думку: «Дык як Хрыстос цярпеў за нас целам, і вы ўзбройцеся такой думкаю, што той, хто церпіць целам, перастае грашыць» (1 Пятра 4:1).

Іншымі словамі, выпрабаванне праз спакусу, заваяванне грэху

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 9. Не нараджайце Ізмаэля.**

Калі мы разумеем, што патрапілі ў пустыню, і думаем, што ўжо занадта доўга там ходзім, падкрадзецца спакуса «штонебудзь» зрабіць, каб ажыццявіць мару. Я называю гэта нараджэннем Ізмаэля, якое адбываецца, калі мы спрабуем зрабіць нешта сваімі высілкамі, хоць Бог абяцаў нам, што гэта зробіць Ён. Ізмаэлі часта нараджаюцца з законных патрэбаў, але нараджаюцца з цела.

Вядома, гэтая ідэя пайшла ад гісторыі Абрагама і Сары, якім Бог паабяцаў сына. Яны чакалі адзінаццаць гадоў і – падумаць толькі! – Абрагаму было 86, а Сара ўжо не магла мець дзяцей. Таму яны выкарысталі план Б: Сара прапанавала,

і іншых пытанняў у пустыні, даецца для таго, каб дапамагчы нам збудаваць нашы духоўныя мускулы і пасталець. У гэтым вершы ключавое слова – «узбройцеся».

Вы можаце ўявіць ваенных, якія ідуць на бітву без зброі? Без агнявой падтрымкі, без танкаў, стрэльбаў або амуніцыі? Гэта катастрофа! З такой жа катастрофай сутыкаюцца вучні Хрыста, калі не гатовыя пакутаваць, не ўзброеныя для выпрабаванняў.

Пілоты камерцыйных авіяліній – добры прыклад тых, хто гатовы для магчымых тэстаў. Кожныя шэсць месяцаў авіякампанія адпраўляе іх на павышэнне кваліфікацыі. Пілоты садзяцца ў авіясімулятар і павінны правільна і эфектыўна адрэагаваць на любы кепскі сцэнар. Мэта такога падыходу – палепшыць веды пілотаў пра тое, як рэагаваць у экстраных сітуацыях. Звычайна ў складаных сітуацыях з самалётамі пасажыры, якія *не «ўзброеныя»* ведамі, бяздзейнічаюць, у той час як пілоты дзейнічаюць. Чаму? Бо пілоты былі *«ўзброеныя»*.

каб Абрагам узяў Агар і нарадзіў абяцанае дзіця праз яе. Гэта была вельмі кепская ідэя. І любая задума пра Ізмаэля, нават калі яна выглядае някепскай, - таксама кепская ідэя. Заўсёды памятайце: тое, што вы народзіце сілай цела, вам трэба будзе падтрымліваць сілай цела!

Часам у пустыні я спрабаваў план Б. Я ведаў, што Бог абяцаў мне ў будучым прапаведаваць па ўсім свеце. Але так не адбывалася – я «захрас» у служэнні памеснай царквы. Таму некалькі раз я паспрабаваў пазбегнуць пустыні. Мае высілкі былі вялізнымі, але выніку не было. Як толькі я здаўся, Бог урэшце пачаў дзейнічаць і ўсё памянялася.

Я заклікаю вас ашчадзіць сілы і не нараджаць Ізмаэля. Дайце Богу прывесці ў свет тое, што Ён абяцаў вам.

Менавіта ў гэтым пустыня дапамагае паслухмянаму хрысціяніну. Яна ставіць нас перад складанасцямі, якія ўзброяць нас дзеля будучых заваяванняў. Мы павінны разумець, што складанасці – пустыня – прыйдуць у наша жыццё. Ісус казаў, што ў свеце мы будзем сутыкацца са складанасцямі і цярпеннямі, але Ён дапаможа іх пераадолець. І ў працэсе гэтага мы ўмацуемся.

## Вялікая магчымасць

Нам трэба ставіцца да пустыні як да вялікай магчымасці збудаваць моцныя духоўныя мускулы, умацавацца для таго, што Госпад хоча нам даць на наступным этапе. Вось што кажа апостал Якуб:

> Вялікай радасьцю лічыце, браты мае, калі трапляеце ў розныя спакусы (Якуб 1:2).

Усе мы мусім разумець магчымасці, якія адкрываюцца тут, таму што амерыканцы цэняць прадпрымальніцкі дух. Магчымасці ў бізнэсе, напрыклад, - гэта шанец вырасці, дасягнуць поспеху, зарабіць шмат грошай. Гэта шанец пашырыць нашыя гарызонты. І менавіта так трэба глядзець на праблемы, бо Якуб далей кажа: «…ведаючы, што выпрабаваньне вашае веры робіць цярплівасьць. А цярплівасьць няхай мае дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалымі і суцэльнымі, без аніякага недахопу» (Якуб 1:3-4).

У пустыні нам даецца магчымасць *павялічыць вытрываласць.* Як мы ў сучасным свеце найчасцей выкарыстоўваем слова «вытрываласць»? Я часта чую яго адносна трэніроўкі, якая апісваецца як “мэтанакіраваныя практыкаванні дзеля павышэння нашай здольнасці пераносіць нагрузкі”. Папросту кажучы, трэніроўка вытрываласці павялічвае нашу *здольнасць* спраўляцца з будучымі выклікамі.

Вось якая сітуацыя: у любых выпрабаваннях, з якімі мы сутыкаемся, Бог дазваляе складанасці дзеля пэўнай мэты, і гэтая мэта – спарадзіць *здольнасць.* Бог дазволіць – я падкрэслю слова

*дазволіць* – складанасці сёння, якія будуць сімуляваць (прыгадайце сімулятар палётаў у пілотаў) той узровень ціску, з якім мы сутыкнёмся ў будучыні. Вось чаму выпрабаванні заўсёды здаюцца большымі, чым цяперашні ўзровень гатоўнасці або адказнасці. Галоўнае тут тое, што Бог выкарыстоўвае нашы цяперашнія выклікі, каб умацаваць нас для далейшых заваяванняў у будучыні.

Вернемся да маіх практыкаванняў у трэнажорнай залі. Як я ўжо казаў, Кіп натрэніраваў мяне да таго моманту, пакуль я не змог падымаць 60 кг. Для мяне гэта было вялікім дасягненнем, але я задумваўся, ці змог бы я падняць больш? Параўноўваючы трэніроўкі з духоўнай гатоўнасцю і сілай, што б адбылося, калі б Госпад падрыхтаваў для мяне задачу, для якой спатрэбілася б падняць больш за 60 кілаграмаў?

Таму я працягваў хадзіць у трэнажорную залю. Урэшце я змог штурхнуць 92 кг, але далей не змог прасунуцца на працягу некалькіх гадоў. Я выступаў на канферэнцыі ў Каліфорніі і некалькі чалавек там спыталіся ў мяне:

– Джон, няўжо ты ніколі не падымаў 102 кілаграмы?

– Не, хоць і спрабаваў больш за пяць гадоў, – расчаравана адказаў я.

– Мы дапаможам табе, - адказалі мне.

І безумоўна, у гэты дзень я змог штурхнуць гэтую вагу. Я быў так усцешаны!

Пасля гэтага да нашага служэння, Messenger International, далучыўся новы сябра каманды. Я даведаўся, што ён удзельнічаў у спаборніцтвах па штурханні штангі, таму мы пачалі трэніравацца разам. З яго дапамогай я змог падняць 106 кг, а аднойчы нават дайшоў да 111 кг. Але ці мог я падняць яшчэ болей?

Праз год я прапаведаваў у адной з цэркваў Дэтройта. Пасля служэння ў нядзелю пастар сказаў:

– Джон, у мяне ёсць трэнер. Гэта вядомы на ўсю краіну чалавек, які наведвае нашу царкву. Я буду займацца заўтра. Пойдзеш са мной?

– Вядома! – з энтузіазмам адказаў я.

На наступны дзень мы пайшлі ў трэнажорную залю. Трэнер прыгледзеўся да мяне і запытаўся:

–Ваша максімальная вага – 111 кілаграмаў?

– Так, я здолеў аднойчы.

– Добра, сёння мы падымем болей!

*Што?!* Я не збіраўся гэтага казаць, але я падумаў: *«Вы, напэўна, вар’ят. Гэта немагчыма!»* Але пасля тлумачэнняў і трэніроўкі адбылося немагчымае: я штурхнуў 120 кілаграмаў!

Я быў вельмі ўзрадаваны. Мы вярнуліся назад, у Каларада, і кожны тыдзень гэты трэнер трэніраваў мяне анлайн. Мы старанна займаліся, і ў наступным годзе я вярнуўся ў тую ж царкву ў Дэтройце. На той момант мне было 42 гады.

У тую нядзелю я прапаведаваў пра цудоўныя якасці Духа Святога. Прыйшоў панядзелак, і мы пайшлі ў тую ж самую трэнажорную залю. Трэнер сказаў:

– Джон, мне сёння праснілася, што ты штурхнуў больш за 136 кілаграмаў!

– Гэта немагчыма!» – адказаў я.

Думаў я ў гэты момант прыкладна наступнае: *«Добра табе, але я такога не сніў!»*

– Джон, учора ты прапаведаваў пра сілу Святога Духа. Ён даў мне гэты сон! Давай, хутка на лаву. Мы гэта зробім!

І вось, пасля разагрэву, на штангу прычапілі дыскі, і моцным штуршком я здолеў падняць 147 кілаграмаў!

Я быў так узрадаваны, што пазваніў Лізе з Дэтройцкага аэрапорту і сказаў: «Па-мойму, мне не трэба самалёт. Здаецца, у мяне крылы выраслі!»

У той час, калі я змог штурхнуць 147 кг, я з лёгкасцю падымаў 102 кг. Насамрэч, я мог зрабіць некалькі падыходаў, калі падымаў гэтую вагу па дзесяць раз. Але прыгадайце, што я рабіў, калі пачынаў сем гадоў раней. Што адбылося б, калі ў той час Кіп прычапіў на штангу

вагу ў 102 кг замест 43? Я мог бы памерці! Штанга з усімі дыскамі магла зваліцца і забіць мяне! Мне спатрэбіліся гады пастаяннай працы, каб дасягнуць такога выніку. Тое, што цяпер лічылася звычайнай вагой, сем гадоў таму было маёй мяжой!

Вось чаму выпрабаванні, праз якія мы праходзім, зачастую патрабуюць доўгага перыяду. Таму яны з'яўляюцца духоўнай падрыхтоўкай, нарошчваннем сілы і дапамагаюць падрыхтавацца да яшчэ большых выпрабаванняў у будучыні. Калі мы мацнейшыя ў Госпадзе, мы маем здольнасць зрабіць больш для збудавання Валадарства.

Сумны факт у тым, што будуць людзі, якія стануць перад пасадам Суду, а Ісус са слязамі на вачах скажа ім: «Я хацеў, каб ты зрабіў так шмат, але ў цябе не было *здольнасці* справіцца з выклікамі, якія чакалі цябе на шляху». Гэта асабліва трагічна, бо, як мы ведаем, Бог ніколі не дае нам больш, чым мы можам вытрымаць. Гэта Яго абяцанне!

Давайце выкарыстаем маю гісторыю са штангай як аналогію. Калі вы можаце справіцца з духоўным выклікам на 61 кг, а Бог мае план або пасаду, якая патрабуе ад вас здольнасці падняць 84 кг супрацьстаяння, пераследу, спакусаў і выпрабаванняў, Ён не дазволіць гэтага – вы проста недастаткова моцныя. Магчыма, Ён дазволіць – хоць і не стане *крыніцай гэтага* – выпрабаванне, аналагічнае 70 кг, якое яшчэ болей выпрабуе, але не адолее вас.

Напрыклад, нехта распускае пра вас плёткі і чуткі. Замест таго, каб супрацьстаць нападкам і абараняцца, распаўсюджваючы плёткі пра гэтага чалавека, вы, у паслухмянасці Божаму слову, абіраеце нічога не казаць і дабраслаўляць яго. Цудоўна: вы прайшлі выпрабаванне 70-ю кілаграмамі! Цяпер наступны этап: 75 кілаграмаў! Калі паслухаецеся Яго Слова ва ўсіх складанасцях, ваша навучанне будзе працягвацца, пакуль вы не дойдзеце да 84 кг. Цяпер вы гатовыя да гэтага лепшага плана або новай пасады ў Валадарстве, якія Бог падрыхтаваў для вашага жыцця.

Калі ж вы адрэагуеце на плёткі крыўдай і нападкамі на чалавека, то – вы здагадаліся – Госпад са слязамі скажа: «Мне вельмі шкада! Табе трэба вярнуцца да выклікаў вагой у 65 кг». Вы па-ранейшаму ў «трэнажорнай залі», але не атрымліваеце ад яе карысці.

Трэніроўка працягваецца, але на тым самы узроўні. Далей Ён дазваляе прыйсці ў ваша жыццё фінансавым праблемам – яшчэ аднаму выпрабаванню ў 70 кілаграм. Але замест таго, каб шукаць Божага забеспячэння, вы адразу ж кажаце: «Ніякіх праблем! Наша крэдытная картка яшчэ дзейнічае!» І Бог здымае дадатковую вагу і кажа: «Вяртаемся на 65 кілаграмаў».

Урэшце прыйдзе час, калі вы спатрэбіцеся Богу для выканання той канкрэтнай задачы ў Валадарстве або для той пасады, дзе трэба будзе вытрымаць супраціў у 84 кг. Калі тэсты ў пустыні – вашы заняткі цяжкой атлетыкай – пастаянна былі беспаспяховымі, Ён не зможа запрасіць вас на гэта месца, бо ў вас не хопіць духоўных сілаў вытрымаць складанасці сітуацыі або пасады. Тады Богу трэба будзе знайсці кагосьці іншага, каб справіцца з гэтай задачай або пасадай.

## Большая сіла і ўлада

Вось чаму пустыня важная: *яна будуе нашу сілу.*

У пустыні Ян Хрысціцель стаў моцным духам.

У пустыні Ісус стаў моцным духам.

Іх духоўныя мускулы развіваліся ў няпростыя часы, калі прыходзілі выпрабаванні і правяралася іх вера.

Вось добрая навіна ад Якуба: калі вы праходзіце выпрабаванні і робіце гэта ў Божы спосаб, вы будзеце цудоўным чынам падрыхтаваныя – *моцныя* – для таго, што Бог мае для вас на наступным этапе:

> …ведаючы, што выпрабаваньне вашае веры робіць цярплівасьць. А цярплівасьць няхай мае дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалымі і суцэльнымі, без аніякага недахопу (Якуба 1:3-4).

Калі Якуб кажа: «няхай мае» (у анг. перакладзе – дайце ёй вырасці – заўвага перакл.), маецца на ўвазе нашая здольнасць і вытрываласць. Таксама Якуб гаворыць, што можна чакаць, калі прымем пустыню: «Шчасьлівы чалавек, які вытрымлівае спакусу, бо, стаўшыся выпрабаваным, ён атрымае вянок жыцьця, які абяцаў Госпад тым, хто любіць Яго» (Якуб 1:12).

Слова «вянок» мае сілу, а з ёй прыходзіць і ўлада. Як Ісус пайшоў у пустыню, каб вытрымаць спакусы ад д’ябла і, дзякуючы паслухмянасці і настойлівасці, выйшаў адтуль з большай уладай і сілай (гл. Лукі 4:1, 14), так і мы можам выйсці з пустыні з большай уладай і сілай.

Не ведаю, як вы, а я хачу быць упэўненым, што маю дастаткова духоўных мускулаў, каб справіцца з тым, што Госпад падрыхтаваў для мяне.

Ну што, хадзем у трэнажорку?

10

# ВАДА Ў ПУСТЫНІ

*Не здолеўшы паверыць Госпаду ў момант, калі абставіны выступаюць супраць нас, мы не верым Яму зусім.*

**– Чарльз Спэрджэн**

*Усякі, хто п’е гэтую ваду, зноў будзе смагнуць. Хто ж вып’е ваду, якую Я яму дам, ня будзе смагнуць ніколі, але вада, якую Я дам яму, станецца ў ім крыніцаю вады, якая цячэ ў жыцьцё вечнае.*

**– Яна 4:13-14**



Дождж у пустыні ідзе рэдка. Ваду знайсці цяжка, калі ж гэта і атрымаецца, то яе трэба яшчэ дастаць са студняў або крыніцаў. Пустыня – гэта сухая спрагнёная зямля (Псалом 63:1). Таму Ісус запрашае нас:

> «Калі хто смагне, няхай прыйдзе да Мяне і п'е. Хто верыць у Мяне, як сказана ў Пісаньні, у таго з жывата пацякуць рэкі вады жывое». Гэта сказаў Ён пра Духа, Якога меліся прыняць тыя, якія вераць у Яго, бо не было яшчэ Духа Сьвятога, бо ня быў яшчэ Ісус праслаўлены (Ян 7:37-39).

Я прыгадваю некалькі выпадкаў у сухія часы, калі я маліўся, але цяжка было атрымаць хоць адзін глыток жывой вады. Аднойчы я шукаў Госпада і паставіў намёт у парку, каб правесці там вечар і наступны ранак. Вечарам я маліўся, потым чытаў, а потым хваліў Госпада спевамі. Прайшло прыкладна тры гадзіны, але не было ніякага зруху. Я пачуваўся цалкам сухім, нібы вады зусім не было. Расчараваны, я ўрэшце залез у спальнік і паспрабаваў заснуць.

Той ноччу, мяркую, цешылася ўсё пекла: я нават не мог добра заснуць. Я круціўся ў спальніку, думаючы, чаму Бог мне не адкрываўся. Зранку я выйшаў і пачаў хадзіць па сцежках парка, молячыся Духам, але ўсё заставалася па-ранейшаму. Так доўжылася

яшчэ паўтары гадзіны. Урэшце я зірнуў на неба і сказаў: «Госпад, напэўна, я ўсё яшчэ ў пустыні». Я думаў: *«Ну, магу пайсці дадому і перастаць шукаць Госпада; Ён мяне змясціў у гэтую пустыню, усё адно нічога не памяняецца, пакуль Ён мяне адсюль не вывядзе».*

Гэта былі няправільныя думкі! Бог не пасылае нам такія часы, каб расстроіць нас і прымусіць здацца да таго часу, як Ён уладна памяняе нашу сітуацыю! Пустыня не задумана як месца паразы. Гэта месца перамогі! Раптоўна ўнутры пачуўся ціхі голас: «Змагайся!» У адным кароткім слове была так неабходная мне іскра агню і жыцця! Я адразу ж сказаў: «Аднавіся, дар Божы, ува мне! Паліцеся, рэкі жывой вады! Напоўніся, студня маёй душы!» Я ўспомніў, што адбылося з ізраільцянамі ў пустыні:

> Адтуль [рушылі] ў Бээр. Гэта тая студня, пра якую сказаў ГОСПАД Майсею: «Зьбяры народ, і Я дам яму вады». Тады засьпяваў Ізраіль гэты сьпеў: «Напаўняйся, студня, сьпявайце пра яе! (Лікі 21:16-17)

Калі я паўтараў гэтыя словы з Пісання, малітва станавілася ўсё больш насычанай, пакуль я не стаў хадзіць туды-сюды па сцежцы, абвяшчаючы ў малітве Слова Госпада з вялікай сілай і агнём. Усё асвяжылася, і я пачуваўся зусім па-іншаму! Яго прысутнасць магутна напоўніла ўсё навокал. Усяго некалькі хвілін таму я адчуваў цяжар і слабасць, але цяпер я рыхтаваўся да бітвы, гатовы сустрэць Словам Божым любога ворага!

Так доўжылася каля дваццаці пяці хвілін, але я думаю, што прайшло ўсяго пяць. Цяпер я абнавіўся і быў гатовы скараць свет!

Ісус кажа, што з чэрава тых, хто прыйдзе да Яго і будзе піць, пацякуць рэкі жывой вады. У пустыні Дух Божы не праліваецца дажджом. У гэтым засушлівым месцы жывая вада мусіць ісці глыбока з сэрца, з крыніцы або студні Божай.

Звярніце ўвагу: Ісус падкрэслівае (Ян 7:39), што крыніца-студня,

пра якую Ён кажа, — гэта Дух Божы, а з сэрца верніка пацякуць рэкі, а не проста адна рака.

Якім чынам Дух Госпада цячэ з нашага сэрца, нібы рэкі? Прарок Ісая тлумачыць прыроду дзеяння Духа: «І супачыне на Ім Дух ГОСПАДА, дух мудрасьці і розуму, дух рады і магутнасьці, дух веданьня і страху перад ГОСПАДАМ» (Ісая 11:2).

Дух Святы таксама названы Духам мудрасці і розуму, Духам рады і магутнасці, Духам ведання і страху перад Госпадам. Ісус кажа, што Дух пацячэ, як рэкі, і гэта значыць, што будуць рэкі мудрасці, розуму, рады, магутнасці, ведання і страху перад Госпадам. Не дзіва, што маё сэрца так запалала на той сцежцы ў парку!

Вось яшчэ некалькі важных момантаў:

> У Прыповесцях 18:4 мы чытаем: «Словы вуснаў чалавечых — глыбокія воды, крыніца мудрасьці — бурлівы ручай».

У Прыповесцях 16:22 сказана: «Розум — крыніца жыцьця для тых, хто мае яго, але настаўленьне неразумных — глупства».

У Прыповесцях 20:5 напісана: «Намеры ў сэрцы чалавека — глыбокія воды, але разумны чалавек вычэрпвае іх».

Гэтыя крыніцы – у сэрцы верніка, бо менавіта там жыве Дух. Але толькі чалавек, які разумее шляхі Госпада, вычарпае ваду са студні. Ключавое слова — «вычарпаць». Яшчэ раз: важна памятаць, што ў пустыні воды абнаўлення трэба *чэрпаць* з сэрца, яны не прыходзяць з дажджу Духа.

У Прыповесцях 10:11 мы бачым: «Вусны праведніка — крыніца жыцьця...».

У Прыповесцях 15:23 гаворыцца: «Радуецца чалавек з адказу вуснаў сваіх».

Калі б я сышоў з намёта са словамі: «Можна, у прынцыпе, і дадому пайсці і перастаць Яго шукаць. Усё адно Ён змясціў мяне ў пустыні, і нічога не памяняецца, пакуль Ён мяне адсюль не вывядзе»,

я б і далей нёс гэты цяжар. Але я прамовіў тое, што Госпад уклаў у маё сэрца, і таму напоўніўся неабходнымі мне водамі. Я знайшоў падземную сажалку вод збаўлення і чэрпаў адтуль воды абнаўлення. Як быццам пасярод пустыні п’еш прахалодную ваду з крыніцы!

У сухія часы многія апускаюць рукі, але Бог кажа: «Рухайцеся наперад, не спыняйцеся!» Нам трэба мець настойлівасць і ўчэпістасць, што не дазволіць нам здацца, пакуль не споўніцца Яго воля.

Многія перастаюць маліцца, калі адчуваюць сябе сухімі. Яны спыняюцца, бо з крыніц няма вады, здаецца, яе цяжка здабыць. Яны слабыя, а Бог хоча збудаваць іх сілу для бітваў наперадзе.

Адкуль узяць сілы, каб чэрпаць? З радасці! У Ісаі 12:3 напісана: «І вы з радасьцю будзеце чэрпаць ваду з крыніцаў збаўленьня». Гэта так, бо «радасьць ГОСПАДА – гэта апора ваша» (Нээмія 8:10). Радасць – гэта духоўная сіла, якая нас падмацоўвае.

Што такое радасць у Госпадзе? Шмат год я думаў, што радасць Госпада – гэта мець тую радасць, якую мае Ён. Мне цяжка было гэта зразумець. Але Бог меў на ўвазе не гэта. Вы чулі, каб хто-небудзь казаў: «Радасць гатавання ежы»? Сам па сабе такі працэс не мае радасці. «Радасць Госпада» – гэта тое, што мы адчуваем праз адносіны з Ім. Бог прыносіць нам радасць!

Калі мы не адчуваем Божай прысутнасці ў малітоўным пакоі, не значыць, што Ён адмаўляе нас. Адпаведна, наша радасць не абапіраецца на адчуванні. Хутчэй, яна абапіраецца на тое, Хто Ён, і на прывілей, які мы маем у адносінах з Ім. Таму мы бачым наскрозь хлусню адрынутасці і разумеем, што Бог вядзе нас да глыбокіх крыніцаў!

## Адкрыць засмечаныя крыніцы

Ісаак, сын Абрагама, дадзены цудоўным чынам, аднойчы апынуўся ў засушлівай пары:

> І быў голад у зямлі той, ня лічачы першага голаду, які быў
> у дні Абрагама. І пайшоў Ісаак да Абімэлеха, валадара

> Філістынскага, у Герар. І зьявіўся яму ГОСПАД, і сказаў: «Не зыходзь у Эгіпет; жыві ў зямлі, пра якую скажу табе. Жыві ў зямлі гэтай; і Я буду з табою, і дабраслаўлю цябе, бо табе і насеньню твайму Я дам усе краіны гэтыя, і споўню прысягу, якой Я прысягаў Абрагаму, бацьку твайму» (Быццё 26:1-3).

Бог выразна сказаў Ісааку не ісці ў Эгіпет, дзе было зручна, і заставацца там, дзе Бог яго паставіў. Шмат разоў, апынуўшыся ў сухім месцы, першае, што мы думаем: «Я сыходжу адсюль!» Калі ў час ранішняй малітвы мы не адчуваем Божай прысутнасці, розум трапляе ў роспач пры адной толькі думцы, што трэба сёння зрабіць. Мы хутка завяршаем малітву і займаемся спісам спраў.

Калі царква, куды мы ходзім, здаецца сухой, мы вырашаем, нават не спытаўшы Бога: *«Я пайду туды, дзе духоўнае жыццё і добрыя казані!»*

Калі сухім падаецца наша сацыяльнае жыццё або бізнес, мы думаем пераехаць у горад, дзе эканоміка квітнее. Мы разважаем: *«Калі я застануся тут, я высахну і ніколі не ўбачу, як Божы план здзейсніцца ў маім жыцці».*

Шмат амерыканскіх хрысціян менавіта так і мяркуюць. Яны бегаюць з адной сацыяльнай сеткі ў другую, ад аднаго віду дзейнасці да іншага, з царквы ў царкву, спрабуючы знайсці незасушлівае месца. Замест таго, каб капаць студні і дазволіць Богу выкарыстаць іх, каб прынесці ваду аднаўлення ў сухое месца, дзе яны знаходзяцца, яны, умоўна кажучы, «перабіраюцца ў Эгіпет», шукаючы палёгкі. Але пры гэтым не разумеюць, што ў сухія часы Бог народзіць бачанне, якое ім даў. Я ведаю: так можа быць не заўсёды, бо здараюцца часы, калі Бог рыхтуе для нас новае месца і дазваляе старому высахнуць. Ключ у тым, каб слухацца Божага Духа! Калі Ён нічога не кажа, проста заставайцеся і змагайцеся!

Паглядзіце, што ў выніку паслухмянасці Богу адбылося з Ісаакам, калі той застаўся ў зямлі, дзе быў голад:

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 10. Таемныя сродкі радасці.**

Калі вы праходзіце праз пустыню, вельмі лёгка засяродзіцца толькі на сваіх абставінах. Я хачу расказаць вам маленькі сакрэт, які дапамог мне выжыць і пачувацца добра ў часы пустыні. Гэта мой таемны сродак для радасці.

Калі звонку радавацца амаль няма чаму, калі здаецца, што нічога не адбываецца, я малюся, але не бачу аніякіх вынікаў, тады я вяртаюся да развагаў, што зрабіў Ісус. Я памятаю, што Ён выратаваў мяне з пекла, дзе агонь ніколі не сціхае і ніколі не знікае смурод серы. Там бясконцыя пакуты. Пекла створана для д'ябла, а не для мяне. Аднак д'ябал падмануў людзей і вядзе іх туды за сабой. Але Ісус аддаў Сваё жыццё – мой Творца аддаў ***Сваё*** жыццё, каб уратаваць ***мяне*** ад гэтага.

Калі я так раблю, гляджу на Ісуса і станаўлюся ў пазіцыю ўдзячнасці, калі я гляджу на жыццё позіркам вечнасці, раптоўна мая канкрэтная сітуацыя становіцца не такой важнай. Гэта мой таемны сродак радасці – прыгадаць усё, за што абавязаны быць удзячным, і глядзець на Ісуса.

І сеяў Ісаак у зямлі той, і сабраў у той год стакротны ўраджай, і дабраславіў яго ГОСПАД. І ставаўся вялікім муж гэты, і ішоў угору, і павялічыўся так, што стаў вельмі вялікі. І былі ў яго статкі авечак, і статкі валоў, і мноства слугаў, і зайздросьцілі яму Філістынцы. І ўсе студні, якія выкапалі слугі бацькі ягонага ў дні Абрагама, бацькі ягонага, засыпалі Філістынцы і запоўнілі пяском… І вярнуўся Ісаак, і адкапаў студні вады, якія былі выкапаныя ў дні Абрагама, бацькі ягонага, і якія засыпалі Філістынцы пасьля сьмерці Абрагама, і назваў іх тымі самымі назвамі, якімі назваў іх бацька ягоны (Быццё 26:12-15, 18).

Ваду, патрэбную Ісааку для ўраджаю, здабылі: ачысцілі засмечаныя крыніцы Абрагама, якія некалі засыпалі філістынцы. Як і ў сітуацыі з Ісаакам, ваду, так адчайна патрэбную нам для росту і выспявання Божага насення ў нашых сэрцах, трэба начэрпаць з закінутых крыніц. Філістынцы – частка свету і яго сістэмы. Часта мы падыходзім занадта блізка да сістэмы гэтага свету, і, самі таго не ведаючы, засыпаем крыніцы. Надзвычай важна расчысціць нашы студні, каб мы маглі атрымаць ваду, неабходную нашым душам.

Я перакананы: уварванне культурных каштоўнасцяў у цела Хрыстова сёння спыніла шмат студняў. Магчыма, царква, якой наканавана быць крыніцай жывой вады, стала сухім месцам, бо дазволіла ворагу спакусіць яе і засмеціць студні?

Мы можам задаць сабе пытанне: ці можа Бог аднавіць жывой вадой Сваю царкву? Вядома! Такую карціну цудоўна малюе Ісая:

> І будзе ГОСПАД весьці цябе заўсёды, і насыціць душу тваю ў зямлі сухой, і ўмацуе косткі твае. І будзеш ты як сад паліваны, і як крыніца вады, у якой не сканчваецца вада ейная. І адбудуюць [сыны] твае руіны адвечныя, ты адновіш падваліны многіх пакаленьняў, і назавуць цябе аднавіцелем выломаў, абнавіцелем шляхоў для засяленьня (Ісая 58:11-12).

Як Ісаак не шукаў сваіх шляхоў або задавальнення, ідучы ў зямлю, дзе было лягчэй, так і мы будзем падобнымі да паліванага саду і крыніцы жывой вады, у якой вада не заканчваецца! Калі мы дзейнічаем так, як хоча Бог, праз нас Ён прынясе Сваю жывую ваду сухім і спрагнелым людзям.

Бог вядзе нас да таго, каб адкрыць студні, якія свет закрыў або засмецціў. Зноў жа, тут патрэбна настойлівасць і час, магчыма, больш, чым проста некалькі гадзін, дзён, тыдняў, месяцаў або нават гадоў.

## Страта любові

Я думаю, што ў гэтай кнізе змог выразна паказаць: пустыня – гэта метафара вялікага збегу абставінаў. Паказальна, што мы апынаемся ў сітуацыях, чагосьці пазбаўленыя або перажываючы засушлівы час. Часта сігналам пустыні можа быць заняпад або поўнае знікненне энтузіазма і жадання займацца пакліканнем або нават адносінамі з Богам.

Дазвольце мне коратка прыгадаць маю другую важную пустыню, якая адбылася падчас служэння моладзевым пастарам.

Першыя дзевяць месяцаў у царкве ў Флорыдзе былі проста фантастычнымі – служэнне пашыралася, а моладзевая група расла. Я быў узрадаваны і перапоўнены сіламі і энэргіяй. Але раптам, зніадкуль, штосьці здарылася, і мая энергія і сілы высахлі.

Я праводзіў у малітве больш часу, чым раней, і мне па-ранейшаму здавалася, што я нікуды не рухаўся. Апроч гэтага, і тое бачанне, што я меў для моладзевай групы, станавілася невыразным (старое віно вылівалася). Чым болей я маліўся, тым болей згасала бачанне. Знешне нічога не мянялася, але ўнутры нешта адбывалася.

У дадатак, мы праходзілі знешнія выпрабаванні, як ніколі раней. Што з іх было самым вялікім? Мой непасрэдны начальнік збіраўся мяне звольніць. Яго сын быў у маёй групе. Аднойчы ўвечары пасля моладзевага служэння ён падышоў да маёй жонкі і сказаў: «Місіс Ліза, як мне жыць адпаведна з казанням Джона, калі мае бацькі дома робяць…?» (Няма неабходнасці называць канкрэтныя паводзіны, дастаткова сказаць, што яны былі нядобрыя).

Ліза была шакавана і мудра параіла: «Заставайся верным Слову Божаму і дай Богу заняцца тваімі бацькамі». Ад таго дня мой начальнік настроіўся знішчыць маю рэпутацыю і пазбавіцца ад мяне. Ён запусціў непрыкметную, але агрэсіўную атаку. Шаснаццаць тыдняў я не меў ніякіх зносін з пастарам і не мог з ім сустрэцца.

Праз некалькі месяцаў маніпуляцый з боку гэтага чалавека

старэйшы пастар прыняў рашэнне мяне звольніць. На нядзельным служэнні з раніцы ён зрабіў абвестку, што неўзабаве ў моладзевай групе адбудуцца значныя змены. Двое братоў пастара сказалі мне, што ў панядзелак мяне звольняць.

Бог цудоўна дзейнічаў, і нашы галоўны пастар змяніў рашэнне. Бог прамовіў да яго паміж гэтай абвесткай у нядзелю і нашай сустрэчай, прызначанай на раніцу панядзелка. Калі мы сустрэліся, ён сказаў: «Джон, Бог паслаў цябе да нас, і ты не сыдзеш, пакуль Ён не скажа, што прыйшоў час табе ісці далей».

Праз шэсць месяцаў паводзіны майго начальніка выкрылі, і яго адразу ж звольнілі з каманды служэння той царквы. Правіны былі значна больш сур’ёзнымі, чым большасць з нас магла сабе ўявіць.

У гэты час я праходзіў іншыя знешнія і ўнутраныя змаганні, якія ніколі не меў раней. Я зноў пачаў задумвацца, ці ўсё са мной добра, і пачаў вызнаваць усе грахі, якія мог прыгадаць і якія мог здзейсніць, але палёгкі не было.

Аднойчы сярод спробаў вылічыць, які ж дакладна грэх я мог здзейсніць, Госпад сказаў мне: «Ты знаходзішся ў гэтай пустыні не таму, што ты саграшыў; Я рыхтую цябе для зменаў, якія надыходзяць». Гэта было тое «новае віно», якое я апісваў у пятым раздзеле.

Калі я правёў у гэтай пустыні амаль год, Госпад даў мне жаданне ўзяць пост. Праз некалькі дзён посту з маіх вуснаў прагучала малітва, якую я абдумаў ужо пасля таго, як прамовіў. Гэты крык майго сэрца абышоў мой розум. Я палка выгукнуў: «Госпад, мне няважна: знаходжуся я ў эпіцэнтры пустыні, дзе больш нікога няма, ці прапаведую мільёнам! Я ўсё адно буду шукаць Твайго сэрца!»

Раптоўна ўнутры мяне нібы зазванілі званочкі, і я ўбачыў, што Ён рабіў! «Бог, Ты рабіў у маім сэрцы менавіта гэта, – сказаў я. – Ты прывёў мяне туды, дзе я бачу Цябе як маю спадчыну і маю першую любоў, а не служэнне ці нешта іншаае. Таму, калі прыйдуць перамены, я не зраблю з іх ідала. Я не пакіну Цябе, маю першую

любоў, і не палюблю служэнне замест Цябе. Маё сэрца застанецца прылепленым да Цябе».

Потым я прыгадаў тое, што Бог сказаў пра Давіда:

> «Знайшоў Я Давіда, сына Есэя, мужа паводле сэрца Майго, які выканае ўсю волю Маю» (Дзеі 13:22).

Дазвольце мне перафармуляваць гэты важны момант: цар Саўл ніколі не праходзіў пустыню. Ён падаваўся ўпакораным напачатку – хаваўся ў абозе ад прарока, які паставіў яго царом. Але пасля некалькіх поспехаў яго нячыстасць стала бачнай. Ён перамог у важнай бітве, але зрабіў гэта па-свойму, не паслухаўшыся Божых загадаў. Як быццам гэтага было недастаткова, ён яшчэ паставіў сабе помнік. І гэта былі толькі першыя бязбожныя ўчынкі з таго мноства, што адбыліся потым. Урэшце тая нячыстасць, якую Саўл не хацеў пакінуць, яго знішчыла.

Ёсць дзве рэчы, якія выкрываюць тое, што ўнутры вас. Агонь ачышчэння (гэта мы ўжо абмяркоўвалі) – гэта першае, а другое – гэта поспех. Поспех робіць вашу ўнутраную нячыстасць бачнай для ўсіх навокал, хоць вы пры гэтым можаце нічога і не заўважаць. На пачатку служэння многія служыцелі не дазвалялі агню ачышчэння дзейнічаць у іх жыцці. Але, як і цар Саўл, яны пакліканыя і ўрэшце ўваходзяць у служэнне. На жаль, у іх не было належнай падрыхтоўкі. Таму, калі поспех робіць бачнай іх нячыстасць, ён урэшце вядзе да зруйнавання таго, што яны пакліканыя зрабіць.

Саўл любіў сваё «служэнне» да той ступені, што быў гатовы забіць, каб толькі захаваць яго. Давід не імкнуўся да трона; ён быў чалавекам паводле сэрца Божага. У пустыні Давід знайшоў сваю сапраўдную крыніцу радасці: гэта быў Сам Бог. Давід двойчы меў магчымасць забіць Саўла, каб заняць трон, і яго людзі падбухторвалі так зрабіць. Калі б у Давіда была такая ж матывацыя, як і ў Саўла, ён забіў бы дзеля таго, што Бог паабяцаў яму праз прарока Самуэля.

Сёння ёсць людзі, гатовыя узвесці паклёп на іншых, распусціць пра іх плёткі або проста схлусіць, каб атрымаць абяцанае Богам. Толькі ўдумайцеся ў іронію сітуацыі! Яны становяцца падобнымі на Саўла, гатовыя амаль на ўсё, каб атрымаць ці захаваць сваю спадчыну. Бог шукае Давіда, які мае сэрца, скіраванае да Яго, а не да пасадаў, уплыву, грошай або славы. Перапрацоўка старых мяхоў – гэта паглыбленне Божага характару ўнутры вас і мяне. Менавіта Божы характар вытрымае ціск новага віна Духа (Яго памазанне і прысутнасць). Характар развіваецца, калі мы шукаем Таго, за Кім хочам ісці.

«Дык колькі спатрэбіцца часу?» – спытаецеся вы.

Вось што я адкажу: «Патрэбны час – не ваш клопат. Проста капайце далей, пакуль не пацячэ вада». Нярэдка здарыцца так, што адказ не прыйдзе за адну малітву. Вам трэба будзе вярнуцца да пытання ў наступнай малітве, і магчыма, нават не адзін раз.

Калі я жыў у Даласе і служыў памочнікам галоўнага пастара і яго жонкі, амаль кожную раніцу я маліўся разам з маім блізкім сябрам, малодшым пастарам. Мы пачыналі а сёмай раніцы і маліліся. Божая прысутнасць і Яго дзеянне часта адчуваліся. Аднак здаралася, што нам трэба было ўжо пачынаць працу (у 8.30), таму мы сыходзілі ў офіс. Мы адчувалі засмучанасць, бо не было ніякага прарыву… ніякіх водаў абнаўлення. Студні яшчэ не былі расчышчаныя!

На наступны ранак мы вярталіся і пачыналі адтуль, дзе спыніліся. Так працягвалася два або тры дні, а аднойчы нам спатрэбіўся цэлы тыдзень, каб прыйшлі воды абнаўлення! Аднак калі прыйшоў прарыў, мы атрымалі сілу і абнаўленне.

Калі я падарожнічаю па цэрквах Амерыкі, то сустракаю многіх хрысціян, якія адчуваюць сябе даволі камфортна, хоць і дазволілі сваім калодзежам запоўніцца смеццем. Мяне вельмі хвалюе, што такіх людзей большасць, а не меншасць. Што б адбылося, калі б гэтыя людзі аднавілі нябесны дар унутры і дазволілі яму свабодна дзейнічаць? Адбыліся б перамены ў іх жыцці, і сем’ях і цэрквах – нават ва ўсёй Амерыцы!

Вельмі часта Божы дар застаецца нявыкарыстаным і незапатрабаваным. Але Дух Божы чакае, нават калі студні засмечаны.

Працягвайце капаць! Вы знойдзеце свежыя воды ў пустыні!

11

# ПАДРЫХТУЙЦЕ ШЛЯХ ГОСПАДУ

*Бяда – заўсёды нечаканы і непрыемны госць. У руках Божых гэты злодзей і злачынца становіцца сродкам, з дапамогай якога дэманструецца звышнатуральная Божая сіла.*

**– Чарльз Стэнлі**

*Сапраўды, сапраўды кажу вам: Сын нічога ня можа рабіць Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць.*

**– Яна 5:19**



Пустыня – месца, дзе рыхтуецца шлях Госпаду, дзе кожная гара паніжаецца, а даліна – падымаецца. Ісая запамінальна апісвае гэта ў добра вядомым урыўку:

> Голас таго, хто кліча: «У пустыні рыхтуйце шлях ГОСПАДУ, праступце ў стэпе сьцежкі Богу нашаму. Кожная даліна няхай падымецца, і кожная гара і ўзгорак няхай будуць паніжаныя; і стануцца дарогі простымі, а няроўныя [шляхі] — гладкімі. І зьявіцца слава ГОСПАДА, і ўбачыць яе кожнае цела, бо вусны ГОСПАДА прамовілі [гэта]». Голас кажа: «Крычы!» А я сказаў: «Што маю крычаць?» Усякае цела — трава, і ўся слава ягоная — як кветка палявая. Высыхае трава, вяне кветка, бо вецер ГОСПАДА падзьмуў на яе. Сапраўды, народ — як трава. Высыхае трава, вяне кветка, але слова Бога нашага трывае на вякі (Ісая 40:3-8).

Што гэта дакладна значыць для тых, хто зараз праходзіць праз час пустыні?

У целе Хрыста мы ўсе маем адказнасці, якія нам даў Госпад. Але перад тым, як Бог нам дазволіць іх ажыццявіць, нам трэба выпрабаванне і навучанне ў пустыні, дзе ўкрыжоўваецца наша цела. Там мы таксама вучымся чакаць Госпада, быць ціхімі, пакуль не пачуем Яго голас і не зразумеем, што Ён робіць, каб паслухмяна выканаць Яго волю.

Я хачу падзяліцца маёй асабістай гісторыяй, каб праілюстраваць: шлях праз пустыню можа быць не толькі наўпроставы, з пункту А да пункту Б, але і са складанымі адыходамі і незапланаванымі прыпынкамі.

У 1979 г. я быў студэнтам універсітэта і нарадзіўся звыш. Праз чатыры месяцы я быў напоўнены Духам Святым, і Бог пачаў натхняць мяне на служэнне. Паверце, служэнне мяне зусім не цікавіла – я не хацеў мець з ім нічога агульнага. Мне не хацелася станавіцца падобным на служыцеляў, з якімі быў знаёмы ў дзяцінстве і юнацтве. Ведаю, што гэта гучыць як асуджэнне, але яны падаваліся людзьмі «не ад гэтага свету»: жылі ў напалову разваленых дамах і мелі дзівачных дзяцей. Пазней, вядома, я зразумеў, што такія ўражанні былі перадузятымі – насамрэч, было шмат цудоўных служыцеляў, яны жылі ў добрых дамах і мелі цудоўных дзяцей! Але тады я, наваспечаны вернік, думаў, што быць служыцелем – значыць пакутаваць або жыць у хаціне ў Афрыцы і хадзіць басанож.

Я вырас у невялікім гарадку з насельніцтвам у 3000 чалавек. Адзінымі служыцелямі, якіх я ведаў, быў каталіцкі ксёндз (не варыянт для мяне, бо яны не жэняцца) і пастар невялікай царквы. У пастара было двое дзіўнаватых дзяцей майго ўзросту. Калі я прыходзіў да іх у госці, у доме адчуваўся нейкі смурод! Аднойчы я зайшоў да іх, і там так смярдзела, што я стрымліваў дыханне, колькі мог, а потым выбачыўся і сышоў! Так што, бачыце: я быў не вельмі зацікаўлены ў служэнні. Я не хацеў быць святаром, не хацеў мець дзіўных дзяцей і смярдзючы дом. Таксама я не хацеў ехаць місіянерам у Афрыку і жыць у нейкім будане.

Тады ў *мае* планы ўваходзіла завяршыць вучобу на інжынера-механіка ва ўніверсітэце, а потым атрымаць ступень MBA ў Гарвардзе. Пасля я збіраўся працаваць у свецкіх арганізацыях, рабіць кар’еру, зарабляць шмат грошай і ахвяраваць у царкве на розныя служэнні. (У гэтым плане не было нічога кепскага, проста гэта не быў Божы план для майго жыцця).

Праз чатыры месяцы, у нядзелю раніцай, я быў у царкве і слухаў казань пастара. Дух Божы прамовіў да мяне вельмі строга: «Я паклікаў цябе прапаведаваць! Што ты збіраешся з гэтым рабіць?»

На гэты раз я ўсё выразна пачуў і адказаў: «Госпад, нават калі я басаножапынуся ў Афрыцы ў будане з травы і лісця, абяцаю прапаведаваць і быць Табе паслухмяным!» (Бог умее прыцягваць нашу ўвагу. Раней, калі Госпад падштурхоўваў мяне на гэты крок, я ўжо падлічыў, колькі гэта будзе мне каштаваць. Цяпер я цалкам разумеў, на што згаджаюся, і быў гатовы дагаджаць Яму, чаго б гэта мне ні каштавала!

Госпад пачаў мяне рыхтаваць. Ува мне загарэўся агонь, я пачаў расказваць пра Ісуса сваім суседзям у інтэрнаце, і многія з іх атрымалі збаўленне. Праз паўтара года я стаў рабіць у інтэрнаце ўрокі па вывучэнні Біблііі, куды прыходзіла моладзь з усяго студэнцкага гарадка. Кожны тыдзень новыя і новыя людзі прысвячалі жыццё Ісусу, атрымлівалі ацаленне і свабоду.

Я цалкам памяняў свае прыярытэты! Цяпер маё жаданне прапаведаваць было такім моцным, што мне хацелася кінуць вучобу на інжынера-механіка ва ўніверсітэце і пайсці ў Біблейскую школу. Навошта вывучаць матаналіз і фізіку, – разважаў я, – калі людзі паміраюць і ідуць у пекла, а я пакліканы прапаведаваць? Неўзабаве можа прыйсці Ісус, таму мне трэба як мага хутчэй ісці на нівы.

Аднойчы ўвечары я з пагардай рабіў хатняе заданне, і перавёў вочы з падручніка на Біблію. З мяне хопіць! Я кінуў падручнік па тэрмадынаміцы ў сцяну. Вырашана: я не збіраюся больш чакаць! Кідаю ўніверсітэт і іду ў Біблейскую школу!

Я пазваніў свайму настаўніку, вельмі блізкаму сябру, які быў даследчыкам ва ўніверсітэце, і адважна сказаў: «Дон, я кідаю ўсё і іду ў Біблейскую школу!»

Ён вельмі мудра адказаў: «Чаму б нам сёння не прагуляцца і не памаліцца адносна гэтага?» Так мы і зрабілі, і Бог прамовіў да мяне: «У прызначаны Мной час ты будзеш служыць... Скончы сваю вучобу на інжынера».

Пазней, калі я разважаў, якім чынам Госпад мог пасылаць хлопца з маленькага гарадка служыць народам свету, я пачуў Яго голас:

– Хто падрыхтаваў і стварыў служэнне, да якога ты пакліканы: ты ці Я?

– Ты, – быў мой адказ.

– Ці не здаецца табе, што Я больш за цябе дбаю, каб гэтае служэнне дасягнула мэты?

Я супакоіўся і працягнуў вучобу ва ўніверсітэце. Пасля ўладкаваўся на працу ў Rockwell International як інжынер-механік і браў удзел у праекце для ВМФ ЗША. Я прывык да новай працы і знайшоў цудоўную царкву. Праз год мы з Лізай ажаніліся.

Я прыйшоў у царкву халасцяком і служыў там, дзе была патрэба. Так было і пасля вяселля. Я служыў у групе парадку, удзельнічаў у турэмным служэнні, вучыў дзяцей пастара гуляць у тэніс і дапамагаў у многіх іншых справах. Таксама ў царкве была біблейская школа, таму па вечарах я наведваў заняткі.

Праз два гады царква ўзяла мяне на працу памочнікам старэйшага пастара і яго сям'і. Я сказаў пастару і іншым лідарам, што магу працаваць толькі адзін год, бо пакліканы прапаведаваць. У маю адказнасць уваходзіла мыць і запраўляць машыны, чысціць абутак пастара, выконваць даручэнні, забіраць дзяцей са школы, вучыць двух дашкольнікаў плаваць, сустракаць гасцей-служыцеляў і шмат іншых рэчаў. Я прабыў на гэтай працы не адзін, а чатыры з паловай гады.

Прайшло сем гадоў з таго моманту, як я адказаў «так» на пакліканне Бога. Ва ўніверсітэце, калі я бачыў студэнтаў, якія атрымлівалі збаўленне, ацаленне і свабоду, я думаў, што да служэння на поўны час рукой падаць. Я не ўяўляў той шлях, якім Бог павядзе мяне.

Калі я служыў у царкве, я тройчы спрабаваў перайсці ў служэнне прапаведніка на поўны час, але ўсё было беспаспяхова. Калі я ляцеў назад у Далас з Азіі (пасля трэцяй спробы зразумець, ці хоча Бог

мяне там бачыць), я чытаў Эвангелле паводле Яна і заўважыў верш, які прамовіў да мяне: «Бог *паслаў* чалавека, Яна Хрысціцеля» (Яна 1:6). Я пачуў, як Бог кажа мне:

– Ты хочаш, каб цябе *паслаў* Джон Бэвір, ці каб цябе *паслаў* Я?

– Я хачу, каб мяне паслаў Ты!

– Добра! – сказаў тады Госпад. – Бо калі цябе пашле Джон Бэвір, ты пойдзеш у сіле Джона. Калі ж цябе пашлю Я, ты пойдзеш у Маёй сіле!

Пасля гэтага я супакоіўся і засяродзіўся на працы там, дзе Бог паставіў мяне. Але праз некаторы час мой неспакой вярнуўся. Перыяд навучання ў пустыні яшчэ не быў завершаны.

Хіба Бог паклаў мяне на паліцу на тыя сем гадоў, пакуль не з’явілася патрэбная пасада? Не! Тысячу раз не! Я патрапіў у пустыню, каб сфармаваць пабожны характар, каб падрыхтаваць *Яму шлях.* Мой характар мусіў даспець, каб я добра выконваў тыя абавязкі, што чакалі мяне пазней у служэнні, да якога я быў пакліканы. Урэшце я даведаўся: перад любым духоўным «павышэннем» спачатку ідзе падрыхтоўка да гэтага ўзроўню.

## Забудзьце пра служэнне ў сваёй сіле

Якімі б добрымі ні былі нашыя намеры, без Божага ўдзелу мы не можам зрабіць нічога, што будзе мець вечную каштоўнасць – нават у імя Ісуса! Сам Госпад кажа: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: Сын нічога ня можа рабіць Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць, бо што Ён робіць, тое і Сын робіць таксама» (Ян 5:19). Якія словы! Ісус, уцелаўлёны, памазаны Божы Сын, сказаў, што *нічога* сапраўды важнага *Ён* не можа рабіць Сам. Прывяду некалькі прыкладаў, што маю на ўвазе:

Ісус любіў Лазара і дзвюх яго сцёр, Марту і Марыю, якія жылі ў Бэтаніі. Лазар моцна захварэў. Вось што адбылося пасля гэтага:

> Дык сёстры паслалі да Яго, кажучы: «Госпадзе! Вось той, з кім Ты сябруеш, нядужы». Ісус, пачуўшы, сказаў: «Гэтая нядужасьць не на сьмерць, але на славу Божую, каб Сын

> Божы быў праслаўлены праз яе». А Ісус любіў Марту, і сястру ейную, і Лазара. Калі ж пачуў, што той хворы, дык заставаўся два дні ў тым месцы, дзе знаходзіўся (Ян 11:3-6).

Нягледзячы на тое, што Ісус быў Мэсіяй, Ён меў вельмі блізкіх сяброў. Ісус любіў Лазара і з радасцю праводзіў час з гэтай сям'ёй. Але мы бачым, што Ісус нічога не рабіў на працягу двух дзён, пачуўшы пра хваробу сябра. Чаму Ён не пайшоў у Бэтанію адразу ж? Прычына ў тым, што Ён не атрымаў загада ад Бога! Ісус паслухмяна чакаў, пакуль Дух Божы не скажа ісці. І пасля гэтага Ён пайшоў туды.

Аднойчы Госпад адкрыў мне: калі б Лазар быў адным з маіх сяброў, я б адразу ж паехаў да яго дадому і ўсклаў на яго рукі, нават не падумаўшы папрасіць Духа Божага пра кіраўніцтва. На жаль, так думаюць і дзейнічаюць многія. Мы мяркуем, калі ўжо Бог заўсёды з намі, нам не трэба прасіць кіраўніцтва ў падобных сітуацыях. Але мы мусім спыніцца і прыслухацца да Духа Божага. *Бог* ведае, чаго Ён жадае, і калі мы чакаем Яго настаўленняў ці думак адносна чагосьці, Ён скажа нам, што рабіць.

Магчыма, мы думаем: калі без кіраўніцтва Духа мы ўскладаем рукі на хворых, Бог абавязаны ацаліць. Калі гэта так, ці не трэба нам пайсці ва ўсе шпіталі і вызваліць іх ад хворых?

У асобных выпадках Біблія кажа, што Ісус «ацаліў усіх», але так бывае не заўсёды. Напрыклад, чаму Ісус каля сажалкі ў Бэтэздзе не аздаравіў хворых, сляпых, кульгавых і спаралізаваных, але ацаліў толькі аднаго чалавека, які хварэў трыццаць восем гадоў (Ян 5)?

У іншым выпадку быў чалавек, кульгавы ад нараджэння, якога штодня садзілі ля брамы храма. Безумоўна, Ісус праходзіў каля яго кожны раз, калі ішоў у храм. Чаму Ісус не ацаліў яго? *Бо Айцец не даў Яму настаўлення гэта зрабіць.*

Пасля таго, як Ісус узышоў на неба, Пётр і Ян, ідучы ў храм, ацалілі гэтага чалавека па натхненні ад Духа, пасля чаго пачалося абуджэнне (Дзеі 3).

Калі Ісус служыў, не было вызначаных формул ацалення: Ісус мог плюнуць, ускласці рукі або проста прамовіць. Аднойчы Ён зрабіў шарыкі з бруду і паклаў іх чалавеку на вочы. Кагосьці Ён адпраўляў да святароў. Гэты спіс можна працягваць. Ісус рабіў толькі тое, што бачыў у Айца, і таму мы назіраем такую разнастайнасць! Бог ведаў дасканалы час і спосаб, у які кожны чалавек мог атрымаць ацаленне.

Бог жадае для ўсіх Сваіх слуг аднаго: прывесці ў тое месца, дзе мы будзем рабіць не тое, што лічым патрэбным, а толькі тое, што бачылі ў Ісуса, і пад Яго кіраўніцтвам. Ісус кажа ў Яна 20:21: «Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас». Ісус нічога не рабіў без кіраўніцтва Айца. Гэтаксама і нам трэба трымацца прыкладу Ісуса. Мы павінны жыць, як Ён, пад кіраўніцтвам Духа Святога; ісці так, як толькі Ён можа нас весці. Дзеля гэтага наша цела павінна падпарадкавацца Божаму Духу, Духу Хрыста. І найлепшая навучальная пляцоўка для жыцця пад кіраўніцтвам Духа – гэта пустыня. Яе складаныя ўмовы – месца, дзе рыхтуецца шлях Госпаду.

Праз сорак год навучання ў пустыні Бог сказаў Майсею:

> «І цяпер ідзі, і Я пашлю цябе да фараона; і выведзі з Эгіпту народ Мой, сыноў Ізраіля». І сказаў Майсей Богу: «Хто я, каб мне ісьці да фараона і каб мне вывесьці сыноў Ізраіля з Эгіпту?» І сказаў [Бог]: «Бо Я буду з табою. І вось табе знак, што Я паслаў цябе: калі ты выведзеш народ з Эгіпту, будзеце служыць Богу на гэтай гары» (Выхад 3:10-12).

Параўнаем з тым, што Бог кажа пра людзей, якія паслалі сябе самі:

> «Я не пасылаў прарокаў гэтых, а яны [самі] пабеглі. Я не прамаўляў да іх, а яны прарочаць... Вось, Я — супраць прарокаў са снамі фальшывымі, кажа ГОСПАД, яны распавядаюць іх і падманваюць народ Мой хлусьнёй сваёй і махлярствам сваім. Я не пасылаў іх і не загадваў ім; і няма ад іх карысьці для народу гэтага, кажа ГОСПАД» (Ярэмія 23:21, 32).

Гэта балюча. Ніхто не хоча пачуць такія словы ад Госпада.

Калі Майсею было сорак, ён не мог дапамагчы або *прынесці карысць* дзецям Ізраіля, калі паспрабаваў вызваліць іх, таму што *Бог яшчэ не паслаў яго.* З усёй цудоўнай адукацыяй, лідарскімі навыкамі і мудрасцю, атрыманымі Майсеем у Эгіпце, без Божай падтрымкі і правільнага часу Майсей не мог выканаць тое, да чаго – *ён ведаў гэта* – яго паклікаў Бог. Марныя намаганні прывялі да смерці толькі аднаго прыгнятальніка-эгіпцяніна. Хоць намеры Майсея былі высакароднымі, аднак першыя спробы выканаць місію нарабілі больш шкоды, чым дабра. Праз сорак год вучобы ў далёкім кутку пустыні паўстаў новы Майсей, які рабіў толькі тое, што казаў Бог. Цяпер, у вызначаны Богам час, Майсей выратуе народ, а войска Егіпта загіне на дне Чырвонага мора. Вось розніца паміж нашай сілай і Божай: цэлае войска ў параўнанні з адным жаўнерам.

Ян Хрысціцель трыццаць год рыхтаваўся да служэння, якое доўжылася ўсяго шэсць месяцаў, але Ісус сказаў, што Ян быў найвялікшым прарокам, народжаным жанчынай.

Вось яно! За шэсць месяцаў Бог можа зрабіць праз мужчыну ці жанчыну, *пасланых Ім*, больш, чым нехта, хто будзе працаваць *сваёй сілай* цэлыя шэсцьдзясят год!

Менавіта гэта тлумачыць Ісус: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: Сын нічога ня можа рабіць Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць, бо што Ён робіць, тое і Сын робіць таксама…» (Ян 5:19).

Прыслухаемся зноў да словаў Ісаі:

> Голас таго, хто кліча: «У пустыні рыхтуйце шлях ГОСПАДУ,
> прастуйце ў стэпе сьцежкі Богу нашаму. Кожная даліна няхай
> падымецца, і кожная гара і ўзгорак няхай будуць паніжаныя;
> і стануцца дарогі простымі, а няроўныя [шляхі] — гладкімі.
> І зьявіцца слава ГОСПАДА, і ўбачыць яе кожнае цела, бо
> вусны ГОСПАДА прамовілі [гэта]». Голас кажа: «Крычы!» А я
> сказаў: «Што маю крычаць?» Усякае цела — трава, і ўся слава

> ягоная — як кветка палявая. Высыхае трава, вяне кветка, бо вецер ГОСПАДА падзьмуў на яе. Сапраўды, народ — як трава. Высыхае трава, вяне кветка, але слова Бога нашага трывае на вякі (Ісая 40:3-8).

Бог кажа, што пустыня – месца, дзе рыхтуецца шлях Госпаду. Шлях Госпаду робіцца не сілай чалавека. Бог кажа, што пыха цела панізіцца, сціплыя (тыя, хто чакае Госпада) будуць узвышаны, звілістыя (падманлівыя, недагледжаныя, няшчырыя) месцы выпрастуюцца, а няроўныя (без любові, грубыя, суровыя) шляхі стануць гладкімі.

Будучы студэнтам каледжа і нованавернутым вучнем Ісуса, я атрымаў шмат дабраславенняў і меў «поспех» у служэнні іншым, але ў маім жыцці былі горы, якія трэба было панізіць, а таксама і звілістыя і няроўныя дарогі, якія трэба было выпрастаць і зрабіць гладкімі. Бог ведаў, што мне патрэбны час у пустыні, каб выправіць некаторыя недахопы.

У любы перыяд пустыні важна дазваляць Богу рабіць у нашым жыцці тое, што Ён хоча. Калі я быў на пасадзе памочніка пастара ў Даласе, Госпад аднойчы сказаў: «Джон, не прапусці тое, што Я хачу зрабіць у табе сёння, у пошуках служэння прапаведніка, якое будзе заўтра». Шчыра кажучы, я так моцна хацеў прапаведаваць, што лічыў той этап жыцця марнаваннем часу.

Не трэба пападацца ў такую пастку! Зразумейце, што Бог не *марнуе часу!* Ён *адкупляе час*! Трэба разумець: месца, дзе вы цяпер знаходзіцеся, - гэта важная частка таго, куды вы кіруецеся. Гэта пляцоўка для вашага навучання. Гэта працэс пераходу ад абяцання да павышэння, гэта рэалізацыя. Дазвольце Богу думаць, як усё атрымаецца і збярэцца… Вам трэба проста ісці разам з Ім! Ён Бог, Начальнік і Завяршыцель усяго. Нам трэба проста давяраць Яму і слухацца таго, што Ён паказвае нам *сёння!*

Кожны раз, калі мне здавалася, што я вылічыў, як Бог прывядзе мяне ў служэнне Слова і пропаведзі, Ён казаў мне: «Джон, ты толькі

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 11. Не распакоўвайце чамаданы.**

Хоць я такога не раіў бы, але калі пустыня цягнецца вельмі доўга, вы можаце вырашыць распакаваць чамаданы і пасяліцца ў новым месцы. Паверце, калі Бог вырашыць рухацца, Ён можа зрабіць гэта надзвычай хутка. Зірніце на Язэпа: падавалася, ён будзе ў падзямеллі да канца жыцця, але раптам, цалкам нечакана, за адзін дзень ён атрымаў павышэнне і спаўненне мары, дадзенай Богам! Так, правільна, усяго за адзін дзень!

Я быў у пустыні, і мне думалася, што я правёў там сорак год. Потым, як быццам з ніадкуль, Госпад сказаў мне, што я пакіну пасаду і буду падарожнічаць і выступаць. Перамены не адбыліся імгненна, але калі яны прыйшлі, былі як віхура. І я быў гатовы ўвайсці ў наступны перыяд паклікання. Мае чамаданы былі сабраныя.

што вылічыў яшчэ адзін спосаб, якім гэта не адбудзецца!» І праўда: Ён даў мне служэнне цалкам нечакана. Бог прыводзіць нас у месца задаволенасці (але не самазадаволенасці), каб мы маглі ў поўні жыць у цяперашнім моманце.

## Усё рабіць цалкам у Божы спосаб

Калі Бог дае Сваю ўладу і сілу чалавеку, то, чым большыя дараваныя ўлада і сіла, тым большым будзе суд за непаслухмянасць Божаму Духу. Бог не судзіў Майсея ў сорак год, калі той зрабіў нешта па-свойму, бо Божая ўлада і сіла яшчэ не былі на ім. Пазней было па-іншаму. У пустыні Зін народ спрачаўся з Майсеем і скардзіўся на месца, куды іх прывёў Майсей. Людзі сасмяглі і хацелі вады. Таму Бог сказаў Майсею, што трэба зрабіць:

> І прамовіў ГОСПАД да Майсея, кажучы: «Вазьмі кій і зьбярыце грамаду, ты і Аарон, брат твой, і прамоўце да скалы перад вачыма іхнімі, і яна дасьць ваду. І ты выведзеш ваду са скалы, і напоіш грамаду і жывёлу ейную» (Лікі 20:7-8).

Бог сказаў Майсею прамовіць да скалы, каб тая дала ваду. Але вось што зрабіў Майсей:

> І падняў Майсей руку сваю, і ўдарыў скалу кіем сваім два разы. І выцякла шмат вады, і напілася грамада і жывёла іх. І сказаў ГОСПАД Майсею і Аарону: «За тое, што вы не паверылі Мне, каб выявіць сьвятасьць Маю перад вачыма сыноў Ізраіля, вы не ўвядзіцё царкву гэтую ў зямлю, якую Я даў ім» (Лікі 20:11-12).

Заўважце: Бог даў ваду на вачах у мільёнаў людзей. Нішто сабе! Вада са скалы: ці чулі вы пра такія цуды ў дваццаць першым стагоддзі? Хоць Майсей і аслухаўся Божага настаўленняў у тым, як здабыць ваду са скалы, цуд усё адно адбыўся. Бог даў ваду ў адказ на патрэбу народа. Бог не забраў ваду ў людзей, каб пакараць Майсея. Але наступствы былі: Бог не дазволіў Майсею ўвайсці разам з народам у Абяцаную Зямлю.

Гэта выдатны прыклад, як звышнатуральнае памазанне Бога служыць патрэбам людзей, а не ўзвышэнню таго, хто мае гэты дар! Магчыма, Майсей быў расстроены з-за паводзін народа і трохі расстроены, што Бог даручыў весці такі непаслухмяны народ. Майсей ударыў скалу, як рабіў гэта раней, у пустыні Сін (Выхад 17:1-7). Магчыма, ён прывык да сваёй здольнасці весці народ, можа быць, яму здавалася, што Бог ушануе прынятае ім рашэнне. Ён зноў зрабіў нешта па-свойму, але цяпер наступствы былі значна больш сур’ёзнымі. Майсей хадзіў у сіле Божай: уся яго сіла ішла ад спадзявання на Бога. Рашэнне, прынятае Майсеем перад аблічам

усяго народа незалежна ад Бога, прынесла хуткі суд.

Вось чаму ў Якуба 3:1 напісана: «Ня многія рабіцеся настаўнікамі, браты мае, ведаючы, што мы большы атрымаем прысуд». Чым большая адказнасць ці слава, тым большы суд.

Пустыня рыхтуе нас хадзіць у сіле і славе Госпада так, каб не напаткаў далейшы суд за непаслухмянасць. У сухія часы пустыні наша пыха паніжаецца, а ўпакоранасць павышаецца. Сапраўды ўпакораны чалавек ходзіць так, як хадзіў Ісус, кажучы: «Не буду рабіць нічога, пакуль не ўбачу, што гэта робіць Дух Госпада. Мая сіла і здольнасць — нішто».

Магчыма, прычына, па якой Бог утрымлівае праяўленне Сваёй славы і сілы ў сучаснай царкве, палягае ў тым, каб абараніць нас ад большага суду. Я веру, што менавіта ў пустыні Ён раздзяляе цела і дух, каб мы пачалі крычаць да Яго і слухацца Яго. Потым, калі праявіцца Яго слава, мы прынясём славу Яго імені, робячы ўсё толькі ў *Яго спосаб!*

Паслухайце голас Духа. Дазвольце Яму паказаць, якога выканання даверанай вам працы Ён чакае ад вас. Паглядзіце і паслухайце, што робіць і кажа Госпад.

На варце маёй я стану, і ўзыйду на вежу, і буду выглядаць, каб убачыць, што Ён прамовіць да мяне і што Ён адкажа на скаргу маю. І адказаў мне ГОСПАД, і сказаў: «Запішы відзеж і патлумач на табліцах, каб чытач лёгка мог [зразумець] гэта. Бо відзеж [датычыць] вызначанага часу, і датычыць канца, і не падмане; хоць ён марудзіць, чакай на яго, бо ён, прыходзячы, прыйдзе, ня спозьніцца. Вось, у ганарыстага няшчырая душа ягоная ў ім, а праведны з веры сваёй жыць будзе (Абакум 2:1-4).

Прарок сказаў: «Буду выглядаць, каб убачыць, што Бог прамовіць да мяне». Відзежы — адзін са спосабаў, у які прамаўляе Божы Дух. Ісус гаварыў, што робіць толькі тое, што *бачыў* у Айца. Абакум збіраўся запісаць тое, што ўбачыць, і пабяжаць з убачаным у прызначаны час, і працягвае: душа ганарыстага чалавека няшчырая.

Гэта значыць, што чалавек не чакае Слова Госпада, але бяжыць, не ведаючы, што кажа Бог. Але праведны будзе жыць са сваёй веры, а не з веры іншага!

Вера прыходзіць праз слуханне, што кажа Бог, і праз выкананне гэтага. Вось чаму Бог прывёў дзяцей Ізраіля ў пустыню: «… каб даць зразумець табе, што ня толькі хлебам жыве чалавек, але кожным [словам], якое *выходзіць* з вуснаў ГОСПАДА, будзе жыць чалавек» (Другазаконне 8:3). Звярніце ўвагу: Бог кажа «выходзіць», а не «выйшла».

Мы знаходзім натхненне для сябе: «Глядзіце, не адвярніцеся ад Таго, Які гаворыць [цяперашні час]. Бо калі не ўцяклі тыя, што адвярнуліся ад таго, які прамаўляў на зямлі, тым больш мы, калі адкінем Таго, Які з неба» (Гебраям 12:25). Але ніколі не забывайце: тое, што кажа Бог, заўсёды адпавядае Пісанню.

Шукаць у Бібліі падтрымкі для таго, што *вы* лічыце неабходным, — не Божы шлях. Ісус мог бы сказаць Сабе: «Я памазаны ацаляць хворых, таму адразу пайду і ўскладу рукі на Лазара, як Я рабіў раней з іншымі». Замест гэтага Ісус чакаў, каб Божы Дух пачаў дзейнічаць, і толькі тады пайшоў да Лазара.

Пустыня – месца, куды Бог нас прыводзіць, каб навучыць: любая спроба зрабіць што-небудзь для Яго без Яго кіраўніцтва і здольнасці, — марнасць. Калі мы разумеем: цела не можа зрабіць нічога сапраўды каштоўнага, мы гатовы выканаць тыя мары і планы, якія Бог нам даверыў. Пустыня – гэта падрыхтоўчы працэс для выканання абяцання. Будзем наследаваць прыклад Ісуса ў тым, каб чакаць кіраўніцтва Духа і рабіць усё ў *Божы* спосаб, а не ў *наш спосаб*.

12

# ПЕРАМОГА Ў ПУСТЫНІ

*Наш смутак, як і мы, — смяротны. Бессмяротныя душы не маюць бессмяротнага смутку. Ён прыходзіць, але – няхай будзе дабраславёны наш Бог – ён і сыходзіць. Як птушкі нябесныя, смутак мінае нас і не можа стварыць прытулак у нашай душы. Мы пакутуем сёння, але ўзрадуемся заўтра.*

**– Чарльз Спэрджэн**

*Без [прароцкага] відзежу народ неакелзаны, а хто захоўвае закон, той шчасьлівы.*

**– Прыповесці 29:18**

Пустыня – гэта месца, якое мы праходзім, а не канцавы пункт прызначэння! Калі прайсці яе правільна, то вы атрымаеце перамогу ў пустыні і выйдзеце адтуль!

У адной з пустынь, калі быў моладзевым пастарам, я згубіў агонь. Засушлівы час падаваўся мне занадта доўгім. Я пачаў думаць, ці зменіцца штосьці ўвогуле. Аднойчы, незадоўга да таго, як пачаліся праблемы з маім непасрэдным начальнікам, які спрабаваў мяне дыскрэдытаваць і звольніць, Божы Дух паказаў мне, што перамены прыйдуць. Менавіта тады Бог паказаў, што «пашле мяне ў цэрквы і гарады ад усходняга да заходняга ўзбярэжжа Амерыкі, ад Канады да Мексікі, на Аляску і Гаваі…»

Але, як я ўжо згадваў, гэта не адбылося на наступны дзень ці нават на наступны тыдзень! Прайшло паўгады, перш чым я атрымаў дадатковае пацверджанне. Потым наш старэйшы пастар прыйшоў на сустрэчу і сказаў, што Госпад паказаў яму, што адзін з яго пастароў (нас было адзінаццаць) неўзабаве будзе падарожнічаць і служыць на поўны час, і больш не будзе працаваць у яго царкве. «Джон Бэвір, гэта ты», – сказаў ён.

Прайшло яшчэ паўгады, калі казаць дакладна, час у пустыні. А потым, усяго за тры тыдні, я атрымаў сем запрашэнняў прапаведаваць: адно было з царквы за гадзіну ад мяжы з Канадай; другое – з царквы на ўсходнім ўзбярэжжы Фларыды;

трэцяе – з супольнасці, адкуль да Ціхага акіяну была гадзіна язды на машыне, а чацвёртае – з царквы на мяжы з Мексікай! Я прыйшоў у офіс пастара, каб спытацца, што мне рабіць, а ён рассмяяўся і адказаў: «Джон, я казаў, што Госпад мне гэта адкрыў. Відаць, прыйшоў твой час».

Неўзабаве (у студзені 1990 г.) за нас з Лізай памаліліся на адмысловым служэнні, пастар усклаў на нас рукі, і мы сталі вандроўнымі прапаведнікамі! З упэўненасцю скажу, што мы ўбачылі *нашмат* (і я наўмысна раблю акцэнт на слове «нашмат») больш плоду ў жыцці, дзякуючы таму, што чакалі Божага часу, а не кінуліся ў служэнне, калі я лічыў сябе гатовым.

Я прагну бачыць тыя ж вынікі і ў вашым пакліканні і служэнні. Вось чаму я, шасцідзесяцігадовы чалавек, які ўсім сэрцам любіць народ Божы, быў з вамі максімальна шчырым і да болю адкрытым. Я хачу, каб ваш лёс быў паспяховы! Таму дазвольце ў завяршэнне кнігі падзяліцца некалькімі важнымі думкамі.

## Правільная мэта і правільны пункт прызначэння

Мы павінны засяроджвацца на мэтах Божых, а не на тым супраціўленні, якое сустракаецца на шляху, каб не даць нам ісці наперад. Калі мы хочам апынуцца ў правільным пункце прызначэння, трэба мець правільнае бачанне! Было б жахліва прабегчы гонку і перасячы не тую фінішную прамую! Скіраваць зброю ў няправільную мішэнь і выстраліць у яе – гэта трагедыя!

Фарысеі мелі вялікі імпэт і былі стараннымі, але іх мэта была ў іх саміх. Яны не мелі правільнага бачання, таму не пацэлілі ў мішэнь.

Якую мэту і прызначэнне Бог мае для нас як для Свайго народа? У Эфэсцам 1:11 Ён кажа, што мы былі «…прадвызначаныя на гэта паводле вызначэньня Таго, Хто ўсё зьдзяйсьняе паводле жаданьня волі Сваёй».

Многія людзі спатыкаюцца, калі чуюць слова «прадвызначаныя»

або «прадвызначэнне». Каб зразумець гэтую ідэю, нам трэба разгледзець сэнс слова па частках. Прыстаўка «прад» проста значыць «перад» або «да пачатку». Корань «вызначэнне» гаворыць пра «тое, дзе вы апынецеся» або пра «фінішную прамую». Калі мы складаем гэтыя два значэнні, то слова перадае наступную ідэю: «вызначыць фініш да старту». Таму Эфэсцам 1:11 паказвае, што Бог вызначыў пункт прызначэння для чалавецтва яшчэ да нашага стварэння. Гэтае прызначэнне патрэбна, каб выканаць Яго мэту.

У Рымлянам 8:28-29 напісана:

> А мы ведаем, што тым, якія любяць Бога, пакліканым паводле [Яго] вызначэньня, усё дапамагае на дабро. Бо тым, каго наперад ведаў, Ён і прадвызначыў быць падобнымі да вобразу Сына Ягонага, каб Ён быў Першародны між многімі братамі.

Вось у чым палягае наш пункт прызначэння, запланаваны Богам да пачатку часоў: тыя, хто любіць Бога, пераменяецца на вобраз Ісуса Хрыста. Усё, што мы робім у жыцці і служэнні, мусіць быць скіраванае да гэтай мэты і гэтага выніку! Найпершая Божая мэта, з якой Бог стварыў чалавека, палягала не ў тым, каб вы проста маглі далучыцца да паспяховага служэння, ахвяраваць мільёны долараў на справу Валадарства, стаць вядомым мастаком або дасягнуць нейкай іншай кар’ернай вышыні. Яна не палягала ў ацаленні хворых, аказанні гуманітарнай дапамогі, выратаванні ахвяр гандлю людзьмі, вызваленні залежных і заваяванні згубленых душ для Ісуса. Якімі б высокімі і пабожнымі ні былі мэты, нам трэба  разумець: так рабілі многія іншыя людзі, але не дасягнулі фінішу. Яны не дабеглі туды па той прычыне, што засяродзіліся на служэнні, а не на мэце ці сэрцы, якое за гэтым стаіць!

Цяпер трэба адказаць на наступнае пытанне: «З якой мэтай Бог прадвызначыў нам пераменяцца на вобраз Ісуса Хрыста?» Адказ

просты: бо Ён любіць нас і хоча мець з намі адносіны, каб «зьявіць у вяках, якія прыходзяць, бязьмернасьць багацьця ласкі Сваёй у ласкавасьці да нас у Хрысьце Ісусе» (Эфэсцам 2:7).

У нас з Лізай ёсць сабака па мянушцы Лексі. Ён цудоўны, гуллівы і забаўны. Але мы камунікуем з ім на абмежаваным узроўні. Часам мяне засмучае, што я не магу з ім нармальна паразмаўляць. З іншага боку, з нашымі сынамі ўсё па-іншаму. Калі яны падраслі, у нас былі цудоўныя размовы, што прынесла вельмі шмат добрага ў наша жыццё. Вось чаму Бог нас стварыў. Ён не хоча адносінаў нізкага ўзроўню, як у мяне з Лексі. Ён хоча мець сыноў і дочак, з якімі можна мець шчырыя, глыбокія стасункі.

Такой была Яго мэта ад самага пачатку. Калі Бог стварыў чалавека і змясціў у Эдэмскім садзе, Госпад хадзіў там і меў адносіны з Адамам, бо любіў яго. Адзін з нашчадкаў Адама зразумеў мэту Божую, і пра яго напісана: «І хадзіў Энох з Богам, і ня стала яго, бо забраў яго Бог» (Быцьцё 5:24). Аўтар Ліста да Гебраяў кажа пра Эноха, што «…было засьведчана, што ён спадабаўся Богу» (Гебраям 11:5). Чаму Энох спадабаўся Богу? Праз нейкае вялікае служэнне? Не. Толькі таму, што хадзіў з Богам і меў блізкія стасункі з Ім.

Усё, што Бог рабіў у мінулым, робіць цяпер і зробіць у будучыні – дзеля гэтай прычыны. Таму мэта пустыні – скіраваць нас у напрамку таго, каб пераменяцца на вобраз Ісуса Хрыста.

Калі мы губляем з віду Божую мэту для нас, мы адкідаем стрыманасць і перажываем духоўны рэгрэс. Царква, губляючы з віду Божую мэту, перасыхае, становіцца проста арганізацыяй, якая выконвае звычайныя справы і падкрэслівае вынікі – большую колькасць людзей і большыя будынкі, а не з'яўленне вучняў, перамененых на вобраз Хрыста (Мацвея 28:19).

Давайце перачытаем Прыповесці 29:18: «Без [прароцкага] відзежу народ неакелзаны».

Неакелзанасць, пра якую кажа Бог, вядзе да таго, што мы задавальняемся пакліканнем нізкага ўзроўню, які не дасягае мэты

перамянення на Яго вобраз і падабенства. Неакелзанасць не дазваляе нам быць задаволенымі, пакуль мы не пераменімся на Яго вобраз і не ўбачым Яго аблічча да аблічча, пакуль не ўбачым Яго славу. Неакелзанасць вядзе да таго, што мы прымаем нешта меньшае за дасканалую Божую волю. Яна падштурхоўвае нас расслабіцца і рабіць усё так, як робіць свет і цела.

Кажучы пра бачанне, Ісус заўважыў: «Сьветач цела ёсьць вока. Калі вока тваё чыстае, усё цела тваё будзе сьветлае. Калі ж вока тваё злое, усё цела тваё будзе цёмным. Калі ж сьвятло, якое ў табе, ёсьць цемра, дык якая ж цемра сама?» (Мацвея 6:22-23). Ён не кажа пра нашы фізічныя вочы, але пра вочы сэрца – як мы бачым і ўспрымаем розныя рэчы.

Як вы бачыце розныя рэчы ў сэрцы, такім вы і станеце: «…бо якія думкі ў сэрцы ягоным, такі і ён» (Прыповесці 23:7).

Тое, як вы бачыце абставіны вакол, вызначае як вы праз іх пройдзеце. Дванаццаць выведнікаў пайшлі агледзець Абяцаную Зямлю і ўбачылі тое самае: умацаваныя гарады, вялікіх жыхароў, войскі хананейцаў. Але двое з іх – Егошуа і Халеў – убачылі ўсё гэта абсалютна па-іншаму, не так, як астатнія дзесяць. Гэтыя двое ўбачылі ўсё так, як гэта бачыў Бог, а дзесяцера бачылі Абяцаную Зямлю вачыма чалавечага досведу, сваіх здольнасцяў і сілы. Такое бачанне было кепскім, таму іх паводзіны ў іншым, (як казаў Ісус, «усё цела») таксама былі кепскімі. Іх словы і дзеянні пярэчылі Божай волі, і Бог назваў іх вестку «злой» або «кепскай»:

Скажы ім: “Як жывы Я, кажа ГОСПАД. Як вы гаварылі, гэтак Я зраблю вам! У гэтай пустыні пападаюць трупы вашыя! Усе палічаныя, якія наракалі на Мяне, ад дваццаці гадоў і вышэй, паводле падліку. Ня ўвойдзеце вы ў зямлю, на якой Я, падымаючы руку Маю, запрысяг пасяліць вас, апрача Халева, сына Ефунны, і Егошуа, сына Нуна” (Лікі 14:28-30).

Што прымусіла дзесяцярых выведнікаў прынесці вестку, праз якую яны не ўбачаць абяцанай Богам зямлі? Тое, як яны ўспрынялі

ўбачанае, не было прароцкім бачаннем; іх бачанне было фізічным. Яны дакладна перадалі тое, што ўбачылі.

Каб прайсці праз пустыню пераможна, мы мусім бачыць усё так, як бачыць Бог. Да таго, як Бог сказаў пасланць выведнікаў у Абяцаную Зямлю, народ Ізраіля скардзіўся ўжо больш за год. Людзі абралі няправільны пункт гледжання, і ўся іх неакелзанасць была тут як тут. Яшчэ да моманту, калі Бог дазволіў ім агледзець зямлю, якая ацякала малаком і мёдам, яны адмовіліся ад усяго добрага, што бачылі, і засяродзіліся на веліканах, што жылі ў той зямлі.

Чалавек, які бачыць толькі пустыню і складанасці, звязаныя з ёй, памрэ ў пустыні. Чалавек, які глядзіць на Таго, Хто абяцаў, і на дадзенае Богам бачанне, пройдзе праз пустыню як святы ваяр, гатовы завалодаць Абяцанай Зямлёй і пасяліцца ў ёй на Божую славу.

> Дзеля гэтага мы не журымся [не адкідаем нормы, якія стрымліваюць нас]… Бо гэты караценькі лёгкі прыгнёт наш робіць яшчэ большай і большай вагу славы вечнае для нас, якія глядзім не на бачнае, але на нябачнае, бо бачнае — часовае, а нябачнае [уменне бачыць усё так, як гэта робіць Бог]… — вечнае (2 Карынцянам 4:16-18).

Час і пакуты ў пустыні ў параўнанні з тым, што мы атрымаем, лічацца караценькім лёгкім прыгнётам. Вядома, пустыню цяжка лічыць простай і лёгкай, калі вы не маеце бачання таго, што адбудзецца пасля выхаду з яе.

Калі я раней перажываў засушлівыя часы, яны не падаваліся мне «караценькімі». Часам я думаў: *«Ці скончыцца гэта калісьці? Ці адбудзецца некалі тое, што абяцаў Бог?»* — тады я адкідаў такія думкі і натхняўся Госпадам. Я прыгадваў прароцтвы, якія абвяшчаліся пра маё жыццё, і з іх дапамогай вёў моцнае змаганне (гл.1 Цімафею 1:18). Гэтыя прароцтвы былі бачаннем Бога для майго жыцця, як Ён адкрыў мне Духам Святым праз Сваё Слова.

Поле бітвы ў пустыні – гэта наша душа. Душа – гэта ваш інтэлект, эмоцыі і воля. *Воля* – тая частка вашай душы, якая вырашае: вы абяраце шлях Божы ці шлях цела, вы будзеце бачыць усё так, як бачыць Бог, ці звернеце вялікую ўвагу на свае пакуты ў пустыні. Пётр піша: «Улюбёныя, прашу вас, як прыхадняў і вандроўнікаў, высьцерагайцеся цялесных пажаданьняў, якія змагаюцца супраць душы» (1 Пятра 2:11).

Усё зводзіцца да таго, хто знаходзіцца ў цэнтры вашай увагі: Госпад ці вы? Цялесныя жаданні, якія змагаюцца ў вашым розуме і эмоцыях, будуць засяроджвацца на асабістых, эгаістычных інтарэсах. Яны будуць адцягваць вас ад Божага бачання, бо шлях Божы – гэта не шлях эгаізма, але шлях *самавырачэння*.

Сёння прапаведуецца і прымаецца многімі Эвангелле бесклапотнасці. Многія распаўсюджаныя сярод хрысціян ідэі не заклікаюць нас укрыжоўваць цела, але, хутчэй, задавальняць жаданні і патураць ім, хоць яны і паўстаюць супраць найвышэйшай мэты —перамянення на вобраз Ісуса Хрыста. Часта мы факусуемся на тым, што можа зрабіць для нас Бог, замест таго, што Ён жадае ад нас. Эвангелле бесклапотнасці не падкрэслівае рэальнасці пакутаў, якія сустракаюцца на шляху за Хрыстом. Яно прывяло да таго, што вельмі многія абралі лад жыцця самазадаволенасці. Такое «эвангелле» не рыхтуе вернікаў быць ваярамі Божымі.

Апостал Павал закранае гэтую тэму ў сваім лісце да вучня Цімафея:

> Дык пераносься злыбеды, як добры жаўнер Ісуса Хрыста. Ніхто з тых, хто змагаецца, ня зьвязвае сябе справамі жыцьцёвымі, каб падабацца таму, хто яго ўзяў у войска (2 Цімафею 2:3-4).

Калі мы сутыкаемся з супрацьстаяннем ці складанасцямі, то «эвангелле бесклапотнасці» прымушае нас шукаць шляхі абыходу, а не супрацьстаяць складанасцям і ісці наперад. Бачанне, якое

## Парады па выжыванні ў пустыні

**# 12. Запамінайце і вучыцеся.**

Зараз, калі я пішу гэтыя радкі, мне ўжо 59 гадоў – калі гэта здарылася? Азіраючыся, я разумею, што часы пустыні былі часамі самага вялікага росту ў жыцці, хоць перыядычна мне здавалася, што я не іду наперад, але адступаю. Вось чаму наш стары сябар Ёў сказаў: «Але вось, я іду… і няма Яго… А Ён ведае шлях мой, і няхай выспрабуе мяне, выйду я [чысты], як золата» (Ёў 23:10).

Па праўдзе кажучы, я б сказаў, што даведаўся дзевяноста працэнтаў таго, што пазней увайшло ў мае кнігі (а іх цяпер ужо дваццаць) не ў часы багацця і спакою, але ў засушлівыя часы пустыні. Таму я параю вам наступнае: запамінайце і вучыцеся ў пустыні! Тое, чаму вы навучыцеся ў гэты перыяд, можа стаць вялікай сілай для іншых (у тым ліку і для вас у далейшым). І хто ведае… магчыма, аднойчы вы напішаце кнігу пра свой досвед!

Сябры, зараз я хачу вам прарочыць. Прыслухайцеся да таго, што я вам скажу: *у Божы час Ён зробіць у вашым жыцці нешта глыбокае і цудоўнае, што паўплывае на жыццё многіх іншых людзей. Гэта адбудзецца, калі вы дазволіце Яму дасягнуць Яго мэтаў у часе вашай пустыні. Гэта паўплывае на многіх людзей, і вы будзеце радавацца ўсю вечнасць, калі будзеце бачыць плод сваёй паслухмянасці. Сябры, вы выйдзеце як золата: выпрабаваныя, моцныя і чыстыя.*

нараджаецца з вучэнняў эвангелля бесклапотнасці – гэта не «нябеснае або прароцкае бачанне», але «эгаістычнае бачанне».

Таксама Павал піша:

> «Адгэтуль, валадару Агрыпа, я ня быў непаслухмяным відзежу нябеснаму, але абвяшчаў спачатку жыхарам Дамаску і Ерусаліму, а пасьля ўсёй краіны Юдэйскай і паганам, каб навярнуліся і зьвярнуліся да Бога, робячы ўчынкі, вартыя навяртаньня. За гэта Юдэі спрабавалі забіць мяне, схапіўшы ў сьвятыні» (Дзеі 26:19-21).

У свеце многа розных бачанняў, але толькі адзін «відзеж (або бачанне) нябесны», які ёсць воляй Айца! Звярніце ўвагу, што Павал кажа: «Некаторыя юдэі схапілі мяне ў храме за пропаведзь аб гэтым, і спрабавалі мяне забіць». Ён быў паслухмяным нябеснаму відзежу і сутыкнуўся з вялікім супрацьстаяннем. Калі б ён верыў у эвангельле бесклапотнасці і лёгкасці, як многія прапаведуюць і вераць сёння, ён ніколі б не ўбачыў ажыццяўлення гэтага бачання. Ён нават не дайшоў бы да цара Агрыпы, бо задоўга да таго знайшоў бы спосаб уцячы ад усяго супрацьстаяння, з якім сутыкаўся.

Ярэмія быў яшчэ адным біблейскім героем, які трымаўся нябеснага бачання і, у выніку паслухмянасці, сутыкнуўся з моцным пераследам. Аднойчы ён стаміўся і пачаў крыху скардзіцца: «Чаму шлях бязбожных мае посьпех і жывуць у супакоі ўсе крывадушнікі здрадлівыя?» (Ярэмія 12:1).

Бог не праявіў чаканага спачування. Ён сказаў: «Калі ты бег з пешымі і змучыўся, як будзеш бегчы з коньнікамі? І калі ў краіне супакою ты пачуваеш сябе бясьпечна, што ты будзеш рабіць у гушчары Ярдану?» (Ярэмія 12:5). Іншымі словамі: «Ярэмія, калі ты стамляешся ад пяхоты д’ябла, то што будзе, калі ты сутыкнешся з яго кавалерыяй?»

## На вайне бываюць бітвы

Мы павінны памятаць, што вялікіх перамог не бывае без вялікіх бітваў. Сітуацыя Ярэміі пагаршалася. Ад абразаў на словах яго праследнікі перайшлі да таго, што кінулі яго ў вязніцу, а пазней – у

падзямелле, дзе ён мусіў памерці. Але Бог урэшце вызваліў яго ад усіх пакутаў і праследу.

Бітвы, якія перажываюць многія людзі ў сучасным Целе Хрыстовым, — гэта бітвы ў розуме, а не фізічны праслед, з якім сутыкаўся Павал. Што мы будзем рабіць, калі форма праследу і бітваў зменіцца? Пакуты, якія мы перажываем зараз, мусяць умацаваць нас і дапамагчы справіцца з большымі бітвамі ў будучыні.

Пустыня – гэта трэніровачны цэнтр або палігон для падрыхтоўкі да будучых бітваў. Як мы пасылаем жаўнераў у трэніровачны цэнтр, каб падрыхтаваць іх да ваенных дзеянняў, так Бог адпраўляе Сваіх жаўнераў у пустыню, каб падрыхтаваць іх да выканання Яго паклікання ў збудаванні Божага Валадарства. Найвялікшыя перашкоды, якія жаўнерам трэба пераадольваць у трэніровачным цэнтры – гэта іх страхі, слабасці і расчараванні. Так і ў нас: самыя вялікія бітвы пустыні адбываюцца ў душы.

Адна з найбольшых бітваў – гэта *расчараванне*. Аднойчы, калі я маліўся, Госпад спытаў мяне, якая рыса ёсць супрацьлегласцю *адвагі*.

Я адказаў: «Вядома ж, гэта страх».

Ён ціха запярэчыў: «Гэта расчараванне». Я ніколі не думаў пра гэта ў такім святле. Я адразу зразумеў, чаму Егошуа атрымаў наказ «будзь цвёрдым і мужным» восем раз (Лікі 13:20, Другазаконне 31:6-7,23, Егошуа 1:6, 7, 9, 18). Госпад ведаў, што гэта стане адной з найвялікшых складанасцяў. Расчараванне здараецца ў пустыні або падчас бітваў, калі мы засяроджваемся на сабе, а не на Богу і нашай місіі.

Мэта ворага – перамясціць ваш фокус на вас. Менавіта гэта ён спрабаваў зрабіць нават з Ісусам у пустыні. Ісус быў галодным, бо не еў сорак дзён, а д’ябал падступіў да яго і сказаў: «Калі Ты — Сын Божы, скажы, каб камяні гэтыя сталіся хлябамі» (Мацьвея 4:1-11). Ён паклаў перад Ім спакусу выкарыстаць сілу Божую за межамі Божай волі і шляху, каб здабыць тое, чаго прагнула Яго цела. Мы павінны памятаць: калі Бог дае дар, разам з ім Ён дае і адказнасць правільна яго выкарыстоўваць, адпаведна з Яго жаданнямі. Бог паклапоціцца

пра патрэбы Ісуса, але Ён зробіць гэта ў Свой спосаб. Калі д’ябал сышоў, прыйшлі анёлы і служылі Ісусу.

Давайце яшчэ раз звернемся да таго, што казаў Ісус пра Сваё служэнне:

> Тады адказваў Ісус і сказаў ім: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: Сын нічога ня можа рабіць Сам ад Сябе, калі ня бачыць Айца, Які робіць, бо што Ён робіць, тое і Сын робіць таксама (Ян 5:19).

Звярніце ўвагу на слова «бачыць». Ісус нічога не рабіў без волі Божай.

У засушлівыя часы мы будзем сутыкацца са спакусай зрабіць нешта па сваёй волі, а не чакаць, пакуль гэта зробіць Бог у Свой спосаб. Нам можа захацецца выкарыстаць сілу Божую, каб атрымаць нешта раней, чым запланаваў Бог. Ці можаце вы ўявіць сабе жаўнера, які падчас бітвы не выконвае загады афіцэра? Гэта можа прывесці да сур’ёзных наступстваў як для самога жаўнера, так і для яго паплечнікаў. У трэніровачным цэнтры жаўнеры вучацца выконваць загады, каб не рызыкаваць дарэмна сваім жыццём і жыццём іншых у бітве.

Важна не забываць, што нам адкрыта звыш. Часам будуць прыходзіць думкі: *«Мне патрэбны адказ менавіта цяпер!»* Або: *«Трэба ўжо нешта рабіць, калі я буду бяздзейнічаць, нічога не атрымаецца!»* Калі здаецца, што Бог вам нічога не кажа, гэта не значыць, што Ён да вас не *прамаўляе*! Я хачу сказаць, што Бог глыбока ўдзельнічае ў нашым жыцці. У такіх выпадках Яго «вестка» гучыць наступным чынам: «Табе не трэба зараз нічога рабіць». У гэтых сітуацыях мы павінны *чакаць* Госпада, а не спрабаваць паскорыць працэс.

> Спадзявайся на ГОСПАДА! Будзь цьвёрды і сэрца тваё ўмацуй, і спадзявайся на ГОСПАДА! (Псалом 27 (26):14).

Калі мы засяроджваемся на сваіх патрэбах, а не на Ім, прыйдуць расчараванне і складанасці. Мы не можам пераключацца і засяроджвацца на нашым «лёгкім прыгнёце». Наадварот, нам трэба працягваць глядзець на вагу вечнай славы, якая рыхтуецца для нас у гэтым прыгнёце (2 Карынцянам 4:17).

Наша бачанне павінна напаўняцца радасцю, якая чакае нас.

## Радасць перад намі

> Вялікай радасьцю лічыце, браты мае, калі трапляеце ў розныя спакусы, ведаючы, што выпрабаваньне вашае веры робіць цярплівасьць. А цярплівасьць няхай мае дасканалае дзеяньне, каб вы былі дасканалымі і суцэльнымі, без аніякага недахопу (Якуб 1:2-4).

Радасць – гэта духоўная сіла, якая дае нам здольнасць выстаяць у складанасцях і выпрабаваннях. Звярніце ўвагу, у Слове сказана: «Вялікай радасцю лічыце [*усё* – у анг. перакладзе]». Там не сказана: «Лічыце гэта часткова радасцю, а часткова – смуткам». Мы не мусім змешваць радасць і смутак у сэрцах. Паглядзіце на гэта наступным чынам: у вас можа быць ланцуг, дзевяноста дзевяць частак якога – радасць, а адна частка – смутак. Увесь гэты ланцуг будзе мець трываласць гэтай адной часткі смутку. Каб вы маглі мець сілу для канкрэтнай сітуацыі, вам трэба, каб гэты ланцуг цалкам складаўся са ста частак радасці, каб у ім не было слабых звёнаў смутку.

Мы з вамі ведаем, што лёгка «лічыць вялікай радасцю ўсё», калі ўсё ідзе цудоўна. Але Слова кажа нам не аб гэтым. Нам трэба «лічыць усё радасцю» ў часы выпрабаванняў: пустыні, пераследу, складанасцяў, пакутаў і любых іншых бедаў. Бог кажа гэта, бо ведае, што «…радасьць ГОСПАДА — гэта апора ваша» (Нээмія 8:10). Нас умацоўвае радасць блізкіх адносінаў з Ім.

Мая жонка і ўся мая сям’я – сыны, іх жонкі і дзеці – радуюць мяне! Бываюць часы, калі я далёка ад дому. Тады я дастаю іх фотаздымак. Гэта заўжды напаўняе мяне радасцю і дае мне сілу.

Менавіта гэта Нээмія казаў сваім людзям. Яны праходзілі складаныя часы, таму Нээмія заклікаў: «Не сумуйце над гэтай бядой, лепш глядзіце на Госпада. Калі вы наблізіцеся да Яго, ваша сэрца напоўніцца радасцю, і яна ўмацуе вас» (парафраз аўтара).

Хвала дапаможа вам засяродзіцца не на сабе, а на Госпадзе. Сярод выпрабаванняў лёгка згубіць з віду сілу Божую, бо мы сутыкаемся з вялікім ціскам. Давід напісаў большую частку сваіх Псальмаў у выпрабаваннях. Хвалячы Бога, ён змог застацца моцным у вельмі складаных абставінах.

У Ісаі 61:3 Бог кажа, што дае нам: «…алей радасьці замест смутку, адзеньне хвалы замест духу панурага».

Я памятаю адзін вельмі засушлівы час, калі гэты верш стаў надзвычай важным для мяне. Я быў дома адзін, і пачуваўся вельмі прыгнечаным. Я ўзяў Біблію і ледзь мог чытаць. Таму я пачаў маліцца, але гэта было яшчэ складаней. Я адчуў, што Дух Божы падказвае мне ўключыць дыскі са спевамі праслаўлення. Я пайшоў у пакой, дзе стаяла стэрэасістэма, уключыў спевы хвалы і пачаў падпяваць. Я адчуваў, што гэтага было мала, таму пачаў *спрабаваць* танчыць перад Госпадам. На сэрцы ў мяне было так цяжка, што здавалася, быццам мае ногі былі налітыя свінцом. Мне прыходзілася проста прымушаць сябе гэта рабіць.

Калі падборка спеваў скончылася, я адчуў патрэбу прайграць іх зноў. Гэтым разам я пачаў чуць і разумець, што я спяваю. Раптоўна духоўнымі вачамі я нібыта ўбачыў Ісуса на троне і адчуў Яго вялікую любоў. Мая душа стала напаўняцца радасцю, і я пачаў свабодна танчыць. Я заўважыў, што перастаў глядзець на сябе і стаў углядацца ў веліч Ісуса. На працягу наступных трыццаці хвілін я спяваў, танчыў і бегаў па нашым маленькім доме як шалёны. Прыгнечанасць пакінула мяне, і з мяне, цалкам спустошанага трыццаць хвілін таму, ліліся жыццё і сіла.

Калі я хваліў Яго, я засяродзіўся на Ім. Я перажыў тое, што апісвае Ісая: «І вы з радасьцю будзеце чэрпаць ваду з крыніцаў збаўленьня» (Ісая 12:3), і праз радасць у Госпадзе я пачаў напаўняцца сілай з крыніцаў збаўлення.

Хвала дапамагае нам засяродзіцца на радасці, якая ляжыць перад намі, а не на абставінах навокал.

> Дык і мы, маючы навокал нас гэткае воблака сьведкаў, адкінуўшы ўсякі цяжар і грэх, які нас аблытвае, з цярплівасьцю будзем бегчы ў змаганьні, што ляжыць перад намі, углядаючыся на Пачынальніка і Завяршальніка веры, Ісуса, Які замест радасьці, што была перад Ім, вытрываў крыж, пагардзіўшы сорамам, і сеў праваруч пасаду Божага. Бо паразважайце пра Таго, Які вытрываў гэтакую супраць Сябе варажнечу ад грэшнікаў, каб вы не зьнемагаліся, саслабеўшы душамі вашымі. Вы яшчэ не да крыві ваявалі, змагаючыся супраць грэху (Гебраям 12:1-4).

Ісус перажыў найвялікшыя выпрабаванні, якія хто-небудзь *праходзіў* або *будзе* праходзіць, узіраючыся на радасць, якая Яго чакала: уваскрасенне пасля ўкрыжавання. Гэта была слава, якая мусіла прыйсці за паслухмянасцю і Яго пакутамі і якая мусіла прывесці многіх сыноў і дочак, у тым ліку вас і мяне, у Яго Валадарства!

Такі шлях чакае нас, тых, хто ідзе Яго шляхамі. Апроч самавырачэння і ўкрыжавання жаданняў цела нас чакае *жыццё ўваскрасення.* За пакутамі цела ляжыць спеласць, якая прынясе больш блізкія адносіны з Ісусам. За складанасцямі пустыні ляжыць вялікая слава! Павал піша: «Бо я лічу, што пакуты цяперашняга часу [нічога] ня вартыя [ў параўнаньні] з той славаю, што мае адкрыцца ў нас» (Рымлянам 8:18).

Божая слава адкрыецца ў царкве перад тым, як Ён прыйдзе другі раз. Яна будзе настолькі вялікай, што прывядзе гарады і народы

да збаўлення. Ніколі раней зямля не бачыла такіх праяваў Яго славы, што адкрыюцца ў тых вучнях Хрыста, якія дазволяць Богу іх ачысціць. Такому праліццю Божага Духа, якое прывядзе да вялікага жніва, не будзе патрэбна чалавечая рэклама. Пра яго ўсё скажуць Божая сіла і слава!

> Улюбёныя! Не зьдзіўляйцеся вогненнаму [выпрабаваньню], якое стаецца дзеля спакушэньня вас, нібы нешта дзіўнае здарылася. Але, як супольнікі ў пакутах Хрыстовых, радуйцеся, каб і ў адкрыцьці славы Ягонай радавацца і весяліцца (1 Пятра 4:12-13).

Яшчэ раз: што такое радасць, якая чакае нас? Гэта Яго слава, якая адкрываецца ў тых з нас, хто пакутаваў у выніку паслухмянасці Хрысту. Звярніце ўвагу: мера вашых пакутаў – гэта таксама і мера вашай радасці, бо вы ведаеце: чым большыя складанасці, тым большая слава!

Сябры мае, не спыняйцеся шукаць Бога, калі сустракаюцца складанасці! Я ведаю, што Ён будзе дазваляць вам трапляць у складаныя сітуацыі ў жыцці, бо чым большая бітва, тым большая перамога чакае Валадарства і вас. Але сярод гэтых бітваў заўсёды памятайце пра наступнае абяцанне:

> Вас наведала спакуса ня іншая, як чалавечая. Але верны Бог, Які не пакіне вас быць спакушанымі больш, чым вы можаце [вытрымаць], але са спакусай зробіць і выхад, каб вы маглі яе перанесьці (1 Карынцянам 10:13).

Няважна, якое абяцанне чакае вас, вы маеце сілу паспяхова і слаўна прайсці праз выпрабаванні. Інакш вы б з ім не сутыкнуліся: Бог не дапусціў бы гэтага!

Калі вы *любіце* душу сваю, вы будзеце здадзіцеся ў складанасцях.

Вы спыніцеся ў пошуках Бога і задаволіцеся жыццём без плоду.

У Адкрыцці 12:11 напісана: «І яны перамаглі яго праз кроў Ягняці і праз слова сьведчаньня свайго і не любілі душы сваёй аж да сьмерці».

Тыя, хто больш дбае пра сябе, чым пра волю Божую, больш любяць сваё жыццё і душу, а Ісус кажа: «Бо хто хоча душу сваю выратаваць, той загубіць яе, а хто загубіць душу сваю дзеля Мяне, той знойдзе яе» (Мацвея 16:25).

Адзіны спосаб вытрымаць тое, што чакае нас наперадзе, – загубіць сваю душу. Я хачу заклікаць вас: ідзіце наперад «…аж пакуль будзе выліты на нас Дух з вышыні. І станецца пустыня садам, а сад будзе лічыцца лесам» (Ісая 32:15).

Пустыня – гэта не тое месца, дзе трэба скласці зброю і здацца! Гэта месца, дзе мы мусім быць моцнымі, адважнымі і рашучымі ў выкананні волі Божай. Гэта месца, дзе мы падпарадкоўваемся Богу і ўпарта супрацьстаім д’яблу.

Калі цяпер вы ў пустыні, Бог прывёў вас у гэта месца, каб вы ведалі, што ў вашым сэрца. Даволі часта тое, што я прымаў за спакусы д’ябла, насамрэч было схаванымі куткамі майго жыцця і сэрца, якія трэба было падпарадкаваць Хрысту.

Імкніцеся да нябеснай узнагароды, памятайце наступныя словы:

> Падзяка ж Богу, Які заўсёды дае нам трыюмфаваць у Хрысьце,
> і водар веданьня пра Сябе выяўляе праз нас у-ва ўсякім месцы
> (2 Карынцянам 2:14).
>
> Хто адлучыць нас ад любові Хрыстовае? Прыгнёт, ці ўціск, ці
> перасьледваньне, ці голад, ці галізна, ці небясьпека, ці меч?...
> Але ў-ва ўсім гэтым мы перамагаем праз Таго, Які палюбіў нас
> (Рымлянам 8:35, 37).

Падзяка ж Богу, Які даў нам перамогу праз Госпада нашага Ісуса Хрыста! (1 Карынцянам 15:57)

Не адступайце ў пошуках Яго. Не здавайцеся. Трымайцеся бачання, якое Ён даў вам незалежна ад таго, якімі выглядаюць абставіны.

Сітуацыя Язэпа ў яме, а потым у чужой краіне, дзе яго кінулі ў вязніцу, выглядала безнадзейнай. Падавалася, што яго жыццю прыйшоў канец. Ці была ў Язэпа будучыня? Але памятайце: «У людзей гэта немагчыма, але ня ў Бога, бо ў Бога ўсё магчыма» (Марк 10:27).

Так і ў вашай сітуацыі: якой бы складанай яна ні была, памятайце:

> «Калі можаш верыць, усё магчыма таму, хто верыць»
> (Марк 9:23).

Глядзіце на радасць, якая вас чакае, на Яго славу, якая адкрываецца ў вас. Гэта дасць вам сілу пераадолець выпрабаванні, з якімі вы сутыкаецеся. Працягвайце шукаць Яго ўсім сэрцам, і верце, што Ён прамаўляе да вас Духам Сваім праз Слова. Калі вы будзеце гэта рабіць, вы выйдзеце з пустыні з перамогай.

> А Таму, Які можа захаваць вас ад упадку і паставіць перад славаю Сваёю беззаганнымі і ў радасьці, адзінаму мудраму Богу, Збаўцу нашаму, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага, слава і веліч, сіла і ўлада цяпер і на ўсе вякі. Амэн (Юда 1:24-25).

# ПЫТАННІ ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ

Калі вы чытаеце гэтую кнігу разам з дапаможнікам *«Пустыня»* або праходзіце як частку курса (цудоўная ідэя!), я раю вам раз на тыдзень глядзець відэаўрок  і абмяркоўваць у групе адпаведныя пытанні. Відэазаняткі збудаваныя адпаведна асноўным тэмам кнігі і дапаўняюць іх. Таму ідэальны варыянт для ўсіх удзельнікаў групы — паглядзець урокі і прачытаць кнігу.

Прыемнага абмеркавання!

## Урок 1

***Прачытайце раздзел 1***

1. У чым адрозненне паміж усюдыіснасцю і яўнай прысутнасцю Бога? Чым разуменне гэтай розніцы нам дапамагае?
2. Чаму так важна разумець перыяд, у якім мы знаходзімся, і ведаць: мы ў пустыні альбо не?
3. Чаму, на вашу думку, шатан выкарыстоўвае часы пустыні, каб спакусіць нас зграшыць наўмысна або адмовіцца ад веры?
4. Чаму Бог дазваляе нам праходзіць праз пустыню даўжэй?

## Урок 2

***Прачытайце раздзелы 2 і 3***

1. Пустыня мае некалькі мэтаў. Якая з сямі мэтаў пустыні, згаданых ва ўроку, найбольш адгукаецца вам і чаму?
2. Чаму, на вашу думку, паслухмянасць Богу ў пустыні прыводзіць да духоўнага росту?

3. Пустыня – час разумення сябе. Пералічыце некаторыя рэчы, якія вы даведаліся ў пустыні пра сябе і сваё хаджэнне з Богам.
4. Як вы навучыліся знаходзіць сілу ў Богу ў такія часы скоранасці?

## Урок 3

***Прачытайце раздзел 4***

1. Паміж абяцаннем і яго выкананнем заўсёды ёсць працэс. Чаму, на вашу думку, ён настолькі важны?
2. Як адбываўся працэс выканання абяцання ў вашым жыцці?
3. Чаму, на вашу думку, Бог дае нам абяцанне на пачатку такога працэсу?
4. Чаму важна мець абяцанне ад Бога для вашага жыцця, а не проста план на пяць год?

## Урок 4

***Прачытайце раздзелы 5 і 6***

1. Якім чынам параўнанне жыцця Саўла і Давіда дапамагае зразумець важнасць таго, як Бог ачышчае нас у пустыні?
2. Ачышчэнне золата робіць яго больш гнуткім. Калі Бог ачышчае нас, гэта робіць нас больш адчувальнымі да Яго. Апішыце, што значыць быць больш адкрытымі і адчувальнымі перад Богам.
3. Калі ў працэсе ачышчэння Бог адкрывае нашы таемныя грахі або слабасці, якой мусіць быць наша рэакцыя?
4. Як працэс ачышчэння дае нам магчымасць лепей з’яўляць Ісуса?

# Урок 5

***Прачытайце раздзел 7***

1. Чаму Бог не церпіць нараканняў? Ці наракаеце вы зараз у сваім жыцці?
2. У чым розніца паміж тымі, хто скардзіцца і наракае ў кнізе Малахіі, і скаргамі прарока Ярэміі? Чаму Бог быў засмучаны нараканнямі ў кнізе Малахіі, але адказаў на скаргі Ярэміі?
3. Суд – гэта рашэнне, а не асуджэнне. Калі пачынаецца суд у Божым доме, Госпад вырашае, хто варты Яму служыць. Чаго, на вашу думку, шукае Бог, прымаючы гэта рашэнне?
4. Бог шукае начынне, прыдатнае для служэння. Як бы вы апісалі адрозненне паміж пакліканнем і абраннем?

# Урок 6

***Прачытайце раздзел 8***

1. Як вы спачатку адрэагавалі, калі пачулі, што пакуты – гэта дар? Як змяніўся гэты пункт гледжання бліжэй да канца ўрока?
2. Бог не дапусціць у ваша жыццё выпрабаванні большыя, чым вы можаце вытрымаць. У чым гэта вас натхняе?
3. Бог не пакіне вас з той сілай, якую вы маеце цяпер. Чаму гэта вучыць адносна Божага плану для вашага жыцця?
4. Сёння Бог дае выпрабаванні, каб падрыхтаваць нас да будучых складанасцяў, з якімі мы сутыкнёмся. Што Бог прамовіў вам пра вашу будучыню? Што дапамагае вам знаходзіць сэнс у складанасцях і выпрабаваннях, праз якія вы праходзіце цяпер?

# Урок 7

***Прачытайце раздзел 9***

1. Часам здаецца, што ісці за Богам бессэнсоўна. Чаму цяжка давяраць Богу, калі Ён «парушае» традыцыйныя спосабы дзеяння?
2. Як вы сябе адчуваеце, калі Бог дзейнічае не адпаведна вашаму раскладу? Які ціск і спакусы вы перажываеце, калі выглядае, што Божыя абяцанні адкладаюцца?
3. Ці бачылі вы ў жыцці пацверджанне наступнай ісціны: *«Народжанае ад цела мусіць падтрымлівацца целам»?* Як гэта адрозніваецца ад таго, што Бог нараджае праз вас?
4. Што дае вам упэўненасць у тым, што вы ідзяце Божым шляхам для вашага жыцця?

# Урок 8

***Прачытайце раздзел 10***

1. Пустыня – гэта месца, дзе Бог адкрывае Сябе. Чаму ў такі час здаецца, што Бог недзе далёка?
2. Што значыць шукаць найперш Бога, а не Яго дабраславенняў?
3. Чаму небяспечна дапускаць сітуацыю, калі ваша абяцанне або пакліканне становіцца для вас важнейшым за Бога?
4. Калі вы бачыце, як Бог адкрываў Сябе героям Пісання, як гэта змяняе вашы чаканні ад перыяду пустыні?

# Урок 9

***Прачытайце раздзел 11***

1. Чаму нам важна зважаць на тое, у чым мы знаходзім пацяшэнне, асабліва ў духоўна засушлівыя часы?
2. Калі мы глыбока пагружаемся ў малітву і Пісанне, асабліва калі нам не хочацца так рабіць, як гэта ўмацоўвае нашы духоўныя карані?
3. Як вас натхняе веданне таго, што наймацнейшая атака на ваша жніво здараецца акурат перад гэтым жнівом?
4. Як развагі пра Божую вернасць перамяняюць час пустыні?

# Урок 10

***Прачытайце раздзел 12***

1. Як пустыня падрыхтавала вас да новага перыяду ў жыцці?
2. Чаму перамены складаныя? Што выклікае ў вас найбольшую складанасць, каб прыстасавацца да пераменаў?
3. Што найбольш вас уразіла ў працэсе аднаўлення мяхоў? Чаму?
4. Каб атрымаць новае, нам трэба адпусціць старое. Што вам трэба пакінуць, каб прыняць новае?

# ДАДАТАК

## ЗБАЎЛЕННЕ, ДАСЯЖНАЕ ЎСІМ

*Бо калі ты вуснамі тваімі вызнаеш Ісуса Госпадам і ў сэрцы тваім будзеш верыць, што Бог уваскрасіў Яго з мёртвых, будзеш збаўлены, бо сэрца верыць дзеля праведнасьці, а вусны вызнаюць дзеля збаўленьня.*

**– Рымлянам 10:9-10**

Бог хоча, каб вы перажывалі ўсю паўнату жыцця. Ён любіць вас і прагне ажыццявіць той план, які мае для вашага жыцця. Але ёсць толькі адзін спосаб, каб пачаць падарожжа па ажыццяўленні гэтага плану: прыняць збаўленне праз Сына Божага, Ісуса Хрыста.

Праз смерць і ўваскрасенне Ісуса Бог праклаў шлях, каб у Яго Валадарстве вы сталі Яго ўлюбёным сынам або дачкой. Ахвяра Ісуса на Крыжы зрабіла вечнае жыццё з лішкам дасяжным для вас. Збаўленне – гэта Божы дар для вас; вы ніяк не можаце яго зарабіць або заслужыць.

Каб атрымаць гэты каштоўны дар, спачатку вызнайце грэх таго, што вы жылі незалежна ад вашага Творцы, — гэта корань усіх грахоў, якія вы здзейснілі. Пакаянне – важны крок да атрымання збаўлення. У кнізе Дзеяў Пётр выразна пра гэта сказаў, і ў той дзень пакаялася пяць тысяч чалавек: «Дык навярніцеся і вярніцеся, каб сьцерліся грахі вашыя» (Дзеі 3:19). Пісанне абвяшчае, што кожны з нас нарадзіўся рабом грэху. Гэтае рабства караніцца ў грэху Адама, які даў прыклад наўмыснай непаслухмянасці. Пакаянне – нашае

рашэнне не слухацца больш сябе і шатана, бацьку хлусні, а слухацца новага Гаспадара — Ісуса Хрыста, Які аддаў за вас жыццё.

Дазвольце Ісусу валадарыць у вашым жыцці. Зрабіць Ісуса Госпадам азначае даць Яму ўладу над вашым жыццём (духам, душой і целам) – усім, што вы сабой уяўляеце і што маеце. Яго ўлада над вашым жыццём становіцца абсалютнай. Як толькі вы гэта робіце, Бог выводзіць вас з цемры і пераводзіць у святло і славу Яго Валадарства. Вы проста пераходзіце ад смерці да жыцця і становіцеся Яго дзіцём!

Калі вы хочаце атрымаць збаўленне праз Ісуса, памаліцеся гэтымі словамі:

*Божа Нябесны, я прызнаю, што я – грэшнік і не магу адпавядаць Тваім праведным стандартам. Я заслугоўваю вечнага суду за свае грахі. Дзякую Табе, што не пакінуў мяне, бо я веру: Ты паслаў Ісуса Хрыста, Твайго Адзінароднага Сына, які нарадзіўся ад дзевы Марыі, каб памерці за мяне і панесці маё асуджэнне на Крыжы. Я веру, што Ён уваскрос на трэці дзень і цяпер сядзіць праваруч Цябе як мой Госпад і Збаўца. Таму сёння я раскайваюся ў сваёй незалежнасці ад Цябе і цалкам аддаю пад уладу Ісуса сваё жыццё.*

*Ісус, я вызнаю Цябе маім Госпадам і Збаўцам. Прыйдзі ў маё жыццё Тваім Духам і перамяні мяне ў дзіця Божае. Я выракаюся справаў цемры, якія некалі рабіў, і ад гэтага дня больш не буду жыць для сябе. Але праз ласку Тваю я буду жыць для Цябе, бо Ты аддаў Сябе за мяне, каб я мог жыць вечна.*

*Дзякую Табе, Госпад! Маё жыццё цяпер цалкам у Тваіх руках, і, паводле Твайго Слова, я ніколі не буду асаромлены. У імя Ісуса, амэн.*

Вітаю вас у сям'і Божай! Я заклікаю вас падзяліцца гэтай цудоўнай навіной з іншымі вернікамі. Таксама для вас важна далучыцца да мясцовай евангельскай царквы і трымацца тых, хто можа натхняць вас у вашай новай веры. Вы можаце звязацца з нашым служэннем (наведайце сайт MessengerInternational.org), каб знайсці царкву ў сваім рэгіёне.

Вы толькі што выправіліся ў найлепшае падарожжа. Жадаю вам кожны дзень узрастаць у адкрыцці, ласцы і сяброўстве з Богам!

# ПРЫНАДА ШАТАНА

***Жыць у свабодзе ад смяротнай пасткі крыўды***




У кнізе «Прынада шатана» разглядаецца адзін з найвялікшых падманаў ворага: праз яго вернікі часта перастаюць выконваць Божую волю. Гэта крыўда. Большасць людзей трапляе ў пастку крыўды і нават не заўважае гэтага.

Не падманвайцеся! Хрыстос сказаў: «Згаршэньні ня могуць не прыйсьці» (Лукі 17:1). Вы не выбіраеце, будуць вас крыўдзіць ці не, але вы можаце выбраць, як на гэта рэагаваць. Калі вы правільна падыходзіце да крыўдаў, то робіцеся мацнейшымі, у вашым сэрцы знікае горыч. Толькі правільная рэакцыя дапаможа мець адносіны з Богам, у якіх няма перашкодаў.

Гэтая кніга Джона Бэвіра дапаможа заставацца ў Божай волі і мець свабоду ад падазрэнняў і недаверу. Вы зразумееце, як развітацца з менталітэтам ахвяры і жыць без занепакоенасці і расчаравання. Адкрываючы ў сабе ўсё большую паслухмянасць Богу, вы напоўніце жыццё прабачэннем, прымірэннем і радасцю.

Больш інфармацыі: MessengerX.com

# MessengerX

*Падарожжа вучнёўства для ўсіх і паўсюль*




- **Бясплатна больш чым на 130 розных мовах**
- Праграма для мабільных прыладаў і сайт
- Матэрыялы, распрацаваныя для вашага духоўнага росту
- Магчымасць захоўваць гісторыю праглядаў і свой прагрэс






Даследуйце вялікую бібліятэку матэрыялаў ад Messenger, якія вы можаце глядзець, чытаць і слухаць на ўсіх прыладах: электронныя кнігі, аўдыякнігі, кароткаметражныя фільмы, відэакурсы, Бібліі і многае іншае.

**MessengerX.com**

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

Даступна па ўсім свеце праз App Store і Google Play

## ВЫ АДЧУВАЕЦЕ ВЫ РАЗГУБЛЕНАСЦЬ У ЦЯЖКІЯ ЧАСЫ І, ЗДАРАЕЦЦА, ДУМАЕЦЕ: «ДЗЕ ТЫ, БОГ?!»

Магчыма, вы чулі голас Божы, але, відаць зараз Бог маўчыць. Магчыма, вы рухаліся наперад у веры, але цяпер Яго прысутнасці нідзе няма. Вітаем вас у пустыні – у месцы паміж атрыманнем Божага абяцання і яго ажыццяўленнем.

Але ёсць і добрая навіна: гэта не проста час без мэты ў пустой зямлі. Калі вы будзеце праходзіць пустыню правільна, Бог выкарыстае яе, каб падрыхтаваць вас для вашага паклікання. Насуперак таму, што могуць думаць многія іншыя людзі, гэты перыяд – не проста чаканне Бога. Вялікая роля ў ім адведзена вам. І калі вы не хочаце марнаваць час і хадзіць кругамі, важна даведацца, што ж гэта за роля.

У гэтай захапляльнай кнізе аўтар бэстсэлераў Джон Бэвір прапануе вам глыбей пазнаёміцца з ключавымі гісторыямі Бібліі, якія дапамогуць выстаяць, прайсці складаныя перыяды і дасягнуць таго, што Бог падрыхтаваў для вас.



**ДЖОН БЭВІР** – вядомы спікер і аўтар бэстсэлераў, які адважна і бескампрамісна абвяшчае праўду Божага Слова. Джон і яго жонка Ліза – заснавальнікі служэння Messenger International, якое імкнецца фармаваць бескампрамісных вучняў Хрыста, здольных перамяніць гэты свет. Калі Джон бывае дома, у Каларада, яго можна ўбачыць за гульнямі з яго чатырма сынамі або ў спробах пераканаць Лізу заняцца гольфам.

MessengerX

Каб бясплатна спампаваць ці праглядзець матэрыялы, наведайце **MessengerX.com**

Messenger INTERNATIONAL

Гэтая кніга – падарунак ад аўтара і не падлягае продажу.

Больш? Скануйце тут